Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

№ 84 (28700)

4 МАЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ +TV ПРАГРАМА



«Дні Стафана Баторыя» ў Гродне

СТАР. 8



Слаўгарад: праблемы і шляхі вырашэння

МС



Вада з калодзежаў. Піць ці не піць?

МС

ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КАНЮК, генеральны пракурор:**

*«Асноўныя задачы ў перыяд пасяўной кампаніі — забяспечыць гатоўнасць і захаванасць сельскагаспадарчай тэхнікі, наяўнасць у прадпрыемстваў угнаенняў, іх належнае захоўванне, своечасовасць выплаты заработнай платы, недапушчэнне «механічнага» прыцягнення кіраўнікоў прадпрыемстваў да адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне працоўнага заканадаўства. У прыватнасці, пры затрымцы аплаты на 1-2 дні. Павышаная ўвага павінна ўдзяляцца пытанням пажарнай бяспекі, кантролю за працоўнай дысцыплінай, скарачэння дэбіторскай запазычанасці».*

ISSN 1990 - 763X

18084

# ІСНАВАЛІ, ІСНУЮЦЬ І БУДУЦЬ ІСНАВАЦЬ!



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.





Фота БелТА.

На выставе «СМІ ў Беларусі» прадстаўлена каля 50 экспанентаў

**У сталічным выставачным цэнтры «Белэкспа», што на праспекце Пераможцаў, 14, пачала працаваць XXII Міжнародная спецыялізаваная выстава «СМІ ў Беларусі». Шматлікія сродкі масавай інфармацыі, найлепшыя журналісты, самыя адданыя чытачы, слухачы і гледачы — гэта месца стала пунктам сустрэчы ўсіх зацікаўленых.**

У выставе, якая будзе доўжыцца да 5 мая, прымаюць удзел больш як 50 экспанентаў. Яны прадстаўляюць каля 400 сродкаў масавай інфармацыі з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Латвіі, Літвы, Польшчы, Кітая, Турцыі і іншых краін. Экспазіцыя размясцілася на плошчы больш за 1 тыс. кв. м.

На ўрачыстым адкрыцці выставы **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ЖАЎНЯК** зачытаў прывітальнае слова Аляксандра Лукашэнкі: «Гэты форум праходзіць ужо на працягу двух дзесяцігоддзяў і з'яўляецца месцам актыўнага абмеркавання сродкамі масавай інфармацыі пытанняў развіцця медыясферы і ўмацавання партнёрскіх сувязяў. Тут рэгулярна дэманструюцца апошнія дасягненні ў рабоце друкаваных выданняў, радыё і тэлебачання, інтэрнэт-рэсурсаў. Асаблівa прыемна адзначыць цікавасць да выставы прадстаўнікоў шырокага кола замежных краін.

СТАР. 3

■ Падрабязнасці

# ПРАЦАВАЦЬ У ВОДПУСКУ... ДАЗВАЛЯЕЦЦА?

## Тлумачым, што можа змяніцца ў Працоўным кодэксе

**Падчас водпуску дазволяць працаваць у іншай кампаніі поўны дзень, дыстанцыйныя работнікі змогуць разлічваць на бальнічныя, а адзінокім татам нельга будзе неабгрунтавана адмовіць у заключэнні дагавора. Такія папраўкі плануюць унесці ў Працоўны кодэкс, які дэпутаты разгледзяць на бягучай сесіі. Чым выклікана неабходнасць змен, расказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

### Гарантыі для ўсіх

Сярод прапаноў — замацаваць у кодэксе паняцце «дыстанцыйная работа».

— Актыўнае развіццё IT-тэхналогій дазваляе арганізоўваць працу, не ствараючы канкрэтнага працоўнага месца. Гэта задавольвае і наймальніка, і работніка, бо ён дастаткова свабодна можа распараджацца сваім часам, — кажа **начальнік галоўнага юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна МАСЛОЎСКАЯ.**

Цяпер са спецыялістамі, якія выконваюць заданні дыстанцыйна, заключаюць грамадзянска-прававы дагавор. Пасля паправак у кодэксе яны змогуць разлічваць на працоўны дагавор, а значыць і на тыя гарантыі, якія даюцца штатным работнікам. Першае — забеспячэнне мінімальнага заробку (ён складае 305 рублёў). Другое — аплатны водпуск: 24 каляндарныя дні асноўнага плюс ад аднаго да пяці дзён дадатковых. Трэцяе — бальнічны.

Працоўны дагавор будзе заключацца пры асабістай прысутнасці работніка. Далейшыя перамовы (аб умовах працы, выніках выкананай работы) і дакументазварот з наймальнікам могуць весціся па электроннай пошце. Спосаб і перыядычнасць працоўных кантактаў будуць вызначацца ў кантракце. Графік работы таксама прапісваецца бакамі на выбар. Пры гэтым працягласць працоўнага часу не можа перавышаць 40 гадзін на тыдзень. Усё, што больш, мусіць аплачвацца адпаведна. Але звышурочная



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

работа не можа быць неабмежаванай — максімум 10 гадзін на тыдзень і 180 у год.

— Людзі будуць мець права выбіраць: заключаць грамадзянска-прававы або працоўны дагавор. Але першы скіраваны на выкананне разавай работы, а другі мае на ўвазе пастаянныя і працяглыя адносіны, — заўважае Валянціна Маслоўская.

СТАР. 5

# Эканоміка — для кожнага

**Павысіць якасць жыцця на аснове канкурэнтаздольнасці эканомікі — такую нязменную мэту агучыў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па рашэнні актуальных пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. На ёй былі абмеркаваны бягучыя паказчыкі, а таксама канкрэтныя ідэі і надзённыя пытанні.**

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, рост цэн на нафту нам на карысць, бо мы вырабляем нафтапрадукты і прадаём іх на сусветным рынку. Дарэжэй наша краіна стала прадаваць і мінеральныя ўгнаенні, у тым ліку калійныя. Усё гэта дазваляе рэалізаваць на дадатковыя даходы ў бюджэт, але Аляксандр Лукашэнка падкрэслівае: «Які перыяд часу гэта будзе цягнуцца, зразумела, ніхто не ведае. Але вечна гэта не будзе дакладна. Неабходна літаральна паспець выцягнуць максімум выгады з кан'юнктуры, якая склалася, і захаваць апераджальную дынаміку ва ўсіх сферах».

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, існуюць розныя меркаванні наконт таго, каму падтрымка бюджэту найбольш неабходная. «Рэальны сектар будзе цягнуць, вядома ж, коўдру на сябе, як гэта ў нас часта бывае. Фінансісты скажуць, што неабходна перш за ўсё скарачаць дзяржаўны доўг. Маю пазіцыю чулі не толькі вы, але і ўвесь народ: бюджэт служыць мэтам сацыяльнай палітыкі, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Падаткі павінны максімальна вяртацца ў грамадства праз медыцыну, адукацыю, заработныя платы бюджэтнікаў, падтрымку найбольш уразлівых слаёў насельніцтва».

Урад мае намер прадоўжыць падтрымліваць прадпрыемствы, але Прэзідэнт ставіць пытанне, на якія мэты накіраваны прапановы па гэтай практыцы. «Нам патрэбны прадпрыемствы, якія жывуць без пастаяннага сілкавання з дзяржбюджэту», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Менавіта вытворчасць сама павінна зарабляць грошы і накіроўваць іх у бюджэт, а не наадварот. Гэта датычыцца і тых, дзе была прафінансаваная мадэрнізацыя.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў прэм'ер-міністра далажыць, як будуць расці даходы насельніцтва і як павышаць эфектыўнасць бюджэтнай сістэмы для забеспячэння сацыяльных стандартаў, а таксама аб тым, ці дастаткова мер для скарачэння дзярждоўгу. Міністр эканомікі праінфармаваў, што неабходна сёння для апераджальнага эканамічнага росту. Пасля нарады прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў і міністр эканомікі Уладзімір Зіноўскі расказалі журналістам, на якія моманты звярнулі ўвагу падчас абмеркавання.

Андрэй Кабякоў адзначыў, што Прэзідэнту далажылі аб асноўных выніках першага квартала 2018 года. Сапраўды, мы маем станоўчую дынаміку ў эканамічным развіцці краіны і даходная частка бюджэту выконваецца лепш, чым гэта прадугледжана законам аб бюджэце. Урад прапанаваў падыходы, як скарыстацца гэтымі звышзапланаванымі даходамі. Першы квартал дае падставу аптымістычна паглядзець на выкананне бюджэту 2018 года, лічыць прэм'ер-міністр.

Наконт праблем з некаторымі прадпрыемствамі Андрэй Кабякоў растлумачыў, што, перш за ўсё, яны звязаны з даволі вялікай крэдытнай запазычанасцю з-за мадэрнізацыі. Бізнес-планы не ў поўным аб'ёме спрацавалі, і на кожным такім прадпрыемстве будзе вывучацца індывідуальная сітуацыя: неабходна высветліць прычыны і следства памылак. Што датычыцца кіраўніцтва прадпрыемстваў, якія не выканалі ўмовы дзяржпадтрымкі, працягваць працаваць на сваіх пасадах яно не будзе. Гэта прынцыповая пазіцыя, падкрэсліў кіраўнік урада. Дзяржава, на думку Андрэя Кабякова, павінна прымаць меры, каб прадпрыемствы працавалі эфектыўна. Пытанне — якія меры? Гэта зноў жа індывідуальны набор для кожнага выпадку.

Па сярэдняй заработнай плаце прэм'ер-міністр адзначыў, што ў сакавіку яна склалася на ўзроўні 927 рублёў па краіне. Робіцца ўпор на тыя арганізацыі, дзе заробак мае сур'ёзнае адхіленне ад тысячарублёвага ўзроўню, каб рэалізаваць комплекс мер, якія дазволяць выправіць сітуацыю. Задача няпростая, але, як лічыць Андрэй Кабякоў, яна павінна быць вырашана, каб людзі не з'язджалі ў іншыя рэгіёны ці краіны.

Міністр эканомікі Уладзімір Зіноўскі нагадаў, што Аляксандр Лукашэнка ў Пасланні да беларускага народа і парламента паставіў задачу да канца 2025 года мець ВУП $100 млрд. (Сёлета чакаецца ВУП на ўзроўні $60 млрд.) Гэта лічба каласальная, але няма нічога немагчымага, лічыць Уладзімір Зіноўскі. Міністэрства эканомікі ўвесь мінулы год і ў пачатку гэтага займаецца распрацоўкай плана індустрыялізацыі краіны, калі да кожнага з 118 раёнаў будуць прывязаныя пэўныя інвестыцыйныя праекты. У гэтым плане пакуль 1740 праектаў, і ў ліпені на пасяджэнні Прэзідыума савета Міністраў плануецца яго разгледзець. Калі план будзе здзейснены, дасягнуць лічбы ў $100 млрд цалкам рэальна, лічыць міністр эканомікі.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## РАСКАЗАЦЬ ПРА ТОЕ, ШТО ХВАЛЮЕ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі па ўсёй Беларусі пройдуць у гэтую суботу, 5 мая. На сувязь з насельніцтвам выйдуць кіраўнікі ў рэгіёнах і Мінгарвыканкаме. Вынік такога дыялогу — аператыўнае вырашэнне надзённых пытанняў, зрэшты, ад суботы да суботы колькасць праблемных званкоў скарачаецца.**

**Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Мікалай Васілевіч ТОКАР. Тэл. 8-016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Віктар Вітальевіч АСКЕРКА. Тэл. 8-021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатольеўна ЗЯНКЕВІЧ. Тэл. 8-023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8-015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Іванавіч ХАРЫТОНЧЫК. Тэл. 8-022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Алег Альфрэдавіч ПЛАЎСКІ. Тэл. 8-017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8-017 222 44 44.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЛАЎРОЎ РАСКАЗАЎ АБ ТРЫВОЗЕ ЗА «СХАВАНЫХ» СПЕЦСЛУЖБАМІ АНГЛІІ СКРЫПАЛЁЎ



Кіраўнік МЗС Расіі заявіў, што ўлады РФ занепакоены здароўем Сяргея і Юліі Скрыпалёў, «уцягнутых англічанамі ў правакацыю». Дзеянні брытанскіх улад Лаўроў назваў абсалютна непрымальнымі.

«Паводзіны брытанскіх улад выклікаюць мноства пытанняў», — сказаў Лаўроў, па словах якога, асабліва непакой Расіі выклікае нежаданне афіцыйнага Лондана даць інфармацыю аб аказваемай Скрыпалям дапамозе.

«Самі пацярпелыя схаваны брытанскімі спецслужбамі. Расійскі бок перш за ўсё непакоіць стан здароўя і становішча Скрыпалёў, уцягнутых англічанамі ў гэтую правакацыю. Адмова ўлад Вялікабрытаніі ў консульскім доступе дае падставы разглядаць тое, што адбываецца, як іх выкраданне або наўмысную ізаляцыю. Гэта абсалютна непрымальна», — лічыць кіраўнік МЗС Расіі.

Нагадаем, 4 сакавіка ў Солсберы былі выяўлены без прытомнасці экс-палкоўнік ГРУ Сяргей Скрыпаль і яго дачка Юлія. Па версіі брытанскіх улад, яны былі атручаны распрацаваным яшчэ ў часы СССР нервова-паралітычным рэчывам «Навічок». Лондан абвінаваціў Маскву ў атручванні Скрыпалёў і на падставе гэтых абвінавачванняў выслаў з краіны вялікую групу расійскіх дыпламатаў.

### МІНІСТР СУВЯЗІ РАСІІ ДАПУСЦІЎ БЛАКІРАВАННЕ VIBER УСЛЕД ЗА TELEGRAM

Супраць месенджара Viber у Расіі могуць быць прынятыя такія ж меры, пад якія трапіў Telegram, калі спецслужбы не атрымаюць доступу да ключоў шыфравання, заявіў міністр сувязі Мікалай Нікіфараў.

«Гэтае пытанне да Федэральнай службы бяспекі, таму што паўнамоцтвы ў частцы такіх спецыфічных пытанняў выканання загаду па перадачы ключоў шыфравання — гэта паўнамоцтвы ФСБ. Калі ў іх будуць праблемы з перадачай ключоў шыфравання, то яны гэтак жа могуць звярнуцца ў суд і атрымаць аналагічнае судовае рашэнне», — цытуе міністра ТАСС.

### 109 ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛІ З-ЗА ПЯСЧАНАЙ БУРЫ Ў ІНДЫІ

109 чалавек загінулі ў выніку пясчанай буры ў паўночных штатах Індыі, паведамляе India Today.

Па звестках выдання, найбольш пацярпелым раёнам стаў штат Утар-Прадэш, у якім загінулі па меншай меры 50 чалавек, 38 атрымалі раненні, гэтак жа бура прайшла ў гарадах у штаце Раджастан, дзе загінулі па меншай меры 32 чалавекі. Штармавы вецер вырываў дрэвы і валіў электрычныя слупы, разбураў дамы.

Прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі выказаў спачуванні сем'ям загінулых і пацярпелых і даручыў уладам узгадніць меры па аказанні дапамогі маючым патрэбу.

# Паўгода на рэканструкцыю моста

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 2 мая падпісаў Указ № 150 «Аб рэканструкцыі моста». Дакументам прадугледжваюцца арганізацыйныя меры па забеспячэнні рэканструкцыі моста цераз Прыпяць у Жыткавіцкім раёне, якія дазваляюць завяршыць работы ў 2018 годзе.**

**Старшыня Жыткавіцкага райвыканкама Віктар АТЛІВАНАЎ** нагадвае, што цяпер раён падзелены на дзве часткі:

— Мост для нас стратэгічна важны, бо ў абодва бакі пастаянна трэба весці дастаўку ўгнаенняў, паліва, прадукцыі... За Прыпяццю знаходзіцца Тураўскі малочны камбінат, самае магутнае сельгаспрадпрыемства нашага раёна «Тураўшчына» і фермерская гаспадарка Міхаіла Шруба. Цяпер у дзень праз паромную і пантонную пераправы праходзіць каля дзвюх тысяч аўтамабіляў. Таму пераацаніць неабходнасць тэрміновага будаўніцтва моста проста немагчыма. Пакуль не было паромнай і пантоннай пераправаў, Тураўскі камбінат і сельгаспрадпрыемствы неслі вялікія выдаткі — транспартнае плячо аб'езду складала каля 300 км. На сённяшні момант абедзве пераправы працуюць па графіку. Паромная раз у гадзіну — з 6.00 да 20.00. Пантонная — кругласутачна. На жаль, не кожная тэхніка можа скарыстацца пантоннай пераправай. Таму цяжкая перазджае на пароме, што па часе атрымліваецца даўжэй. З рухам па пантоннай пераправе ўзнікаюць складанасці толькі тады, калі па рацэ праходзяць судны. Сёння, напрыклад, пантонную пераправу разводзілі на дзве гадзіны — праходзіў сухагруз з матэрыяламі для работ на мосце. Людзей пры гэтым апавяшчаем своечасова праз sms і прэсу. Для нас важна, што кіраўнік дзяржавы даў распараджэнне зрабіць мост капітальным, дасканалым, трывалым і зручным. Канешне, усе жыхары Жыткавіцкага раёна чакаюць, калі будзе пабудаваны мост.

Вядома, што генеральнай праектнай арганізацыяй вызначана дзяржаўнае прадпрыемства «Белдзіпрадар», генеральнай падраднай арганізацыяй па выкананні будаўніча-мантажных работ — ААТ «Мастабуд». Прадпрыемства «БЕЛДАРНДІ» стала арганізацыяй, якая здзяйсняе навукова-тэхнічнае суправаджэнне праекта.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Цяпер без партфеляў

**Міністр энергетыкі Уладзімір Патупчык, а таксама начальнік Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Сяргей Новікаў і яго намеснік Аляксандр Дунькoвіч вызваленыя ад займаных пасад. Адпаведныя ўказы падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

Два кіраўнікі Дзяржаўнай інспекцыі пазбавіліся пасад за непрыняцце мер па спыненні правапарушэнняў і фактаў карупцыі ў падведамасных арганізацыях. Так, у інспекцыі былі выяўлены факты карупцыі, звязаныя з браканьерствам. Учора стала вядома, што выконваючым абавязкі начальніка Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету Прэзідэнт назначыў Аляксандра Назаранку.

Карупцыйныя правапарушэнні мелі месца і ў сістэме Міністэрства энергетыкі. Па гэтай прычыне быў звольнены генеральны дырэктар «Белэнерга» Яўген Воранаў. Затым стала вядома і аб вызваленні ад пасады міністра энергетыкі. Як заявіў старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерый Вакульчык у эфіры тэлеканала «Беларусь 1», Уладзімір Патупчык пазбавіўся мiністэрскага партфеля за заступніцтва ў стварэнні незаконнага сямейнага бізнесу па пастаўках будматэрыялаў па завышаных цэнах.

«Падчас даклада кіраўніку дзяржавы абмяркоўвалася пытанне, звязанае з міністрам энергетыкі Беларусі. Не так даўно Прэзідэнтам была пастаўлена задача разабрацца з інфармацыяй, якая датычыцца асабіста міністра і членаў яго сям'і. Гэтая работа камітэтам была праведзена. Устаноўлена наяўнасць створанага пры падтрымцы і заступніцтве асабіста міністра энергетыкі Патупчыка сямейнага бізнесу, падраду, які заключаецца ў пастаўцы будматэрыялаў па завышаных цэнах на аб'екты будаўніцтва, што спрыяла, натуральна, узбагачэнню, незаконнаму атрыманню прыбытку», — адзначыў старшыня КДБ.

■ Фінансы

# Застынуць да канца года?

## У Нацбанку спрагназавалі стабільнасць дэпазітных і крэдытных ставак

**Працэнтныя стаўкі на дэпазітным і крэдытным рынках у 2018 годзе застануцца блізкімі да існуючых узроўняў, нязначныя іх ваганні таксама магчымыя. Пра гэта паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацбанка Дзмітрый МУРЫН у дакладзе на пашыраным пасяджэнні праўлення Нацбанка.**

Сярэдняя працэнтная стаўка па новых крэдытах у нацвалюце, дадзеная фізічным асобам, у сакавіку 2018 года склала 11,4 % гадавых, павялічыўшыся ў параўнанні са снежнем 2017 года на 0,3 %.

Нагадаем, што ў першым квартале 2018 года стаўка рэфінансавання была зніжана з 11 % да 10,5 % гадавых. Паводле ацэнак Нацыянальнага банка, такая велічыня стаўкі на міжбанкаўскім рынку з'яўляецца «нейтральнай». Пры такім яе значэнні ўзровень інфляцыі адпавядае мэтаваму параметру, а ў краіне назіраецца ўстойлівы эканамічны рост.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

■ Ёсць кантакт

# ЗНАХОДЗЯЧЫ АГУЛЬНАЕ

## Журналісты Паднябеснай уражаны беларускай прыродай і сістэмай сацыяльнай абароны

**Чацвёрты дзень візіту ў Беларусь прадстаўнікоў кітайскіх СМІ завяршыўся сустрэчай з міністрам інфармацыі Аляксандрам Карлюкевічам. Гэта стала нагодай распытаць удзельнікаў прэс-тура пра ўражанні ад вандроўкі па краіне.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— За тры першыя дні мы наведалі аграсядзібы, Белавежскую пушчу, горад Брэст, «Савушкін прадукт» і калійную кампанію ў Салігорску, — падзяліўся ўражаннямі **ЖАН Хоньпінь, кіраўнік аддзела грамадска-палітычных навін газеты «Веснік Сычуаня»**. — Так атрымалася, што напачатку камандзіроўкі я адчуваў сябе прастуджаным, але цяпер цалкам здаровы, поўны сіл і энергіі. Думаю, у гэтым заслуга беларускай экалогіі. Тут багатая прырода, яна выклікае захапленне. Усё, што мы ўбачылі, нас прыемна ўразіла. Складана нешта вылучыць, тым не менш горад Брэст адразу палюбіўся. Я збіраюся напісаць у сваім артыкуле пра ўсё, што нам тут паказалі. Таксама раскажу пра супрацоўніцтва правінцыі Сычуань з беларускім бокам.

Дарэчы, гэта супрацоўніцтва развіваецца. У 2016 годзе пачалося будаўніцтва кітайскага завода па зборцы суперкандэнсатараў для электратранспарту ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень». Сёлета чакаецца выпуск першай прадукцыі. Штаб-кватэра завода размешчана ў сталіцы правінцыі Сычуань горадзе Чэнду. У 2017 годзе ў Беларусі пабываў з візітам віцэ-губернатар правінцыі Лю Цзе. Сёлета ў сакавіку ў Чэнду адбыўся форум гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Кітая і Беларусі, арганізаваны беларускім пасольствам у КНР. У форуме ўдзельнічала каля 120 прадстаўнікоў кампаній з правінцый Сычуань, Шаньдун, Ляанін, горада Пекіна і іншых рэгіёнаў Кітая.

— Думаю, кітайскія журналісты звернуць увагу на сумесныя праекты, рэалізацыя якіх паспяхова праходзіць у нас у краіне. Прэс-тур дае магчымасць больш шырока развіваць эканамічныя адносіны, — сказаў на сустрэчы **міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.**

Міністр таксама заўважыў, што журналістыка не толькі садзейнічае ўсталяванню знешнепалітычных і знешнеэканамічных кантактаў, але і дапамагае развіццю народнай дыпламатыі, збліжэнню краін па сваіх памкненнях.

Такую ж думку выказвалі і самі журналісты.

— Лічу, праз зносіны паміж прадстаўнікамі СМІ дзвюх краін мы можам развіваць нашу дружбу, папулярызаваць культуру абодвух народаў, — падзяліўся з беларускімі калегамі **ХУА Дуатай, галоўны рэдактар інфармацыйнага партала правінцыі Цінхай**. — Для нас Беларусь — тэра інкогніта. Мы не ведаем вашых традыцый, гісторыі. Толькі чулі назву і ўяўляем, дзе яна знаходзіцца. Мой удзел у прэс-туры будзе садзейнічаць распаўсюджванню ведаў пра Беларусь сярод тыбецкай народнасці, бо наш інфармацыйны партал распаўсюджвае інфармацыю на двух мовах: на кітайскай і тыбецкай. Я заўважыў, што паміж беларусамі і тыбетцамі ёсць агульнае — усе думкі і жаданні мы прапускаем праз сэрца, мы вельмі добразычлівыя, імкнёмся да міру і гармоніі.

Кітайскі журналіст прызнаўся, што яго вельмі ўразіў беларускі лад жыцця, які ён таксама знайшоў падобным на кітайскі. «Вы такая ж спакойная нацыя, аддаяце перавагу парадку, гэта мне вельмі імпануе, — сказаў ён. — Яшчэ мне падабаюцца вашы адносіны да экалогіі, ашчаднае стаўленне да прыроды. Нарэшце, прыемна здзівіла беларуская сістэма сацыяльнага забеспячэння. Думаю, па гэтых кірунках мы можам у вас вучыцца і абменьвацца вопытам».

Прэс-тур па Беларусі для кітайскіх СМІ арганізаваны шэрагам беларускіх міністэрстваў, Мінскім, Гродзенскім і Брэсцкім аблвыканкамамі, Нацыянальным прэс-цэнтрам і ладзіцца другі год запар.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

# ІСНАВАЛІ, ІСНУЮЦЬ І БУДУЦЬ ІСНАВАЦЬ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сродкі масавай інфармацыі павінны фарміраваць канструктыўную грамадскую думку праз своечасовую і аб'ектыўную падачу матэрыялаў, праз шчыры і ўдумлівы дыялог з аўдыторыяй. Перакананы, што такая прадстаўнічая міжнародная пляцоўка паспрыяе аб'яднанню грамадства, сцвярджэнню ідэй міру і добрасуседства».

**Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** у сваім выступленні адзначыў:

— Сёння шырокая палітра сродкаў масавай інфармацыі, самых разнастайных медыйных рэсурсаў стварае шырокую карціну свету. Хацелася б, каб у гэтых памкненнях да дакладнай падачы інфармацыі, да самага сур'ёзнага, аб'ектыўнага расповеду пра нашу рэчаіснасць мы ўсе заставаліся ў кірунку да кансалідацыі, да адлюстравання светлых інтарэсаў нашай краіны.




Фота БелТА.

Перад адкрыццём выставы ва ўрачыстай абстаноўцы было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве СМІ Беларусі і Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі Расіі. Адпаведная дамоўленасць была дасягнута на сустрэчы міністра інфармацыі Беларусі Аляксандра Карлюкевіча і віцэ-губернатара Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі Ірыны Сакаловай.

— Ямал лічаць энергетычным сэрцам Расіі, у нас здабываюць 85 % газу ўсёй краіны. Але галоўнае наша багацце — гэта людзі, — мяркуе **Ірына САКАЛОВА**. — Пры насельніцтве ў 500 тысяч чалавек у нас жыве 112 нацыянальнасцяў і народнасцяў, і 8 % з іх складаюць карэнныя народы Поўначы. У нас выходзяць газеты на нацыянальных мовах — і яны прадстаўлены на стэндзе ў Беларусі. У нашай акрузе працуе 160 сродкаў масавай інфармацыі — падчас выставы вы можаце ўбачыць іх рэгіянальныя і федэральныя структуры. Мы мяркуем, што выстава «СМІ ў Беларусі» дазволіць нам лепш даведацца адно пра аднаго. І стане добрым унёскам у скарбонку гуманітарных сувязяў нашых краін.

Выставу наведала дэлегацыя кітайскіх журналістаў, якая гэтымі днямі знаходзіцца ў прэс-туры па нашай краіне. Замежныя госці ўжо пабывалі шмат дзе. Але адным з асноўных пунктаў іх вандроўкі, натуральна, стала наведванне выставы СМІ. Адна з замежных гасцей, шэф-рэдактар радыё «Qinghai» Чжу Чхэн Юань, адзначыла:

— У Кітаі выставы СМІ праходзяць амаль у кожным рэгіёне. Я заўважыла, што беларускія журналісты вельмі маладыя, вельмі працалюбівыя і старанныя. А мы, калі вернемся дадому, таксама пастараемся вельмі падрабязна расказаць усё, што даведаліся пра вашу краіну.

Увагу наведвальнікаў выставы прыцягвае і стэнд Выдавецкага дома «Звязда». Шмат мерапрыемстваў праходзіць як на самім стэндзе, так і запланавана для правядзення ў канферэнцзале. Сярод апошніх круглыя сталы, адзін з іх прысвечаны юбілею часопіса «Маладосць», якому споўнілася 65 гадоў. Другі ладзіцца сумесна з «Настаўніцкай газетай» і прысвечаны Году малой радзімы і краязнаўству.

**Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ** расказаў:

— Кожны часопіс і газета, якія ўваходзяць у Выдавецкі дом «Звязда», прадстаўляюць сваю праграму, якая прэзентуе гэтае выданне. Таму стэнд «Звязды» насычаны цікавымі мерапрыемствамі на працягу ўсіх трох дзён.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# «Залатая Ліцера» — у звяздоўскіх эколагаў!



Учора ў фармаце выставы «СМІ ў Беларусі» традыцыйна былі падведзены вынікі конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Ліцера». І сёлета звяздоўцы не засталіся без узнагарод. Пераможцам у намінацыі «Найлепшы сумесны праект з дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі» стаў праект «Звязды» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя «Карані і кроны». Уласны карэспандэнт «Звязды» па Магілёўскай вобласці, аўтар праекта «Глуша Адамовіча», Нэлі Зігуля стала лаўрэатам у намінацыі «Найлепшыя матэрыялы гісторыка-культурнай тэматыкі». А газета «Літаратура і мастацтва», што выходзіць у Выдавецкім доме «Звязда», узяла статуэтку пераможцы ў намінацыі «Найлепшыя матэрыялы культурнай тэматыкі».

# Бясплатная юрыдычная кансультацыя — ад нашай газеты

**Стэнд Выдавецкага дома «Звязда» на выставе «СМІ ў Беларусі» сумесна з Беларускай натарыяльнай палатай праводзе акцыю. 4 мая нашы чытачы змогуць атрымаць бясплатную кансультацыю ад спецыялістаў Мінскай гарадской і Мінскай абласной натарыяльных акруг.**

Спецыялісты будуць рады даць інфармацыю пра ўсё, што датычыцца завяшчання, дарэння, спадчынных правоў, выезду дзяцей за мяжу, адчужэння нерухомасці, здзяйснення выканаўчых надпісаў, а таксама адказы на іншыя актуальныя пытанні, якія ўваходзяць у кампетэнцыю натарыята.

Спецыялісты Мінскай гарадской натарыяльнай акругі прымуць грамадзян з 10 да 12 гадзін, а Мінскай абласной — з 12 да 14.

■ На слыху

# ВАЛЯР'ЯНКА І ВАНІЛІН НЕ ПРЫВАБЛІВАЮЦЬ ГНЮСУ

**На Брэстчыне адзначаны масавы вылет мошак. Кузуркі-крывасмокі найбольш развяліся ў ваколіцах Заходняга Буга, але і паблізу іншых рэк іх нямала. Гэта заўважылі дачнікі і адпачывальнікі ўжо ў мінулыя выхадныя. Пад вечар дробная машкара літаральна атакуе людзей і хатніх жывёлін.**



Спецыялісты гавораць, што гэта першы масавы вылет мошак, які будзе доўжыцца каля двух тыдняў, а праз некаторы час будзе і другі. Апошняму спрые надзвычай цёплае надвор'е. Кузуркі адкладваюць лічынкі і выводзяцца менавіта паблізу рэк, але дарослыя асобіны здольныя далятаць на адлегласць да 10 кіламетраў.

**Энтамолаг Брэсцкага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ларыса ЯРАЦ** параджвае, што найлепшым спосабам абараніцца ад укусаў мошак з'яўляецца прафілактыка. Можна карыстацца рэпелентамі, якія прадаюцца ў аптэцы, альбо узяць адэкалон, дадаць некалькі кропель валяр'янкі і націрці адкрытыя ўчасткі скуры, падыдзе таксама раствор крышталічнага ваніліну. Не лішнім будзе і в'етнамскі бальзам «Залатая зорка», асабліва калі мошкі ўжо пакусалі і скура свярбіць ці нават баліць. Дарэчы, летась у рэгіёне пасля ўкусаў мошак па медыцынскую дапамогу звярнуліся 42 чалавекі. Таму варта не ігнараваць меры прафілактыкі, па магчымасці абараніць сябе і дзяцей ад назойлівай машкары.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Медыяснеданак

Паслу Вялікабрытаніі працаваць у нас «выдатна і бяспечна»

# «БЕЛАРУСЬ — ГЭТА КАВАЛАК ПІРАГА»

**Учора ў Мінску адбылася сустрэча прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі з Фіёнай ГІБ — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Вялікабрытаніі ў нашай краіне. З якімі складанасцямі яна сутыкнулася за час працы ў Беларусі, калі ў Мінск прыедзе Борыс Джонсан і што думаюць у брытанскім пасольстве пра адмену смяротнага пакарання — на гэтыя і іншыя пытанні адказала дыпламат.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

### Што адбываецца з «брэксітам»?

Па словах Фіёны Гіб, перамовы па гэтым пытанні працягваюцца, яшчэ неабходна вырашыць вялікае кола пытанняў. Дзве галоўныя высновы з нагоды выхаду Вялікабрытаніі з Еўрапейскага саюза такія: па-першае, Вялікабрытанія пакідае не Еўропу, а ЕС. Па-другое, Вялікабрытанія працягне выконваць адну з асноўных роляў на міжнароднай арэне.

«Мы сапраўды з'яўляемся глабальным гульцом, пастаянным членам Савета Бяспекі, Вялікай сямёркі, і мы сапраўды зробім тое, што неабходна, каб паспяхова завяршыць гэты працэс», — дадала пасол. Яна таксама нагадала, што сам народ прагаласаваў за выхад з Еўрасаюза, але на цяперашні момант важна зрабіць так, каб працэс скончыўся на карысць усіх жыхароў краіны.

Дарэчы, на пытанне аб тым, ці паўплывае «брэксіт» на адносіны Беларусі і Вялікабрытаніі, Фіёна Гіб адказала адмоўна. «А калі і паўплывае, то толькі ў лепшы бок», — дадала яна.

У працяг тэмы беларуска-брытанскіх адносін у Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла спыталі, ці магчымы візіт міністра замежных спраў Вялікабрытаніі Барыса Джонсана ў Беларусь. «Не думаю, што гэта адбудзецца сёлета. Ва ўсякім выпадку, такіх планаў у нашым парадку дня няма», — дадала яна.

Акрамя таго, Вялікабрытанія пакуль не плануе адкрываць візавы цэнтр у Мінску.

### За прыход інвестараў з Туманнага Альбіёна

Фіёна Гіб таксама распавяла, што пасольства Вялікабрытаніі зацікаўлена ў больш актыўным прыходзе брытанскіх інвестараў у Беларусь.

«Нават калі гаворка не ідзе пра інвестыцыі, паколькі інвеставанне — гэта сур'ёзны крок для брытанскіх кампаній, над якім неабходна добра думаць, ужо нядрэнна, калі развіваюцца гандлёва-эканамічныя кантакты паміж кампаніямі дзвюх дзяржаў», — адзначыла яна.

Фіёна Гіб дадала, што іх пасольства невялікае, таму ў ім няма адмысловага аддзела, які б супрацоўнічаў са спецыяльным дэпартаментам па прамысловасці і гандлі. «Тым не менш мы аказваем усялякую падтрымку брытанскім кампаніям, якія дэманструюць зацікаўленасць у супрацоўніцтве з Беларуссю, разглядаюць магчымае інвеставанне ў Беларусь», — сказала Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол.

Дарэчы, патэнцыял узаемнага супрацоўніцтва ёсць у такіх сферах, як будаўніцтва і лесапераапрацоўка. Акрамя гэтага, дыпламат звярнула ўвагу на тое, што Беларусі трэба больш актыўна прасоўваць свае эканамічныя інтарэсы ў Вялікабрытаніі, рэкламаваць сябе, а таксама выходзіць на міжнародныя рынкі.

### Ці «пераедзе» Брытанскі савет з Расіі ў Беларусь?

Нагадаем, у сувязі з міжнародным скандалам па справе Скрыпаля акрамя высылкі брытанскіх дыпламатаў з Расіі быў закрыты і Брытанскі савет — арганізацыя, закліканая развіваць супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, культуры і мастацтва паміж Вялікабрытаніяй і іншымі краінамі.

«Я з задавальненнем бы аднавіла работу гэтай арганізацыі ў Беларусі, аднак гэта паўаўтаномная структура, за яе прымае рашэнні не міністэрства замежных спраў, сам савет павінен прыняць такое рашэнне», — адзначыла Фіёна Гіб.

Яна таксама дадала, што зараз вядуцца перамовы з кіеўскім офісам Брытанскага савета і абмяркоўваецца з'яўленне ў Мінску ўстановы па вывучэнні англійскай мовы пад эгідай гэтай арганізацыі.

### Калі грамадскасць ідзе за ўладай

Гаворачы пра адмену смяротнага пакарання, дыпламат адзначыла, што ў гэтым пытанні нельга перш за ўсё абапірацца на грамадскую думку, бо яна, як правіла, падтрымлівае пункт гледжання ўрада. «У Вялікабрытаніі смяротнае пакаранне было адменена яшчэ ў 1960-я гады, аднак па выніках апытання грамадскасць нарэшце пагадзілася з тым, што неабходна было яго адмяніць, усяго дзесяць гадоў таму», — падкрэсліла Фіёна Гіб. — У прынцыпе, цяпер назіраецца скарачэнне колькасці людзей, якія падтрымліваюць смяротнае пакаранне, і паралельна адбываецца павелічэнне тых, хто выступае супраць. Гэта ўжо з'яўляецца нядрэнным вынікам. У любым выпадку, паўтаруся, грамадская думка не павінна быць асноватворным фактарам тут».

Фіёна Гіб нагадала, што Беларусь з'яўляецца адзінай краінай у Еўропе, у якой на практыцы выконваецца такая мера пакарання. «Адмена смяротнага пакарання з'яўляецца вельмі важнай часткай парадку абмеркавання правоў чалавека, — лічыць Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол. — І мы ўсяляк садзейнічаем таму, каб урад прыняў мараторый на смяротнае пакаранне як першы крок да яго адмены».

### Беларусь = бяспека

На пытанне аб тым, з якімі складанасцямі сутыкнулася Фіёна Гіб на сваёй пасадзе ў Беларусі, яна не змагла адказаць, але пры гэтым растлумачыла сваю пазіцыю.

«Да Беларусі я працавала ў такіх краінах, як Емен, Ірак, Самалі, — нагадала дыпламат. — І тут — гэта кавалак пірага! Што датычыцца фізічнага адчування ад работы, то перш за ўсё тут выдатна і бяспечна. Што да працоўных абавязкаў, то мы сутыкаемся з пэўнымі цяжкасцямі і выклікамі, але наогул можна зрабіць выснову, што ваша краіна, няхай і павольна, рухаецца ў правільным напрамку».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**



Фота БелТА.

# УСТАНОЎЛЕНЫ ТАРЫФ НА ЭНЕРГІЮ ДЛЯ ЗАРАДКІ АЎТО

**З мэтай развіцця рынку электрамабіляў у Беларусі ўпершыню ўстаноўлены тарыф на электрычную энергію, якая адпускаецца РУП электраэнергетыкі ДВА «Белэнерга» і якая выкарыстоўваецца стацыянарнымі станцыямі, прызначанымі для зарадкі электрамабіляў.**

Дадзены тарыф уведзены з 1 мая і складае 0,15693 рубля (без ПДВ) за 1 кВт·гадз., што ніжэй за агульны тарыф для арганізацый, якія працуюць у сферы паслуг, на 48 працэнтаў.

Паколькі тарыф на электрычную энергію выкарыстоўваецца ў адносінах да юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія аказваюць паслугі па зарадцы электрамабіляў, ён падлягае індэксацыі на змяненне курса беларускага рубля да долара ЗША ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Пры фарміраванні тарыфу Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю зыходзіла з неабходнасці кампенсацыі выдаткаў на вытворчасць электраэнергіі і атрымання энергазабеспячальнымі арганізацыямі мінімальна неабходнага прыбытку для пашыранага ўзнаўлення.

Указаны тарыф супастаўны з тарыфам на электрычную энергію для насельніцтва, які забяспечвае поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат на яе выпрацоўку. Такім чынам, асноўны спажывец дадзенай паслугі — насельніцтва — атрымае магчымасць ажыццяўляць зарадку аўтамабіля самастойна ў хатніх умовах або атрымліваць паслугу па зарадцы аўтамабіля з дапамогай зарадных станцый юрыдычных асоб або індывідуальных прадпрымальнікаў, якія аказваюць такія паслугі, на супастаўных умовах.

Як адзначылі ў Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю, дзяржаўнаму рэгуляванню падлягае сам тарыф на электрычную энергію, у той час як тарыф на аказанне паслугі па зарадцы аўтамабіляў будзе вызначацца гаспадарчым суб'ектам самастойна зыходзячы з кан'юнктуры рынку з улікам выдаткаў на куплю электрычнай энергіі па паказаным тарыфе і іншых затрат, звязаных з аказаннем паслугі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# АНТРАЦЫТАВЫ КРАСАВІК

**Накіды да кнігі, якая наўрад ці будзе напісана**

КАЛІ-НЕБУДЗЬ я, напэўна, напішу пра гэта кнігу. Сцішыцца боль, эмоцыі зменяцца на халодныя разважанні, усё стане на свае месцы. Мітуслівыя трывожныя дні і бяссонныя роспачныя ночы складуцца ў тры тыдні, праведзеныя ў адным з самых цяжкіх аддзяленняў сталічнай бальніцы, і стануць проста лічбамі ў календары жыцця, красавіком 2018 года, пазначаным цьмяна-чорным, антрацытавага адцення колерам. І паслужлівая прафесійная памяць (вось яна, здрадлівая чалавечая натура: нават у роспачнай трывозе назіраеш і запамінаеш) лепш за любы нататнік нагадае пачутае, убачанае, адчутае, перажытае. Гэткія важныя для любога аўтара дэталі, якія, калі пастарацца, складуцца ў адзін выразны пазл, і яго аддрукуюць, пераплятуць у вокладку, паставяць на паліцу кнігарні, і які-небудзь самотны бібліяфіл выпадкова возьме яго ў рукі і нават пагартае і пачытае некалькі сказаў. І яго, раптам здарыцца, нават зацікавіць тое, што я калі-небудзь напішу.

Я напішу, напрыклад, пра тое, што ў бальніцы толькі два самыя яркія колеры — чырвоны і белы. Чырвоным засцерагальным святлом успыхвае надпіс «Не ўваходзіць!» на ўсіх кабінетах, дзе праводзяцца якія-небудзь даследаванні. Белым халодным-халодным, ледзяным колерам гарыць у канцы доўгага калідора шыльда над рэанімацыяй. Белыя глухія дзверы заўжды замкнуты знутры — уваход пабочным там забаронены ў любы час сутак, і сцюдзёная шыльда нагадвае аб гэтым таксама кругласутачна. Зона адчужэння, калідор паміж гэтым і іншым светам, па якім дарога і ў адзін, і ў другі бок аднолькавая, і, пэўна, толькі хтосьці адзін нябачны вырашае, у якім напрамку кожнаму, хто туды трапляе, рухацца... Паказальнікі выхада, традыцыйна пафарбаваныя ў зялёны, у бальніцы чамусьці не падсвечваюцца. Той, каму суджана адсюль выйсці, знойдзе іх і без дадатковай падказкі.

Яшчэ я абавязкова напішу пра тое, што такое сапраўднае каханне і якімі моцнымі і кранальнымі могуць быць нашы мужчыны. Пра саракагадовага Сяргея, які дзяжурыў каля ложка безнадзейна хворай жонкі круглыя суткі, карміў яе з лыжачкі, падстаўляў судна, не даючы гэта рабіць санітаркам, выконваў усе капрызы сваёй Святланы. Пра адчайную радасць на яго твары, калі ў адзін дзень жонка змагла ўстаць і з яго дапамогай зрабіць два крокі па палаце, пра яго «Мы з табой яшчэ патанцуем!», у якім было столькі надзеі. Пра яго спалатнелы твар і нежывыя бляклыя вочы, калі ўрачы выставілі яго з палаты, а праз нейкі час выйшлі адтуль самі, апусціўшы рукі... А яшчэ я напішу пра шасцідзесяціпяцігадовага Міхаіла, які прыходзіў да сваёй прыкутай да ложка Ірыны па тры разы на дзень, прыносіў ёй з дому ежу, мяняў ёй падгузкі, мыў. А дома ляжала таксама прыкаваная да ложка дзевяностагадовая жончына маці, якую таксама трэба было дагледзець. Бабулю ўрэшце прывезлі ў тую ж бальніцу, дзе яна праз некалькі гадзін сканала, і ён з сынамі займаўся пахаваннем недзе на Палессі, але ўсё роўна прыходзіў да жонкі і нічога ёй не казаў, толькі быў яшчэ больш пяшчотны з ёю і вочы ў яго неяк дзіўна блішчэлі...

ЯШЧЭ я напішу пра санітарку Элу, якая спачатку дагледала тут хворага бацьку, дзеля чаго вымушана была кінуць працу, а потым, калі бацькі не стала, так і засталася. Пра яе спагаду і разуменне, пра тое, як яна спакойна адказвае на пытанне, якое задаюць, пэўна, усе, каму лёсіць бліжэй пазнаёміцца з гэтым страшным аддзяленнем: «Як вы тут працуеце?» Яна паціскае плячыма, сумна ўсміхаецца: «Хтосьці ж і тут павінен людзям дапамагаць...» Пра яе самы страшны ўласны кашмар: у чатырнаццаць гадоў яна знайшла ў ванным пакоі павешаную маці і нават праз доўгія дзесяцігоддзі, змяніўшы некалькі кватэр, яна не можа зайсці ў ванную, не азірнуўшыся на правы кут. Яна дзеліцца гэтым асабістым болем з тымі, хто, ужо не могучы глядзець, як мучыцца родны чалавек, бяздумна блукае па цьмяным калідоры. Яна, пэўна, верыць: ад усведамлення, што балюча камусьці яшчэ, гэтаму, бяздумнаму, стане хоць на каліва лягчэй.

І пра Вялікдзень у бальнічнай палаце я напішу таксама. Пра накрыты там святочны сняданак, які не распачыналі, пакуль не скончыліся ранішнія крапельніцы, пра кволыя ўсмешкі на белых тварах, пра адчуванне вялікага шчасця, бо самы блізкі чалавек, які быў ужо за мяжой, апрытомнеў, пахрыстосаваўся з табой і нават пакаштаваў велікодны пачастунак. І ўжо тады, у тую хвіліну, прыйшло разуменне, што гэты Вялікдзень, колькі б ні мінула гадоў, будзе асаблівым у храналогіі жыцця, бо тады родны чалавек яшчэ быў побач і да яго можна было дакрануцца і пачуць яго голас...

ПРАЗ нейкі час я, напэўна, і праўда здолею сабраць гэты пазл і напішу кнігу. А хутчэй за ўсё, нічога не атрымаецца. Папераджальным чырвоным зноў успыхвае грознае «Не ўваходзіць!», пранізліва-ледзяным гарыць круглыя суткі шыльда ў канцы цёмнага калідора. А надпіс «Выхад», пафарбаваны ў колер надзеі, тут не падсвечваецца...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**




## НЕ БЫЛО Б ШЧАСЦЯ, ДЫ НЯШЧАСЦЕ ПАМАГЛО

...Канстанцінавіч, калгасны каваль, гаспадарку трымаў вялікую: толькі авечак дзясятка паўтара — на чале з Тайфунам.

Гэта, як вы разумееце, баран.

Разумных сярод іх, паводле Кандрата Крапівы, «наогул жа нямнога». Тайфун быў якраз недурны, працавіты. Кожны дзень, у прыватнасці, ён шліфаваў сваё баявое майстэрства — то на варотах, то на суседскай альтанцы, то на дубе, да якога прывязваў гаспадар... Аднак людзей — пры ўсёй сваёй ваяўнічасці — ніколі не чапаў. Наадварот, рады быў кожнаму прыходу суседскай дзяўчынкі Наташы, якая частавала яго пернікамі. Альбо другой суседкі, цёткі Сцяпанаўны (у яе, праўда, не тое што перніка, снегу зімой не выпрасіш)... Дык тая прыйдзе па ваду да кавалёвай студні, напоўніць вёдры, — баран ля з-пад зямлі... Рогі настаўляе, разганяецца і па іх... «Каб ты здох, чорт рагаты!» — крычыць тады Сцяпанаўна і зноў набірае ваду...

Вечна п'янага цялятніка Мішаню (той, было, не дапаўзаў да хаты — засынаў дзе-небудзь ля плота) Тайфун таксама не паважаў, але ж каб біць — ды божа барані! Баран яму «масаж» рабіў (то-бок з задавальненнем па ім таптаўся), мог яшчэ «гарошкам» пасыпаць.

«Бач, разбіраецца ў людзях... Не горш за розных псіхолагаў», — гаварыў пра яго каваль. І як у ваду глядзеў.

Рэч у тым, што была ў яго дарослая дачка, і да яе, вядома ж, заляцаліся кавалеры. Найболей — два: адзін — з мясцовых, са шматдзетнай сям'і, разумны, працавіты, другі — з райцэнтра, багаты, адзіны сынок у бацькоў...

Таня душой гарнулася да першага, і бацька гэты выбар падтрымліваў. А вось маці...

— Дачушка, што тая любоў, — угалас разважала яна, — калі ў хлопца за душой ні капейкі... Кутка свайго няма, прафесіі таксама няма (калі ён тую вучобу скончыць, калі зарабляць пачне?)... Ты думаеш, лёгка ўсё нажыць? За ім ты будзеш працаваць з ранку да вечара, як я за бацькам... А як за багацейшага ды за гарадскога пойдзеш, — лягчэй зажывеш, падладзішся неяк, прывыкнеш.

Таня гэтых маналогі слухала (бо матуля ж дрэннага не параіць?), але ж каб выбар зрабіць... Ну ніяк не магла — нечага ўсё не хапала.

...Хто ведае, колькі б так цягнулася, калі б не адзін выпадак. Неяк пад вечар прыехаў да яе кавалер з райцэнтра. Авечкі ў хляве ўжо былі, Тайфун гуляў па дварышчы. Заўважыў нечаканага госця, а той — яго, абодва насцярожыліся — трохі падумалі. А потым баран з хуткасцю японскай «хонды» рвануўся з месца, падскочыў да спуджанага кавалера, але не ўдарыў — проста вырваў з рук букет гваздзікоў і ўзяўся жаваць.

Хлопец тым часам стаў адступаць да брамкі, да сваіх чырвоных «жыгулёў», што стаялі на вуліцы.

Адкрыў дзверцы, сеў у машыну, але ж пакуль дрыжачай рукой заводзіў яе, Тайфун выплюнуў недаедзены букет і... пайшоў у наступ: з усёй сілы ўдарыў рагамі ў жыгулёўскае крыла, а на развітанне яшчэ і ў бампер...

Недзе праз гадзіну жаніх той прыехаў да кавалёвай хаты яшчэ раз — ужо з бацькамі, для таго, каб спагнаць грошы на рамонт кузава.

Што там за размова была — ніхто не чуў. Вядома толькі, што страты пацярпеламу кампенсаваў спачатку сам гаспадар, а потым і ягоная дачка, бо аддала кавалеру ўсе яго падарункі...

А ў хуткім часе і замуж выйшла за любага сэрцу вяскоўца. Яны добра жывуць, і калі ў Тацццяны нехта пытае пра сакрэт сямейнага шчасця, яна са смехам адказвае, што, відаць, не было б яго, тога шчасця, калі б не баран.

**Алена Несцяронак,**

*г. Докшыцы.*

## ВЕРУ ЛЮБОМУ ЗВЕРУ...

Да карабейнікаў (вулічных гандляроў) стаўленне ў нас двоякае: адны адмахваюцца, абыходзяць за вярсту, другія шчыра спачуваюць, бо нялёгкая ж праца... Напэўна, таму гэтыя работнікі са сваімі торбамі-баўламі па-ранейшаму з'яўляюцца то дома ў нас, то па месцы работы.

...У тым горадзе і нейкі час яны заходзілі не толькі на прадпрыемствы, але і ў будынак райвыканкама. Ну чаму б і не, калі работнікі яго цікавяцца рознымі навінкамі, да таго ж — людзі і нябедныя, і досыць шчодрыя...

Дык вось аднойчы (ні ахоўнікаў, ні прапускной сістэмы яшчэ не было) у вестыбюль райвыканкама заходзіць чарговы карабейнік. Тут жа, на першым паверсе, сустракае нейкага чыноўніка — прадстаўнічы такі, пры гальштуку...

— Шаноўны, а купіце жонцы сваёй падарунак, — звяртаецца да яго гандляр. (На тое, што гэты бізнес забаронены, увагі мала звярталася.)

— Ды з задавальненнем, — кажа той, — але зараз часу не маю... Вы падніміцеся на чацвёрты паверх, зайдзіце ў кабінет нумар сем. Там шмат што ў вас купяць. Скажыце: я накіраваў. А завуць мяне Мікалай Іванавіч.

— Шчыры дзякуй, — кінуў яму карабейнік і паспяшыў у бок лесвіцы. Па ёй на чацвёрты паверх са сваім нялёгкім баўлам і час ад часу адпачываючы, ён «запоўз»-такі на чацвёрты паверх, пайшоў па доўгім калідоры.

Вось ён, нарэшце, той самы сёмы кабінет. На дзвярах пад лічбай нейкая таблічка яшчэ, але ж добра стаміўшыся, чытаць яе прадпрымальнік не стаў: «нацягнуў» на твар дзяжурную ўсмешку, пераступіў парог.

Кабінет аказаўся досыць прасторны, і сядзелі ў ім пяць чалавек. Што здзівіла крыху — мужчыны. «Значыць, і сярод іх (Мікалай Іванавіч хлусіць не будзе, бо навошта яму?) сустракаюцца аматары шопінгу», — падумаў карабейнік. А таму...

— Вітаю вас, — пачаў «выступленне» ён, смела расчыніўшы дзверы. — Дазвольце прапанаваць для вашых каханых жанчын касметыку, парфумерыю, прылады для кухні... Прамаўляючы гэты даўно завучаны маналог, карабейнік стаў выцягваць з баула ўзоры сваіх тавараў, прычым кожны расхвальваў ну проста да нябёсаў!

— Мужык, а ты адрас не зблытаў? — перапыніў яго адзін з чыноўнікаў.

— Не, гэта ж кабінет нумар сем, я не памыліўся?

— Не...

— Дык якраз сюды мне параіў зайсці Мікалай Іванавіч. Ён, відаць, ваш начальнік?

— А, Мікалай Іванавіч, — твары «пакупнікоў» адразу ж пасвятлелі, — тады давайце, расказвайце пра свой тавар. Можа, мы нешта і купім.

На здзіўленне «карабейніка» ўсе слухалі яго і вельмі ўважліва, і не моўчкі, а калі ўсе дыялогі скончыліся, самы цікаўны спытаў:

— А калі мы ўвесь ваш тавар забяром, зніжка будзе?

— Вы жартуеце, — засумняваўся прадавец, — наўрад ці возьмеце ўсё.

— Ды якія там жарты? Бяром, оптам... Ці — дакладней — канфіскуем, а замест грошай дадзім вам копію вопісу.

— Не маеце права, — западозрыўшы няладнае, «карабейнік» стаў ціснуцца да дзвярэй. Але адыход яму быў адрэзаны.

— Вы ў сваёй справе, відаць, навічок, ці ўпершыню ў нашым горадзе? — удакладніў той самы цікаўны. — Інакш нелегальны тавар ніколі б не прыйшлі прадаваць падатковым інспектарам... Хоць бы шыльду на дзвярах прачыталі... Так што сядайце, будзем з вамі акт складаць.

...Шлях у вялікі бізнес пачынаўся ва ўсіх па-рознаму. Непрыемнасцяў і хапала, і хапае ў кожнага. А найбольш у тых, хто схільны многае браць на веру.

**Анатоль Палынскі,**

*г. Беразіно.*

## РУХАВІК ПАДВЁЎ

...Лён некалі нашы жанчыны рвалі рукамі, вязалі ў снапкі, састаўлялі ў кучкі для прасушкі. Потым мужчыны ды падлеткі на конях звозілі яго на ток, дзе здабывалася льняное семя: галоўкі льну «расціраліся» паміж драўляных валкоў, якія прыводзіў у рух так званы ЗіДок — серабрысты рухавічок вытворчасці завода імя Дзяржынскага.

Абслугоўваць гэтую тэхніку зусім няцяжка было: усяго і клопату, што час ад часу падліваць бензіну, падмазваць восі валкоў ды заводзіць... А далей — стой сабе ды любуйся, як завіхаюцца працаўніцы-жанчыны.

Карацей — панская работа ў Сцяпана была. Не дзіва, што ад такой яго ўсё часцей стала на подзвігі цягнуць — на любошчы.

Адну саламяную ўдаву — таксама: спеліся неяк. А каб выкраіць час на лагічны працяг адносін, Любка (звычайна перад абедзенным перапынкам) замест аднаго снапка, як быццам выпадкова, брала ў рукі... тры (маўляў, спяліся, чэрці), сунула ў валкі, тыя іх «пражаваць» не маглі — пас звальваўся, рухавік спыняўся.

**Гэта ўжо трэці фэст, удзельнікі якога збіраюцца каля сцен каралеўскага замка на «Дні Стафана Баторыя». Прадстаўнікі ваенна-гістарычных клубаў дэманстравалі старажытнае адзенне, даспехі, зброю, паядынкі і бітвы, частавалі напоем па шляхецкім рэцэпце.**

Тут можна было ўбачыць адразу некалькі эпох XVI—XVIII стагоддзяў. Напрыклад, гістарычны клуб «Газдава» з Бабруйска паказаў рэканструкцыю XVII стагоддзя. Ваенныя касцюмы тых часоў нагадваюць мушкецёраў, а гэта, між іншым, прататып старажытнага вайскоўца, чалавека не беднага саслоўя. Толькі прадстаўнік шляхецкага роду мог дазволіць сабе такі багаты касцюм. Дарэчы, і зараз ён каштаваў яго ўладальніку каля трох тысяч еўра. Кіраўнік клуба Мікалай Сілкоў паведаміў, што ў склад даспехаў уваходзіць місюрка (тып шлема з кальчугі), наручнікі, кіраса (бронекамізэлька) і гусарскі камплект адзення чырвонага колеру. Агульная вага ўсяго рыштунку — 15—20 кілаграмаў. Між тым, калі яго размеркаваць па целе, ён не здаецца такім цяжкім, кажа кіраўнік клуба. Праўда, пасля таго, як даспехі зняты, першае адчуванне, што хутка паляціш. Важным дадаткам да касцюма з'яўляецца зброя. У той час гэта былі шаблі, у сучасных гусараў яны нявострыя ў мэтах бяспекі. Сваё майстэрства ўдзельнікі клуба прадэманстравалі падчас паядынкаў.



Вайсковае падраздзяленне, якое ў XVII стагоддзі называлі «рэгімент», увасобілі на фэсце паслядоўнікі Януша Радзівіла. Гэта фігура, па словах кіраўніка клуба Фёдара Станіслаўскага, неадназначная. Адны лічаць Януша Радзівіла здраднікам, другія — прыхільнікам незалежнасці нашай дзяржавы. Клуб узяўся ліквідаваць белыя плямы гісторыі. Яны ездзяць на фестывалі па Еўропе. З задавальненнем прынялі ўдзел у Гродзенскім фэсце. Клуб «Рэгімент Януша Радзівіла» знаходзіцца ў Мінску, але вядомы і за межамі краіны. Члены клуба ўдзельнічалі ў здымках фільма «Начны дазор», рэкламных роліках, музычных кліпах, у прыватнасці з Валерыем Кіпелавым.

Трэці год запар у Гродна прыязджаюць ваенна-гістарычныя клубы з Польшчы. Штуршком для гэтага стаў бязвізавы рэжым. Кіраўнік рэканструктарскага клуба «Гусар» і арганізатар з польскага боку Барташ Седляр вельмі задаволены прыёмам і дапамогай Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, на тэрыторыі якога і быў разбіты старажытны ваенны лагер. Тут былі шацёр, вогнішча з кацялком, нават драўляныя сталы з драўляным посудам. Мушкецёры бавілі час за фехтаваннем, вялі гутарку са сталом, а іх дамы сэрца маглі пачаставаць напоем па шляхецкім рэцэпце.

— У нас шмат рыцарскіх фармацый, — кажа Барташ Седляр, — і ў кожнай — свае касцюмы, бо ў той час не было спецыяльнай ваеннай формы, вяявалі ў сваіх даспехах. У пяхоты пераважаў блакітны колер, рыцары на канях аддавалі перавагу чырвонаму альбо барвоваму адзенню. Толькі шляхта магла насіць уласную зброю, звычайна гэта былі шаблі. Кожны рыцар насіў шапку з мехам і накідку са скуры драпежнага звера.

У Барташа, напрыклад, з плеч звісала вялікая воўчая скура. Усе галаўныя ўборы ўдзельнікаў клуба былі аздоблены пёрамі. Пры кожным гусары — зброя. Дарэчы, арганізацыю па перавозцы гэтых атрыбутаў праз мяжу ўзяў на сябе Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей.

— Зброя, хоць і касцюмная, згодна з заканадаўствам, з'яўляецца зброяй і патрабуе асаблівага рэжыму захавання. Такі рэжым мы забяспечваем. Здабылі дазвол, захоўваем шаблі ў сваім сховішчы для зброі — такія правілы, — паведаміў дырэктар музея Юрый Кітурка.

Невыпадкова фэст прысвяцілі Стафану Баторыю. Кароль польскі і вялікі князь літоўскі жыў на дзве сталіцы — Кракаў і Гродна. Але пасля ваенных паходаў часцей вяртаўся ў Гродна, дзе арганізаваў перабудову Старога замка Вітаўта ў сваю рэзідэнцыю. Тут прайшлі яго апошнія дні, тут ён і быў пахаваны, але праз некаторы час перавезены ў Кракаў, дзе знаходзіцца склеп каралеўскіх асоб. А гродзенскі замак з тых часоў амаль поўнасцю згубіў сваю велічнасць. І нарэшце ў мінулым годзе тут пачалося яго аднаўленне.

— Зараз у замку вядуцца рэстаўрацыйныя работы, ён набудзе выгляд часоў Стафана Баторыя, — паведаміў Юрый Кітурка. — Гэта быў час архітэктурнага росквіту Старога замка. Усе наступныя перабудовы датычыліся звычайнага рамонту пасля разбурэнняў у ходзе ваенных дзеянняў у XVII—XVIII стагоддзях.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.28 | 20.46 | 15.18 |
| Віцебск — | 5.13 | 20.41 | 15.28 |
| Магілёў — | 5.18 | 20.36 | 15.18 |
| Гомель — | 5.20 | 20.27 | 15.07 |
| Гродна — | 5.44 | 21.00 | 15.16 |
| Брэст — | 5.50 | 20.55 | 15.05 |

## Месяц

*Поўня 30 красавіка. Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

*Пр. Аляксея, Дзяніса, Ісака, Кандрата, Мікалая, Фёдара.*

*К. Антаніны, Монікі, Міхала, Палікарпа, Роберта, Рыгора.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




# УСМІХНЕМСЯ

— Чаму на галоўную ролю ў фільме «Тытанік» абралі Дзі Капрыа?

— Таму што, калі б на яго месцы былі Брус Уіліс, Він Дызель або Стывен Сігал або, таго горш, сюжэт бы не заладзіўся, і патануў бы айсберг.

**Людаеды не любяць бодзібілдараў, лічаць, што іх гармонамі і антыбіётыкамі ўсялякімі колюць.**

Муж прыходзіць дадому і бачыць за фіранкай босыя ногі.

— Гэта што такое?

— А ты думаеш, што ўсе мае ўпрыгажэнні, футра, машына, кватэра — гэта на тваю зарплату?

— Я пытаюся, што гэта такое?

— А як ты думаеш, чаму ты атрымаў такую высокую пасаду?

— Я апошні раз пытаюся, чаму карміцель басанож стаіць?!



caricatura.ru

# Даты | Падзеі | Людзі

**4 МАЯ**

### У краіне

**1527** год — дзень нараджэння Канстанціна Астрожскага, палітычнага і культурнага дзеяча Беларусі, Украіны, ВКЛ. Меў значны ўплыў у Вялікім Княстве. Выступаў супраць распаўсюджвання каталіцтва ў Беларусі і ва Украіне, падтрымліваў праваслаўныя брацтвы, заснаваў школы ў Слуцку, Тураве, Уладзіміры-Валынскім, у Астрогу — школу і друкарню, у якой працаваў рускі друкар Іван Фёдараў. Удзельнічаў у задушэнні сялянска-казацкіх паўстанняў пад кіраўніцтвам К. Касінскага і С. Налівайкі. Памёр у 1608 годзе.

**1819** год — нарадзіўся (г. Мінск) Фларыян Станіслаў Міладоўскі, кампазітар, піяніст, педагог. Вучыўся ў Мінску, Берліне, Вене. У 1829 годзе даў у Вільні першы адкрыты канцэрт, у пачатку 1830-х часта выступаў у Мінску і Слуцку. У 1855—1862 гадах жыў у сваім маёнтку Мацкі на Міншчыне. З 1862 года — у Францыі. Сябраваў з Ф. Лістам і Ф. Мендэльсонам. Аўтар аперэт, санат, песень, мазурак, паланэзаў, накцюрнаў і інш. Памёр у 1889 годзе.

**1883** год — нарадзіўся (Мінская губерня) Мікалай Уладзіміравіч Салагуб, удзельнік Грамадзянскай вайны ў Беларусі, камдыў. З 1910 года — у штабах Віленскай ваеннай акругі, 1-й арміі. Удзельнік Першай сусветнай вайны. З 1918 года — у Чырвонай Арміі, начальнік штаба Усходняга фронту, начальнік аператыўнага ўпраўлення штаба Заходняга фронту. Са жніўня 1919 года камандаваў 16-й арміяй, падчас савецка-польскай вайны 1920 года 16-я армія пад камандаваннем Салагуба паспяхова фарсіравала Бярэзіну, праравушы абарону палякаў, нанесла ім паражэнне. Пасля гэтых падзей быў прызначаны на пасаду начальніка штаба Заходняга фронту. Рэпрэсаваны ў 1937 годзе.



### У свеце

**1878** год — амерыканскі вынаходнік Томас Эдысан упершыню прадэманстраваў у будынку опернага тэатра вынайдзены ім фанограф. Так пачалася эра гуказапісу.

**1918** год — Саўнаркам прыняў Дэкрэт аб рэвалюцыйных трыбуналах.

**1982** год — удзельнікі першай савецкай гімалайскай экспедыцыі У. С. Балыбердзін і Э. В. Мыслоўскі здзейснілі ўнікальнае ў гісторыі сусветнага альпінізму ўзыходжанне на найвышэйшую вяршыню свету — гару Эверэст і ўстанавілі там Дзяржаўны сцяг СССР.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, нясуць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1702.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 мая 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
4 мая 2018 г. № 18 (451)



стар. 2

**Ці стане нерухомасць... магнітам?**



стар. 14

**Феномен па-слаўгарадску**



стар. 15

**Для аматараў скваркі... і не толькі**

ТЭМА ТЫДНЯ

# РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Свята-Петра-Паўлаўскі храм-помнік у в. Лясная Слаўгарадскага раёна.

**НА ДЭПУТАТАЎ мясцовых Саветаў сёння ўскладаюцца вялікія спадзяванні, неабходна, каб іх роля і значнасць у грамадстве адчувальна павысіліся і ўзмацніліся. Яны павінны быць бясспрэчнымі лідарамі і аўтарытэтамі. З такім пасылам звярнуўся да народных абраннікаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ падчас выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Слаўгарадзе.**

Тэмай размовы стала павышэнне ролі органаў мясцовага самакіравання ў рашэнні актуальных пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця. У Слаўгарад былі запрошаны старшыні гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Удзел у пасяджэнні прынялі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр Папкоў і старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна Кананчук. Разам з дэпутатамі парламента ў Слаўгарад прыехалі прадстаўнікі міністэрстваў, іншых рэспубліканскіх органаў. Аналагічныя пасяджэнні ў будучыні пройдуць для дэпутатаў Мінскай і Віцебскай абласцей, а потым — Гродзенскай і Брэсцкай.

стар. 4

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

# ВАДА ПАВІННА БЫЦЬ СМАЧНАЯ

**Якую ваду спажываюць у Мінскай вобласці і ці можна яе ўжываць з-пад крана і з вясковых калодзежаў?**

— Інфармацыю па якасці вады ў Мінскай вобласці мы пастаянна аналізуем, таму маем уяўленне пра тое, якая яна ў цэнтральным рэгіёне, і пра тыя праблемы, што існуюць. Мы іх бачым як па выніках праверак, так і праз лабараторны кантроль, які дазваляе выявіць слабыя месцы ў пытаннях водазабеспячэння насельніцтва, — расказвае **загадчыца аддзелам гігіены Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына МІЛАНОВІЧ.** — Каб сітуацыя была больш зразумелая, дадам, што ёсць цэнтралізаванае забеспячэнне вадой — камунальнае, якое эксплуатуюць службы ЖКГ, і ведамаснае. Праўда, апошнім часам назіраецца тэндэнцыя да змяншэння долі ведамаснага, паколькі сельскія сеткі паступова перадаюцца ў камунальную ўласнасць. Водазабеспячэнне, асабліва ў сельскай мясцовасці, прадстаўлена таксама нецэнтралізаванымі крыніцамі (калодзежы: грамадскія і індывідуальныя).

Генеральная асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый на міжнародным узроўні абвясціла 2005—2015 гады дзесяцігоддзем бяспечнай вады. І наша краіна на працягу гэтага перыяду паэтапна рэалізоўвала Дзяржпраграму «Чыстая вада», якая знайшла свой працяг у Дзяржпраграме «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады» — з распрацоўкай комплексу мерапрыемстваў па паляпшэнні сетак водазабеспячэння, замене няспраўных, будаўніцтве новых, уладкаванні станцый абезжалезвання і водазабораў з улікам ваданосных гарызонтаў. Акрамя гэтага, зараз Беларусь удзельнічае ў такой праграме, як рэалізацыя Мэт устойлівага развіцця, адна з якіх — забеспячэнне якаснай вадой.



— Вада, як і любы прадукт, можа быць менш або больш смачнай. Вада з падземных крыніц адрозніваецца прыемнымі смакавымі якасцямі і мікрабіялагічнай чысцінёй. Між тым гідралагічная асаблівасць беларускай вады — павышанае ўтрыманне жалеза ў свідравінах. Але за час рэалізацыі праграмы «Чыстая вада» ў Мінскай вобласці скарацілася ўдзельная вага нестандартных проб па колькасці жалеза з цэнтралізаваных сетак. Па выніках мінулага года яна склала 15,7 % супраць 28,7 % у 2005 годзе (і гэта пры тым, што ў прыродных крыніцах удзельная вага засталася на ўзроўні плюс-мінус 40 %). Паўплываць на якасць прыроднай вады, якая праходзіць усе воданапорныя слаі і прыносіць з сабой хімічныя элементы, што ўтрымліваюцца ў горнай пародзе, немагчыма. Перавышэнне па прыродным жалезе рознае ў розных рэгіёнах Міншчыны. Напрыклад, у Капыльскім, Любанскім, Пухавіцкім, Бярэзінскім раёнах удзельная вага нестандартных проб перавышае сярэдні абласны паказчык. У некаторых выпадках, калі прыроднае перавышэнне значнае і ў пэўны момант нельга карэнным чынам паўплываць на сітуацыю, райвыканкамы прымаюць часовыя нарматывы — не больш за адзінку. Гэта дапускаецца заканадаўствам.

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

# Навука як элемент супрацоўніцтва

### *Удзельнікі алімпіяды завіталі ў верхнюю палату*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ сустрэўся з удзельнікамі і арганізатарамі 52-й Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіяды, якая праходзіла сёлета ў Мінску.**

Сустрэча беларускага сенатара з прадстаўнікамі буйнога навуковага спаборніцтва па хіміі не выпадковая. Сяргей Рахманаў узначальвае Беларускае хімічнае таварыства, з'яўляецца дактарам хімічных навук, прафесарам і членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. «Алімпіяда аб'ядноўвае краіны і народы не пад палітычнымі лозунгамі, а пад навуковымі і адукацыйнымі, — сказаў вучоны і парламентарый. — Мерапрыемства мае вялікі аб'яднальны эфект. Бо ў сённяшніх няпростых умовах паміж рознымі дзяржавамі складаныя ўзаемаадносіны, шмат рознагалоссяў, калі не сказаць больш. А гэта пляцоўка не мае падаплёкі для канфрантацыі, тут поўнае разуменне ў мэтах навуковага і адукацыйнага развіцця».

У зацікаўленым абмене думкамі з нагоды развіцця школьных алімпіяд у кантэксце міжнароднага супрацоўніцтва таксама ўдзельнічалі прадстаўнікі дыпламатычных місій.

# Увага — моладзі

### *Ліцэісты і юныя грамадскія дзеячы пазнаёміліся з работай парламента*

**Яшчэ некалькі сустрэч з моладдзю адбылося цягам тыдня ў Савеце Рэспублікі. У мінулую сераду старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА сустрэлася з вучнямі Рэчыцкага раённага ліцэя, а ў пятніцу — з маладымі лідарамі грамадскага аб'яднання «Белая Русь».**



Для маладых людзей былі арганізаваныя экскурсіі па будынку верхняй палаты беларускага парламента. Сенатар расказала пра кампетэнцыі Савета Рэспублікі і яго дзейнасць, пра міжпарламенцкае супрацоўніцтва і рэалізацыю прыярытэтных кірункаў маладзёжнай палітыкі. Ірына Старавойтава падкрэсліла важнасць прыцягнення моладзі да парламенцкай дзейнасці, што стане рэальным пасля стварэння рэспубліканскага маладзёжнага парламента, ідэя якога ўхвалена кіраўніцтвам краіны. У канцы абедзвюх сустрэч сенатар адказала на пытанні юных гасцей Савета Рэспублікі.

# Праблемы надзённыя

### *Сенатар ад Магілёўскай вобласці наведаў свае рэгіёны*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ узяў удзел у пасяджэнні Краснапольскага раённага выканаўчага камітэта, на якім былі разгледжаны пытанні развіцця раёна, працэс фінансавага аздараўлення акцыянернага таварыства «Краснапольскі» і выкананне працоўнага заканадаўства на мясцовых прадпрыемствах.**



Пасля пасяджэння парламентарый правёў сустрэчу з жыхарамі раёна і прамую тэлефонную лінію. Людзі агучылі пытанні ў сферах будаўніцтва жылля, рамонту дарог, павышэння заробкаў і пенсій. У аграгарадках Леніна і Тур'я сенатар даследаваў праблемы, выкладзеныя ў калектыўных зваротах. Уладзімір Панцюхоў на асабістым прыёме і падчас тэлефонных размоў таксама выслухаў жыхароў Чэрыкаўскага і Чавускага раёнаў. Гучалі скаргі на работу камунальных службаў, просьбы аб падтрымцы работы Чэрыкаўскага савета ветэранаў і аб дапамозе ў атрыманні крэдыту. Член Савета Рэспублікі наведаў Вепрынскі сельсавет, дзе пазнаёміўся з умовамі для прыцягнення прамых замежных інвестыцый у будаўніцтва фотаэлектрычнай станцыі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

ДЭПУТАТЫ, НА ВЫЕЗД!

# НЕРУХОМАСЦЬ МОЖА СТАЦЬ... МАГНІТАМ

**КАЛІ мясцовая ўлада будзе актыўней працаваць для таго, каб выкарыстоўваліся не запатрабаваныя сёння будынкі, канкрэтны раён атрымае некалькі выгод. Па-першае, нерухомасць «пачне рухацца». Па-другое, там створаць вытворчасць, краму або будуць аказваць паслугі, прымаць турыстаў — адпаведна мясцовыя жыхары атрымаюць работу. А яшчэ — падаткі ў бюджэт, удзел бізнесу ў добраўпарадкаванні і іншае. Нерухомасць, якая не выкарыстоўваецца, калі задумацца, можа стаць «магнітам», які прыцягне шмат чаго карыснага.**



На тэрыторыі прадпрыемства «Пастаўскі мэблевы цэнтр».

## Беспрацоўнымі была чвэрць...

У самым заходнім раёне Віцебшчыны — Пастаўскім падчас выязнога пасяджэння прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў абмяркоўвалі тэму, актуальную для краіны. Выпрацоўвалі алгарытм таго, як найбольш эфектыўна выкарыстоўваць дзяржаўную маёмасць. Гаварылі пра работу з інвестарамі — каб тыя ўклалі грошы менавіта ў канкрэтны аб'ект, рэгіён, а не сышлі ў іншае месца. Напрыклад, у суседнюю Расію.

Пастаўскі раён, дарэчы, стаў месцам правядзення пасяджэння не выпадкова.

— За 20 гадоў тут напрацавана сур'ёзная практыка па ўцягванні ў абарот маёмасці, якая неэфектыўна выкарыстоўваецца, прыцягненні інвестараў. Пастаўшчына дынамічна развіваецца, і гэтаму дапамагае шчыльнае супрацоўніцтва з бізнесам, — сказаў **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.**

Пасля развалу СССР з-за расфарміравання воінскіх часцей шмат людзей у рэгіёне засталіся без работы.

— Узровень беспрацоўя дасягаў больш за 25 %! І людзі ў самым росквіце сіл не ведалі, чым заняцца, — канстатаваў **старшыня раённага выканаўчага камітэта Сяргей ЧЭПІК.**

Сёння сітуацыя ў раёне кардынальна змянілася. Узровень беспрацоўя — не больш за дапушчальны ў краіне.

А вось з нерухомасцю, якая не выкарыстоўваецца, ёсць нюансы, бо ў раёне некалькі былых ваенных гарадкоў. І аб'екты тыя, кажучы афіцыйнай мовай, «уцягнуць у гаспадарчы абарот» праблематычна. Але і гэта атрымліваецца.

## Жыць у... самалёце

У прыватнасці, дэпутатам паказалі, як былы ваенны гарадок выкарыстоўваецца ў мірных мэтах.

**Заснавальнік прыватнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Пастаўскі мэблевы цэнтр» Анатоль БАБІЧАЎ** — былы ваенны. Ён пачынаў сваю справу з вырабу дзвярэй у гаражы. Цяпер ён — у спісе самых уплывовых прадпрымальнікаў Віцебшчыны. На прадпрыемстве вырабляюць дзверы, паркет, пелеты і гэтак далей. Фірма ўвайшла ў спіс самых вядомых у СНД у сваім сегменце. Сёння да 90 % прадукцыі экспартуецца ў Канаду, Вялікабрытанію, краіны ЕС, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты і гэтак далей.

Як пажартавалі ўдзельнікі пасяджэння, спадар Бабічаў «жыве ў самалёце», бо пастаянна лётае за мяжу па бізнес-справах. Калі пачаліся праблемы з рэалізацыяй прадукцыі ў Расіі, знайшоў новыя рынкі збыту.

Сёння на прадпрыемстве працуюць каля 700 чалавек. Падчас экскурсіі народным выбраннікам паказалі не толькі вытворчасць, але і месцы адпачынку для работнікаў прадпрыемства. Напрыклад, ёсць спа-салон, манікюрны кабінет, саўна, зала для шэйпінгу.

Цікава, што пры прадпрыемстве была футбольная каманда першай лігі. Потым замест яе адкрылі адзіную ў Беларусі прыватную дзіцяча-юнацкую футбольную акадэмію (дзейнічала з 2007-га да 2014 года). Конкурс пры паступленні быў вышэйшы, чым у самых прэстыжных ВНУ. У клубе займаліся юныя футбольныя таленты з розных рэгіёнаў краіны. Іншагароднія жылі ў інтэрнаце бясплатна, забяспечваліся харчаваннем. У мясцовай школе нават стварылі клас, дзе вучнямі былі юныя футбалісты (дарэчы, вучыліся вельмі добра). Самыя адораныя «футбольнай акадэміі» папоўнілі рады гульцоў вядомых беларускіх і замежных клубаў, напрыклад, «БАТЭ».

## Малдаўскі інтарэс

Сярод будучых кірункаў вытворчасці на Пастаўшчыне — выраб мясной прадукцыі. Гэта інвестыцыйны праект малдаўскага бізнесу. ТАА «Пастаўскі мясакамбінат» зарэгістравалі за месяц, для вытворчасці выдзелілі будынкі, якія не выкарыстоўваліся.

Хутка новае прадпрыемства пачне працаваць. У тое, каб гэта адбылося, укладзена больш за 700 тысяч еўра. (Агульная ж сума інвестыцый заяўлена на ўзроўні 2 млн.)

Як адзначыла **намеснік старшыні Пастаўскага райвыканкама Ірына НЕСЦЯРОНАК,** сёлета плануецца рэалізаваць яшчэ некалькі інвестыцыйных праектаў. Напрыклад, па стварэнні вытворчасці мэблевых шчытоў на базе Варапаеўскага завода жалезабетонных вырабаў. Плануецца наладзіць вытворчасць спірту і бутыляванай пітной вады ў гарадскім пасёлку Лынтупы. Дарэчы, у Лынтупах замежны інвестар укладвае немалыя грошы ў адраджэнне былога палаца пана Бішэўскага, набытага за базавую велічыню. У сядзібна-паркавым комплексе будуць прымаць турыстаў. Работу атрымаюць не менш за 25 чалавек.

Усяго ў Пастаўскім раёне сёлета прыцягнута інвестыцый (у асноўны капітал) у 14 разоў больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Рэалізацыя інвестыцыйных праектаў — гэта паступленне падаткаў у бюджэт, новыя працоўныя месцы, паляпшэнне якасці жыцця жыхароў глыбінкі. У райвыканкаме і райсавеце гэта разумеюць добра. Таму і вырашаюць за інвестара праблемы, якія могуць узнікнуць: пачынаючы ад рэгістрацыі суб'екта прадпрымальніцтва і да афармлення дакументацыі на зямлю, нерухомасць і іншае.

Старшыня аблсавета падкрэсліў, што так трэба працаваць усюды.

## Шчыра пра набалелае

**Дырэктар Віцебскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці Віктар ЗАЙЦАЎ** канстатаваў, што ў першым квартале ў вобласці ўцягнута ў абарот 28 аб'ектаў, або 9 % ад запланаванага.

— Нягледзячы на даручэнне аблвыканкама па прадстаўленні ў фонд да 1 красавіка дакументаў для правядзення аўкцыёнаў па аб'ектах, запланаваных для адчужэння, не прыняты рашэнні больш чым па 40 аб'ектах з 189 запланаваных. Гэта — вынік нізкай выканальніцкай дысцыпліны на месцах, нездавальняючага вядзення бухгалтарскага ўліку. Такі падыход сведчыць аб фармалізме пры правядзенні штогадовых інвентарызацый, — адзначыў Віктар Зайцаў.

Турбуе і запазычанасць арандатараў. У фондзе лічаць, што юрыдычныя службы прадпрыемстваў і арганізацый работу па спагнанні пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці вядуць павярхоўна, дзеля «галачкі».

Старшыня аблсавета заклікаў прадстаўнікоў мясцовай улады шчыльна заняцца гэтым пытаннем.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Падчас пасяджэння быў агучаны цікавы вопыт. Пад эгідай Віцебскага гарвыканкама функцыянуе «Цэнтр нерухомасці г. Віцебска». Прадпрыемства здае ў арэнду і прадае нерухомасць. Паводле слоў **старшыні гарадскога Савета дэпутатаў Уладзіміра БЯЛЕВІЧА,** калектыў прадпрыемства зацікаўлены ў добрым выніку, бо ўзровень зарплаты залежыць ад колькасці аб'ектаў, якія сталі запатрабаванымі.

Такі падыход у прасоўванні нерухомасці будзе вывучаны, каб стварыць нешта аналагічнае ў буйных гарадах вобласці: Оршы, Полацку і Наваполацку.

ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЙШОЎ!

# НОВЫЯ ПЛАНЫ НА МЕСЦАХ

**У Гродзенскай вобласці пасля апошніх выбараў часткова памяняўся склад кіраўнікоў раённых Саветаў дэпутатаў. «МС» пацікавілася, на якія пытанні маюць намер звярнуць першачарговую ўвагу новыя старшыні райсаветаў, з чаго пачынаюць сваю работу?**

## КАЛЕКТЫЎНЫ ПАДЫХОД

**Алена ГАНЕВІЧ, старшыня Воранаўскага раённага Савета дэпутатаў:**

— 2018-ы — Год малой радзімы, таму мы плануем навесці парадак на зямлі. Асаблівай увагі патрабуюць населеныя пункты, дзе шмат пустуючых дамоў, хутары, дзе даўно ніхто не жыве. Добры старт гэтай справе дадзены рэспубліканскім суботнікам — гэта той самы штуршок, які актывізаваў у тым ліку і дэпутатаў. На месцах старшыні сельскіх Саветаў пачалі гэту работу па сваіх новых планах, і яна будзе працягнута.

Галоўнае — каб усе пытанні, якія ставяць перад намі жыхары населеных пунктаў, вырашаліся. Для гэтага неабходна падключаць мясцовую ўладу. Згодна з аналізам зваротаў, многіх хвалюе стан мясцовых дарог. Да гэтай праблемы падключаюцца дарожныя службы, будзем пераглядаць бюджэт раёна і вышукваць сродкі на рамонт дарог, думаю, работа будзе ісці.

Для сябе мы вызначылі, што дэпутаты ўсіх узроўняў павінны працаваць у адзінай звязцы. Для гэтага будзем раз у квартал збірацца і фарміраваць агульны план дзеянняў. Такі калектыўны падыход да праблемы дасць большы эфект. Наш корпус аднавіўся напалову, прыйшлі прадстаўнікі розных службаў, кіраўнікі прадпрыемстваў. Чакаем ініцыятыў ад новых дэпутатаў.

## СТВАРЫЦЬ ДЭПУТАЦКІ КЛАСТАР

**Валянцін СЕМЯНЯКА, старшыня Зэльвенскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Выбарчая кампанія ў нас прайшла актыўна, людзі ішлі на сустрэчы з дэпутатамі, выказвалі свае пажаданні. З гэтага ў значнай ступені фарміруецца і кірунак дзейнасці. Таму наша задача — актывізаваць дэпутацкі корпус усіх узроўняў на вырашэнне пастаўленых пытанняў. Пры гэтым нашы жыхары ведаюць, над чым працуюць іх абраннікі, мы пастаянна інфармуем іх аб гэтым.

Важным момантам, лічу, стане стварэнне дэпутацкага кластара. Гэта значыць, што дэпутаты ўсіх узроўняў, у тым ліку Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, вядуць сумесны прыём, а затым разам вырашаюць праблемы насельніцтва.

Другі важны кірунак дзейнасці — сумесная з жыхарамі работа па навядзенні парадку. Гэта і могілкі, і пусткі, і агароджы. Такая работа пастаянна вядзецца, і людзі ідуць насустрач, падключаюцца пенсіянеры. Стараемся далучыць да работы і беспрацоўных. Многія жыхары занепакоены станам пустуючых дамоў і патрабуюць вырашыць гэта пытанне. Наогул, мы імкнёмся падтрымаць мясцовыя ініцыятывы, асабліва тых, хто хоча заняцца якой-небудзь справай — аграсядзібай альбо аказаннем паслуг. У маі чакаем прадстаўніка ўрада, які правядзе ў нашым раёне трэнінг па эканоміцы і прававых пытаннях. Накіроўваем увагу на занятасць людзей.

## ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

**Алег ТАРГОНСКІ, старшыня Слонімскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Думаю, што сэнс нашай работы застаецца заўсёды адзіны — вырашаць праблемы людзей. Дайсці да кожнага праз работу дэпутацкага корпуса. І вырашаць разам задачы, якія перад намі ставіць жыццё. А гэта і добраўпарадкаванне тэрыторый, і іншых аб'ектаў. Дэпутаты не будуць убаку ад праблемы працаўладкавання, занятасці насельніцтва. Вядзём работу, каб моладзь заставалася на сяле, бо гэта наш рэзерв.

## СТАЎКА НА БРЭНДЫ

**Ганна ХВЯДЗЮК, старшыня Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Думаю, што дэпутацкі корпус прадоўжыць усе тыя найлепшыя традыцыі, якія закладзены дэпутатамі папярэдніх скліканняў. Наш корпус аднавіўся напалову, таму ёсць у каго і вопыт пераняць, ёсць каму і новыя ідэі прапанаваць. Вядома ж, усе намаганні і мяне, як старшыні райсавета, і ўсіх маіх калег, будуць накіраваны на тых, каму патрэбна дапамога. У полі зроку і праблемы навядзення парадку на зямлі, удзел у праектнай дзейнасці, пошук новых цікавых формаў работы — гэта тыя тэмы, якія ў нас заўсёды будуць на парадку дня. У нас ёсць вопыт такіх цікавых брэндавых праектаў у асобных сельсаветах. Таму думаю, што мы разам будзем развіваць гэты кірунак, бо ён дае магчымасць атрымаць дадатковыя сродкі, якія можна ўкласці ў развіццё тэрыторый. Можа, і не ўсё ўдаецца, але пэўны этап пройдзены. А гэта яшчэ і турыстычная прывабнасць раёна.

Шчучын не стаіць на месцы. Асабліва пад'ём відавочны ў апошнія гады, прыцягнута нямала інвестпраектаў, дзякуючы чаму папаўняецца бюджэт. Для дэпутатаў гэта таксама вельмі важна, бо яны займаюцца размеркаваннем сродкаў і могуць накіраваць фінансы на тыя праблемы, якія трэба своечасова вырашаць. Гэта значыць, што дэпутаты з выканаўчай уладай крочаць у адным напрамку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ВАДА ПАВІННА БЫЦЬ СМАЧНАЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Вада з перавышэннем жалеза ніякага адмоўнага ўплыву на здароўе чалавека не аказвае. Ніхто не захварэе. Але мы адчуваем непрыемны смак, не можам нармальна памыць пасцельную бялізну, сляды застаюцца і на посудзе,— канстатуе спецыяліст.

> У Капыльскім, Любанскім, Пухавіцкім, Бярэзінскім раёнах удзельная вага нестандартных проб перавышае сярэдні абласны паказчык.

Па словах Ірыны Мілановіч, у цэнтралізаваным водазабеспячэнні ўлічваецца і такі аспект, як мікрабіялагічная бяспека. За дзесяць апошніх гадоў стан яе значна палепшыўся. Адпаведныя паказчыкі не перавышаюць норму, паколькі больш надзейнымі сталі сеткі водазабеспячэння.

У сельскай мясцовасці ў калодзежах з утрыманнем жалеза ўсё нармальна. Праблема ў іншым — у нітратах, якія не вызначыш на смак. У Мінскай вобласці па стане на 1 студзеня было 4327 шахтных калодзежаў. Гэта тыя, што паддаюцца ўліку, стаяць на балансе арганізацый сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі або сельвыканкамаў. Пра тыя, якія насельніцтва абсталёўвае самастойна, спецыялісты могуць і не ведаць. У гэтыя крыніцы вада паступае з паверхневых слаёў. Таму тут большая рызыка пранікнення як хімічных рэчываў, так і мікробнага забруджвання. Але рызыку можна зменшыць, калі правільна абсталяваць і эксплуатаваць калодзеж. Па перыметры, акрамя кольцаў, павінен быць гліняны замок, бо гліна маруднa прапускае ваду з паверхні. Важна належным чынам уладкаваць наземную частку — накрыўкай або навесам.

— Многае залежыць і ад таго, як гаспадар размесціць калодзеж і прыбіральню. Пажадана, каб калодзеж быў аддалены ад крыніц магчымага мікробнага і хімічнага забруджвання — выграбных, кампоставых ям, гаспадарчых пабудоў, дзе ўтрымліваецца жывёла. Штогод неабходна абавязкова праводзіць чыстку, дэзынфекцыю такога аб'екта водазабеспячэння. На дне мяняць пясок, гравій, якія забяспечваюць фільтрацыю вады. Ну і канешне, трэба будаваць калодзеж па праекце, — раіць Ірына Уладзіміраўна.



Варта помніць, што мікробнае забруджванне можна ліквідаваць самім. А вось высокую канцэнтрацыю нітратаў даступнымі сродкамі не паменшыць. У першую чаргу гэтыя рэчывы небяспечныя для малых. Калі браць такую ваду з калодзежа для прыгатавання малочнай сумесі, то ў дзяцей можа здарыцца кіслароднае галаданне. Вадой з калодзежа з павышанай колькасцю нітратаў можна мыцца, паліваць градкі, выкарыстоўваць у іншых гаспадарчых мэтах. А вось каб піць і прыгатаваць ежу, лепш купляць ваду ў бутэльках.

> Пажадана, каб калодзеж быў аддалены ад крыніц магчымага мікробнага і хімічнага забруджвання — выграбных, кампоставых ям, гаспадарчых пабудоў, дзе ўтрымліваецца жывёла.

Як папярэджваюць спецыялісты, перш чым ужываць ваду з калодзежа, варта падстрахавацца — прынесці і праверыць яе ў лабараторыі тэрытарыяльных цэнтраў гігіены і эпідэміялогіі па месцы жыхарства.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

РАЗАМ

# Буфер для шкоднікаў

## Праблему ўсыхання лясоў абмеркавалі ў Гомелі

**Міжнародны семінар «Абарона хваёвых насаджэнняў ад шкоднікаў і хвароб лесу» адбыўся ў Гомелі. На працягу трох дзён навукоўцы і лесаводы з Беларусі, ЗША, Германіі, Італіі, Венгрыі, Расіі і Украіны абмяркоўвалі праблему ўсыхання хваёвых насаджэнняў, спосабы выяўлення ачагоў распаўсюджвання насякомых-шкоднікаў, а таксама меры барацьбы з імі. Арганізатарамі форуму выступілі Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН (ФАО) і Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.**

Мерапрыемствы такога ўзроўню ў нашай краіне адбыліся ўпершыню. Нагодай для гэтага паслужыла масавае ўсыханне хваёвых насаджэнняў па ўсім свеце.

— Гэтая праблема паўстала не сёння, не ўчора. Яшчэ ў 2015 годзе з прычыны засушлівага лета, недахопу вільгаці мы пачалі фіксаваць успышкі распаўсюджвання вяршыннага карaеда. У 2016 годзе правялі першы аб'ём санітарна-аздараўленчых мерапрыемстваў — на поўдні Гомельскай вобласці. У 2017 годзе ўспышкі пачалі набываць больш масавы характар. І, на жаль, сёння няма спосабаў ранняга выяўлення ачагоў шкоднікаў, іх дыягнастыкі, — сказаў **першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр КУЛІК.**

Яго пазіцыю падтрымала і **спадарыня Шырома САЦІЯПАЛА. Эксперт па лясной гаспадарцы ФАО** прыляцела ў Беларусь ужо другі раз, і дала высокую ацэнку рабоце беларускіх лесаводаў.

— Праблема распаўсюджвання караеда актуальная не толькі для Еўропы, але і для ўсяго свету. Мы былі ў Беларусі ў лістападзе і засталіся вельмі ўражаныя той работай, якую вы праводзіце ў сябе на месцах. Зараз наша праца скіраваная на тое, каб даць Беларусі найлепшыя практыкі па распрацоўцы метадаў не толькі прадказання або ранняга выяўлення, але і маніторынгу. Гэта тое, чым зараз займаецца ФАО, — падкрэсліла эксперт.

Шырома Саціяпала таксама дадала, што кожны год ад розных хвароб і шкоднікаў у свеце церпіць каля 35 мільёнаў гектараў лесу, з іх палова — з-за жукакараеда. Успышкі ўсыхання назіраюцца ў розных краінах, праблема набыла глабальны маштаб, аднак найбольш моцна пакутуюць Беларусь, Украіна і Польшча.

Дарэчы, сваім вопытам барацьбы са шкоднікамі і хваробамі лесу падчас форуму змаглі падзяліцца прадстаўнікі розных краін. У прыватнасці, быў прэзентаваны вопыт Італіі, Баварыі, краін Цэнтральнай Амерыкі і ЗША. Інфармацыяй аб распаўсюджванні караеда падзяліліся і нашы суседзі — эксперты з Расіі і Украіны.

У выніку спецыялісты сышліся ў меркаванні, што сёння адзіным надзейным спосабам барацьбы з масавым распаўсюджваннем шкоднікаў можа з'яўляцца толькі своечасовае правядзенне санітарна-аздараўленчых мерапрыемстваў. Гэтага прынцыпу прытрымліваюцца як у еўрапейскіх краінах, так і ў ЗША, дзе таксама назіраюцца значныя ачагі ўсыхання. Амерыканскія лесаводы прытрымліваюцца таксама прынцыпу стварэння так званых «буферных зон», якія, па назіраннях спецыялістаў, у далейшым дапамагаюць выратаваць значную частку лясного фонду.

Чакаецца, што практыка правядзення падобных форумаў будзе падоўжана. Як і разгляд пытання аб выдзяленні нашай краіне міжнароднай тэхнічнай дапамогі, паведамляе прэс-служба Мінлясгаса.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ



Ускладанне кветак да мемарыяла каля алеі пахаваных вёсак Слаўгарадскага раёна, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы.

## Без фармалізму

Спікер верхняй палаты парламента адразу ж заклікаў дэпутатаў да канструктыўнага дыялогу, максімальнай шчырасці і адкрытасці.

— Нам важна ведаць, што неабходна зрабіць дадаткова на ўзроўні рэспублікі або вобласці для таго, каб падняць эканоміку раёнаў на належны ўзровень, — адразу ж абазначыў ён арыенціры. — Хацелася б пачуць, што накont гэтага думаюць дэпутаты.

У складзе мясцовых Саветаў дэпутатаў у маштабах Беларусі сёння працуе больш за 18 тысяч чалавек. Гэта рэзерв, на які ўскладаюцца велізарныя надзеі.

> Трэба шмат высілкаў для таго, каб дайсці да кожнага чалавека, паглядзець, каб усё было аб'ектыўна. І калі чалавек сапраўды мае патрэбу ў працаўладкаванні або перападрыхтоўцы, яму неабходна дапамагчы.

— Выступаючы з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу, Прэзідэнт казаў аб паступовым пашырэнні паўнамоцтваў, дадатковых функцыях Саветаў, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Гэта ўсё павінна рабіцца паступова, эвалюцыйна. Хто б што ні казаў, а патэнцыял дэпутатаў і старастаў вёсак сёння запатрабаваны. І вельмі добра, што людзі ідуць да дэпутата. Бо гэта здымае нагрузку з вышэйстаячых выканаўчых органаў улады. Плюс яшчэ ў тым, што дэпутат жыве ў той жа вёсцы, горадзе, што і яго выбаршчык, а значыць, ведае яго надзённыя праблемы не па чутках.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Найбольш актыўныя і амбіцыйныя дэпутаты будуць разглядацца ў якасці рэзерву кадраў.

— Мы часам кажам, што ў нас ёсць прабуксоўкі з кадравай палітыкай, няма належнага выяўлення таленавітых людзей, але сярод дэпутатаў, якія цяпер прыйшлі, шмат перспектыўных кіраўнікоў, — канстатаваў старшыня Савета Рэспублікі. — Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце рэкамендавана правесці спецыяльны семінар, каб выявіць з дэпутатаў гарадскога і раённага ўзроўню кандыдатаў на больш высокія пасады.

## Станоўчы вопыт

Дзень правядзення пасяджэння супаў з сумнай датай трагедыі на Чарнобыльскай АЭС. Слаўгарадскі раён на Магілёўшчыне адзін з найбольш пацярпелых ад катастрофы. 19 яго населеных пунктаў спынілі сваё існаванне, колькасць насельніцтва скарацілася з 24 тысяч чалавек амаль удвая. Узніклі праблемы з працаўладкаваннем людзей, умовамі іх пражывання. Пераадолець цяжкасці дапамаглі не толькі дзяржпраграмы, але і ініцыятыўнасць на месцах, пошукі новых формаў і спосабаў існавання. Сёння раён з'яўляецца адным з узорных па арганізацыі занятасці і самазанятасці насельніцтва. Кіраўнік парламента не хаваў, што менавіта гэты вопыт стаў вырашальным пры выбары месца правядзення пасяджэння.

— Я добра памятаю, як у 1986—1987 гадах тут перасялялі вёскі, людзі не ведалі, куды ехаць, што рабіць з асабістымі гаспадаркамі, — кажа Міхаіл Мясніковіч. — Але станоўчая работа Савета дэпутатаў і выканкама на адну агульную мэту дала свой вынік. Тут правільна рашалі пытанні мінімізацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС. Вопыт Слаўгарада можна тыражаваць і браць на ўзбраенне іншым.





Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ пабываў на ўроку малявання ў Слаўгарадскай сярэдняй школе № 1.

## Узгадаваць усебакова развітую асобу

Слаўгарадская школа № 1, якую наведалі дэпутаты, самая вялікая ў раёне. Тут вучыцца больш за 730 дзяцей. Пазалетась завяршылася маштабная рэканструкцыя ўстановы, якая вялася па чарнобыльскай праграме. Быў пабудаваны яшчэ адзін корпус са спальнымі пакоямі для вучняў малодшых класаў. **Дырэктар школы Ігар КАВАЛЁЎ** расказаў пра тое, як школа ўдзельнічае ў праектнай дзейнасці. Некалькі гадоў таму тут з прыцягненнем сродкаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі адкрыўся цэнтр рэсурса- і энергазберажэння «ЭкаСлаў». Эканамічны і экалагічны эфект дапамагаюць падлічыць спецыяльныя трэнажоры. Цэнтр разлічаны на адукацыю не толькі школьнікаў, але і ўсяго тутэйшага насельніцтва.

Падчас размовы пра ролю школы ў выхаванні ўсебакова развітой асобы дэпутаты закранулі балючыя пытанні — пра збор сродкаў бацькамі на ўдасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы школы, прафарыентацыю школьнікаў, якасць адукацыі.

— У нас на падыходзе новы Кодэкс аб адукацыі, зараз ідзе яго абмеркаванне, у тым ліку і ў парламенце, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Нам цікава даведацца, што трэба закласці ў новую рэдакцыю кодэкса акрамя таго, што там ужо ёсць.

Дэпутатам гарадскіх і раённых Саветаў прапанавана абмеркаваць гэтыя пытанні разам са спецыялістамі на месцах і прапрацаваць ідэі, якія можна было б рэалізаваць на рэспубліканскім узроўні.

## Будучыня за ініцыятыўнымі

Музей пад адкрытым небам, сырная крама, дзіцячы цэнтр лагічнага мыслення — гэта толькі некалькі ініцыятыў, якія былі рэалізаваны на тэрыторыі раёна. На выстаўцы-прэзентацыі ў аграгарадку Лясная з гэтымі і іншымі праектамі была магчымасць пазнаёміцца бліжэй. Пра ўстойлівае развіццё сельскіх тэрыторый Слаўгарадскага раёна праз занятасць і самазанятасць насельніцтва расказаў **дырэктар мясцовага фонду развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра» Віталь ВАРАБЕЙ**. Дарэчы, першы дырэктар гэтага фонду Таццяна Гурына калісьці ініцыявала адраджэнне традыцыі сыраварэння. Сёння слаўгарадскія сыравары вядомыя далёка за межамі раёна. Пры дапамозе фонду ў раёне развіваюцца аграэкатурызм, рамесніцтва, прадпрымальніцкая дзейнасць.

На выстаўцы дэпутаты змаглі ўбачыць перспектыўныя праекты ў сферы малога і сярэдняга бізнесу.

— У сакавіку ў нас адкрылася новае прадпрыемства «СлаўЛёнЭкспарт», — прадставіў «навінку» **намеснік старшыні па эканоміцы Слаўгарадскага райвыканкама Сяргей МІХАЛЮТА.** — Асноўным відам яго дзейнасці стане вырошчванне лёну для далейшай рэалізацыі льноволакна на экспарт у Расію, Еўропу і Кітай. Культура для Слаўгарадскага раёна пакуль новая, таму сёлета для пачатку будзе засеяна 150—200 гектараў, яшчэ каля 100—150 гектараў адведзена пад грэчку і райграс. Грошы ў эканоміку раёна інвестуе шклоўскае прыватнае прадпрыемства «ЛёнЭкспартШклоў». Калі справы пойдуць добра, абяцаюць падключыцца кітайскія інвестары.

> **Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**
>
> — Часта даводзіцца чуць, што роля Саветаў дэпутатаў некалькі прынікжана. Але, магчыма, гэта адбываецца не столькі з-за таго, што нешта не так на заканадаўчым узроўні, колькі ад пасіўнасці саміх дэпутатаў. Сёлета абрана больш за 18 тысяч дэпутатаў мясцовых Саветаў. Прыйшло шмат амбіцыйных, актыўных людзей, якія імкнуцца зрабіць нешта добрае і карыснае. Трэба па максімуме выкарыстоўваць гэты патэнцыял. Жыццё мяняецца вельмі імкліва, узнікаюць новыя задачы, новыя падыходы ў іх рашэнні, і неабходна адпаведная вучоба. Сёння грамадства дастаткова адукаванае, і калі раней чалавек, які меў пэўную адукацыю або пасаду, успрымаўся як усебакова падрыхтаваны, то сёння тыя, хто звяртаецца да гэтых кіраўнікоў, прыблізна самі такога ж узроўню. І хацелася б ад кіраўніка гарадскога ці раённага Савета атрымліваць нейкую дадатковую інфармацыю, дадатковыя веды. Таму старшыні Саветаў і дэпутаты павінны быць у найвышэйшай ступені кампетэнтныя.



Прадстаўнік прыватнага ўнітарнага прадпрыемства па аказанні паслуг «Наватэль» Алена КАВАЛЁВА расказвае пра магчымасці развіцця і добраўпарадкавання сельскіх тэрыторый.

Адным з цікавых праектаў, якія рэалізуюцца зараз у раёне, абяцае стаць шматфункцыянальны комплекс. Ён размесціцца на плошчах былога Дома быту. Першы паверх будзе выкарыстаны пад кавярню і рэстаран, на другім размесцяцца прадпрымальнікі, якія спецыялізуюцца на аказанні насельніцтву бытавых паслуг, на трэцім — мініг асцініца з нумарамі люкс, паўлюкс. У праект плануецца ўкласці не менш за 300 тысяч долараў. Інвестары — маскоўская кампанія. Чакаецца, што з уводам аб'екта ў дзеянне будзе створана 36 працоўных месцаў.

> У складзе мясцовых Саветаў дэпутатаў у маштабах Беларусі сёння працуе больш за 18 тысяч чалавек. Гэта рэзерв, на які ўскладаюцца велізарныя надзеі.

Наогул, па інфармацыі Слаўгарадскага райвыканкама, на 1 красавіка ў раёне дзейнічалі 141 прадпрымальнік, 8 сялянска-фермерскіх гаспадарак, 42 арганізацыі малога і сярэдняга бізнесу. Акрамя гэтага, 17 чалавек — у сферы самазанятасці. Сярод іх швачка, тамада, спецыялісты па аказанні сельскагаспадарчых паслуг.

## Занятасць — перш за ўсё

У Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Прэзідэнт паставіў мэту да 2025 года дасягнуць узроўню ВУП у памеры 100 мільярдаў долараў.

— За апошнія 8 гадоў нам трэба практычна падвоіць ВУП. Гэтыя тэмпы будуць закладзены ў прагнозе і бюджэце ўжо пачынаючы з наступнага года, — паведаміў дэпутатам Міхаіл Мясніковіч. — Асабліва хачу звярнуць увагу старшынь раённых Саветаў на выкананне палажэння Дэкрэта № 1 аб занятасці. У адпаведнасці з дэкрэтам старшыні Саветаў фактычна паўсюль узначалілі спецыяльныя раённыя камісіі. І трэба шмат высілкаў для таго, каб дайсці да кожнага чалавека, паглядзець, каб усё было аб'ектыўна. Калі чалавек сапраўды мае патрэбу ў працаўладкаванні або перападрыхтоўцы, яму неабходна дапамагчы.

За апошнія гады ў беларускай эканоміцы стала працаваць на 230 тысяч чалавек менш. Таму пытанні, звязаныя з занятасцю насельніцтва, вельмі важныя. Трэба шукаць новыя формы. Старшыні Саветаў дэпутатаў разам са старшынямі выканкамаў павінны абмеркаваць, за кошт чаго гэта можна зрабіць. У Слаўгарадзе добра пастаўлена работа па Дэкрэтах № 1 і № 7. Міхаіл Мясніковіч выказаў словы ўдзячнасці слаўгарадскім калегам за тое, што «яны паказалі нам новыя формы занятасці».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Іван ЭЙСМАНТ:

# «КАЛІ ПАЧЫНАЕ СНІЦЦА РАДЗІМА, ЗНАЧЫЦЬ, ЧАС ЕХАЦЬ ДАХАТЫ»

**Тры месяцы таму Іван Эйсмант, ён жа Іван Міхайлаў, адзін з вядучых праграмы «Галоўны эфір» на тэлеканале «Беларусь 1», узначаліў Белтэлерадыёкампанію. І першай вялікай камандзіроўкай для яго стала паездка ў родныя мясціны, на Гродзеншчыну. Добрая нагода ўспомніць дзяцінства, дзіцячыя мары, а таксама пагутарыць пра дзень сённяшні.**



## ...Калі дрэвы толькі саджалі

***— Іван Міхайлавіч, пра што вы падумалі, калі даведаліся, што 2018-ы аб'яўлены ў Беларусі Годам малой радзімы?***

— Пра тое, што даўно не быў на малой радзіме. І што рэдка атрымліваецца прыязджаць.

Вядома, згадваюцца родныя мясціны. Напэўна, кожны такое перажываў: калі пачынае сніцца радзіма, значыць, час ехаць дахаты.

Калі паўстала пытанне, куды мне ехаць у камандзіроўку, а гэта была першая вялікая камандзіроўка пасля прызначэння, пытанняў не было: адназначна Гродна.

***— Зусім недалёка — ваша родная вёска Луцкаўляны Гродзенскага раёна. Якія яны — Луцкаўляны вашага дзяцінства?***

— Аб дзяцінстве засёды толькі цёплыя ўспаміны. У маёй памяці гэта шматлюдная вёска, шмат розных падзей, мерапрыемстваў. У школе чаго толькі не праводзілі! Спартыўныя мерапрыемствы, у паходы хадзілі. 9 Мая быў неверагодны дзень! У вёсцы каля дарогі ёсць вялікі помнік воінам Вялікай Айчыннай вайны. З раніцы мы прыходзілі, стаялі ў ганаровай варце, сустракалі ветэранаў. Людзей шмат! Аркестр іграў!

Цяпер, калі прыязджаю, канешне, пазнаю вёску. Яна развіваецца, прыгажэе. Але мае Луцкаўляны крыху іншыя. Бывае нават сумна: з'ехалі многія, з кім разам раслі і жылі... Але ў любым выпадку з задавальненнем вяртаюся туды.

***— Да каго ездзіце на радзіму?***

— Там жывуць бацькі, брат са сваёй сям'ёй. Таму прыязджаю адразу ў дзве сям'і. Бацькі на пенсіі, але, як у любой вёсцы, саджаюць агарод, і праца заўсёды знойдзецца. Брат — галоўны аграном мясцовага СВК, яго жонка выкладае ў школе.

***— На беразе возера ёсць алея, якую, здаецца, саджалі школьнікі... Можа, і ваша дрэўца таксама там расце?***

— Так. Неяк да нас у школу прыязджаў Герой Савецкага Саюза, на жаль, ужо не памятаю, хто дакладна. З гэтай нагоды мы разам саджалі алею. Адно з дрэў пасадзілі ўтрох: наш госць, я і мой аднакласнік Павел Ашурык, які цяпер узначальвае галоўнае ўпраўленне фінансаў Гродзенскага аблвыканкама. Мы тады былі зусім хлапчукамі, а дрэва і па сёння расце. Прыемна пра гэта ведаць.

## Гродна ў эфіры

***— Значная частка вашага жыцця прайшла ў Гродне. Ведаем, і ваш дзядзька Віталь Салей працаваў на абласным радыё.***

— І ён, калі я прыязджаў у госці, часта браў мяне з сабой на працу. Я глядзеў, як ён склейваў ленту, — так разумею, гэта манціраваліся рэпартажы. Былі ў яго чамаданчык, магнітафон, мікрафон рассоўны, на які я ўвесь час глядзеў і баяўся дакрануцца. Пасля, калі падрос, прывозіў дзядзьку папулярную савецкую і замежную музыку, ён ставіў яе ў перадачах.

***— Ці не тады з'явілася жаданне таксама стаць журналістам?***

— Магчыма. Як цяпер памятаю, была размова, калі я паступаў: а можа, на журфак?.. Але гэта думка адышла. Акрамя таго, быў чалавек, які ў прамым сэнсе слова ўгаварыў паступаць у Акадэмію МУС.

***— Атрымліваецца, да таго, да чаго імкнуліся, прыйшлі не адразу.***

— Скончыў Акадэмію МУС, дзе даюць вельмі добрую юрыдычную адукацыю. Пасля служба. Гэта вельмі добрая школа. Дарэчы, у той час, калі жыў у Гродне, займаўся журналістыкай. Ну, умоўнай журналістыкай: дапамагаў карэспандэнту «Прэсбола» Уладзіміру Козыраву на спартыўных мерапрыемствах, пісаў нататкі пра матчы футбольнага «Нёмана», хадзіў на прэс-канферэнцыі, браў інтэрв'ю ў галоўных трэнераў, падлічваў тактыка-колькасныя паказчыкі падчас матчаў. Увогуле, займаўся «прымітыўнай» журналістыкай. Пакуль, можна сказаць, выпадкова не трапіў на тэлебачанне: прапанавалі паспрабаваць, і я прайшоў кастынг.

У журналістыку насамрэч прыйшоў не адразу. Але аб рабоце ў Гродне і пражытых тут гадах зусім не шкадую.

***— З таго самага кастынгу прайшло не так і шмат часу, менш як пятнаццаць гадоў, і вось вы — старшыня Белтэлерадыёкампаніі. Калі занялі пасаду кіраўніка, ад журналістыкі як творчага працэсу з напісаннем тэкстаў, падрыхтоўкай тэлесюжэтаў і гэтак далей прыйшлося адмовіцца?***

— Гэта абавязковая ўмова, каб усё гэта засталося. Прызнацца, часта ад гэтага пакутую: калі ўчора цябе турбавала, што цікавае прыдумаць для праграмы, то назаўтра цябе турбуе, што труба недзе цячэ... Для мяне важна сумяшчаць творчы працэс і кіраўніцтва. Я застаўся адным з вядучых праграмы «Галоўны эфір», актыўна ўдзельнічаю ў падрыхтоўцы кожнага выпуску. Мне падабаецца фармат «Галоўнага эфіру». Добрая перадача, на мой погляд. Там я магу выказаць сваё меркаванне, што таксама важна.

Наконт новых праграм... Паглядзім. Можа, фільмы будзем здымаць. Люблю спецыяльныя рэпартажы, дакументалістыку. Нават узяўся за адзін фільм, прысвечаны Мінску. Ідэя такая, што гэты фільм можа здымацца бясконца, шмат гадоў у розныя поры. Так што ў любы момант можна зноў прыступіць да здымак.

***— У Гродне не прыглядзелі «карцінку» для новага фільма?***

— Думаю, не ад мяне першага чуеце, што Гродна вельмі прыгожы. У многіх гарадах у апошнюю чаргу рукі даходзяць да таго, каб зрабіць фасады, дворыкі. А Гродна добраўпарадкаваны, асабліва цэнтр. Зразумела, не без праблем, — і ў самых багатых гарадах яны ёсць.

Што мне спадабалася ў Гродне — убачыў шмат турыстаў. Я так разумею, гэтаму садзейнічае бязвізавы рэжым.

***— Калі б вы былі экскурсаводам, куды б адвялі турыстаў?***

— Напэўна, у замкі. Сам, калі прыязджаю, люблю зайсці і пастаяць на аглядальнай пляцоўцы Старога замка.

Увогуле, у Гродна неабходна ехаць на фестываль нацыянальных культур (у гэтым годзе ён пройдзе 1—3 чэрвеня. — **Аўт.**). Усім расказваю, якая гэта цудоўная падзея. Сама ідэя выдатная: сабраць і прадставіць столькі народаў, іх традыцыі, абрады, кухню... Мы абавязкова прыдумаем што-небудзь цікавае і на нашых каналах — пакажам фестываль ва ўсёй яго красе.

## «Карцінка» стане лепшай

***— На ваш погляд, якім павінна быць сучаснае тэлебачанне?***

— Ёсць два аспекты. Гэта творчы, чалавечы патэнцыял: людзі, якія могуць зрабіць феерычнае тэлебачанне. Такія людзі ў нас нараджаюцца, выхоўваюцца. Але, на жаль, пакуль не ўсе застаюцца працаваць. Колькі КВЗ-шнікаў нашых у Маскве, сцэнарыстаў, аператараў, вядучых. Многія, ведаю, атрымліваюць прапановы. Думаем над тым, як спыніць уцечку кадраў у час глабалізацыі.

Другі аспект — фінансавы. Тэлебачанне — надзвычай дарагая рэч. Але дапамагае дзяржава, рэкламны рынак ёсць, мы самі зарабляем. І я рады, што мы прыйшлі да таго, да чаго даўно павінны былі прыйсці — пераходу на HD вяшчанне (ноччу на 30 сакавіка Белтэлерадыёкампанія пачала аддаваць свой сігнал у фармаце HD. — **Аўт.**). Першы крок зрабілі. Да канца года пастараемся перавесці ўсю вытворчасць на HD.

Зараз мы на стадыі заключэння кантрактаў на набыццё чатырох перасоўных тэлестанцый. Праз год здымем імі Еўрапейскія гульні ў Беларусі.

Што датычыцца рэгіянальных тэлерадыёкампаній, падтрымана ідэя фінансаваць іх пераход на HD з інавацыйнага фонду. Але гэта цэлая структурная змена. Таму што размова ідзе пра поўнае пераабсталяванне, замену рэжысёрскіх пультаў, экранаў, камер... Далей ідуць святло, дэкарацыі, мы нават набылі спецыяльны грым HD. Адно цягне за сабой другое.

Калі казаць пра новыя праграмы, думаю, мы прыйдзем да таго, што будзе асобны канал навін. У сваёй краіне трэба мець такі канал.

## Прывітанне з мінулага, альбо Кадры памяці

***— У вас як гледача ёсць любімыя тэлеперадачы?***

— З самага дзяцінства гляджу «Што? Дзе? Калі?». Раней мяне было проста не адарваць. Зноў жа, як у гісторыі з вёскай, тады было больш цікава: Друзь быў малады, Паташоў... *(смяецца)*. Цяпер новыя людзі прыйшлі. Але ўсё роўна добрая перадача.

***— Часта журналістаў, асабліва тых, хто працуе ў прамым эфіры, пытаюцца пра казусы. Здаецца, іх не пазбегнуць. З вамі здаралiся?***

— Зразумела, усякае было. Але святло ў мяне ніколі не выключалася і нічога не падала. А вось суфлёр прападаў (на спецыяльным экране выводзіцца тэкст, які чытае вядучы. — **Аўт.**). На гэты выпадак перад вядучым ляжыць раздрукаваны тэкст. Мая задача ў кожную секунду, калі чытаю суфлёра, разумець, у якім месцы я знаходжуся на паперы. Калі на экране знікне тэкст, зможаш хутка зарыентавацца. Такое было. Праўда, мне пашчасціла больш, чым, здаецца, Дзянісу Кур'яну. Ён прафесійны чалавек і навіны чытаў зусім без папер. Калі ў яго аднойчы знік суфлёр, выпуск навін Дзяніс дачытаў па памяці.

***— Журналісты, карыстаючыся сваім становішчам, фатаграфуюцца на памяць, беручь аўтографы ў вядомых людзей, з якімі ім даводзіцца сустракацца... Як вы захоўваеце ў памяці такія моманты?***

— Неяк год таму мне трапіў на вочы фотаздымак, дзе я з Дэвідам Бэкхэмам. І згадаў, што гэта было, калі зборная Англіі прыязджала на матч у Мінск, мы сустракаліся ў кулуарах. На шчасце, амаль усе сустрэчы з вядомымі людзьмі суправаджаюцца відэаздымкамі, і з гэтага заўсёды можна зрабіць фатаграфію. Я ніколі не браў аўтографы і стараўся не навязвацца з фатаграфаваннем. А вось відэа захавалася шмат. Мне часта дасылаюць сюжэты, дзе я яшчэ малады... Хоць я і цяпер не стары *(усміхаецца)*. А там мне 27 гадоў, раблю інтэрв'ю з вядомымі людзьмі. Цікава паглядзець. Аднак з часам гэта пераўтвараецца ў звыклую штодзённую працу. На пенсіі буду згадваць!

Адзін з яркіх успамінаў — Алімпіяда ў Сочы. Пасля яе мы самі сабе сказалі: «Давайце запомнім. Больш такога з намі ніколі не будзе». Калі на той алімпіядзе размяркоўвалі, хто па якім відзе спорту працуе, я выбраў біятлон. Не ведаю чаму. Не было ніякага прадчування, хоць мы разумелі, што ў нас у гэтым відзе можа быць медаль. А тут — адразу чатыры! Кожны гоначны дзень у жаночых спаборніцтвах заканчваўся медалём. Гэта феерыя!

Спаборніцтвы заканчваліся даволі позна, а нам трэба было паспець з сюжэтам у «Панараму». Тры разы браў інтэрв'ю ў Дашы Домрачавай. Прычым мы гэта рабілі сходу, каб не манціраваць. Гэта значыць, я вітаюся, прадстаўляюся, задаю пытанне і развітваюся. Потым усё вельмі хутка заганяецца ў камп'ютар, перадаецца і ідзе ў эфір. І калі я падышоў да Дашы трэці раз... Усміхнуліся мы абое. Таму што першы раз я задаў пытанне, што яна адчувае, другі... а трэці — што пытацца? Не хацелася ў той момант разбіраць гонку, хацелася эмоцый — таго, чаго чакае глядач. Даша тады ва ўсіх трох інтэрв'ю звярталася да людзей, дзякавала. Пасля я запісаў з ёй вялікае інтэрв'ю.

***— Спорт, як аказваецца, блізкі вам ва ўсіх сэнсах — пісалі аб ім, вялі перадачы, самі гуляеце ў футбол...***

— Гуляю з вялікай асалодай. Не хачу сказаць, што ў мяне больш працы, чым у некага з журналістаў, але пакуль я пераключыўся з усіх калятэлевізійных рэчаў на тое, чым займаюся цяпер. І ўсё ж у найбліжэйшы час збіраюся вярнуцца да футбола. Альберт Скарахід, стваральнік «зорнай» каманды «Арт-старс», ужо тэлефанаваў — у чэрвені ў Маскве павінен прайсці чэмпіянат свету па футболе сярод артыстаў і тэлевізіёншчыкаў. Прапаноўваў пагуляць. Але гэта азначае з'ехаць на цэлы тыдзень, што пакуль для мяне немагчыма. А вось калі будзе гульня ў Мінску, дык з задавальненнем.

**Таццяна КУЗНЯЧЭНКАВА, «Гродзенская праўда».**

### Бліц-апытанне

**Найлепшы адпачынак**
На моры, напэўна. Вельмі даўно не быў.

**Любімая кніга**
З сястрой усё школьнае дзяцінства адно аднаму перачытвалі Ільфа і Пятрова.

**Найлепшая навіна за апошні час**
Мы перайшлі на HD.

**Галоўная вынаходка чалавецтва**
Тэлебачанне, напэўна.

**Ваша пасланне ў бутэльцы**
Запрасіў бы прыехаць у Беларусь. Гэта калі кідаць у мора.

**Жыццёвае правіла**
Стараюся ва ўсім разабрацца і ўпэўніцца сам.

**Тры складнікі ідэальнай раніцы**
Гэта працоўная раніца, але на працу мне к абеду (такое часта бывае ў выходныя дні). Добрае надвор'е. Я снедаю на вуліцы.

## Наступны тыдзень



**ШАЛІ.** На гэтым тыдні ўсё будзе залежаць ад таго, як вы зрэагуеце на цяжкасці, якія ўзнікнуць. Паспрабуйце не панікаваць і спакойна ва ўсім разабрацца. Не выключаная вострая барацьба з канкурэнтамі. Вытрымаўшы гэтыя выпрабаванні, зможаце даказаць сабе і навакольным, што маеце поўнае права на поспех. Пажадана цяпер нічога не мяняць у асабістым жыцці. Паводле зорак, яно вельмі гарманічнае.



**СКАРПІЁН.** Час неардынарны і творчы. Калі вы запланавалі падарожжа, то яно будзе багатае на ўражанні і падзеі. Усю першую палову тыдня фартуна будзе вам ўсміхацца. На працы, ды і наогул у дзелавых адносінах, магчымыя перспектыўныя прапановы ад надзейных партнёраў, а таксама доўгачаканы прыбытак ад доўгатэрміновых кантрактаў. Паступова ўзрастае ваш аўтарытэт. Адносіны ў калектыве становяцца ўсё больш камфортнымі. Але не забывайце пра адпачынак, інакш назапашаная стомленасць можа нагадаць пра сябе ў самы непрыдатны момант.



**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні вас, магчыма, можа наведаць вострае жаданне нешта змяніць — знешні выгляд, працу, сямейнае становішча. Што ж, адважвайцеся! У сераду паспрабуйце трымаць свае дзелавыя паперы далей ад цікаўных поглядаў, бо канкурэнты лёгка могуць скарыстацца вашай даверлівасцю. У пятніцу праявіце прадбачлівасць і асцярожнасць, асабліва пры кантактах з новымі людзьмі. У суботу не саромейцеся праяўляць ініцыятыву, падтрымка будзе вам забяспечана.



**КАЗЯРОГ.** Вы на грэбні хвалі, нават плёткі робяць вам небывалую рэкламу. Вы зараз таварыскія і абаяльныя, вас закруціць віхор новых сустрэч і знаёмстваў. А вось на працы не варта залішне капрызіць і прыдзірацца па дробязях, такімі дзеяннямі можаце раззлаваць калег. У пятніцу ёсць сэнс чакаць прыемны сюрпрыз ад каханага чалавека. Выхадныя лепш правесці ў кампаніі сяброў, чым сваякоў. Адпачніце і павесяліцеся ад душы.



**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні на першы план выйдзе праца. Чакайце мноства важных спраў і нечаканых заданняў, прычым нават у выхадныя. Спатрэбіцца шмат намаганняў, каб справіцца з імі, пры гэтым начальства можа так і не ацаніць вашага імпэту. У чацвер здольнасць адэкватна адрэагаваць на сітуацыю можа значна знізіцца, таму будзьце ўважлівыя і нават падазроныя, інакш можаце аказацца здабычай махляроў. У пятніцу павінны лёгка давацца справы, звязаныя з праяўленнем уласнай ініцыятывы. У суботу адпраўляйцеся на прыроду.



**РЫБЫ.** З'явіцца неабходнасць скарыстацца ўнутранымі рэзервамі. Якімі менавіта, пакажа час, але ў любым выпадку яны акажуцца вельмі дарэчы для вырашэння надзённых пытанняў. Давядзецца вельмі актыўна працаваць, затое атрымаеце магчымасць ажыццявіць свае творчыя задумы. У чацвер вам прыйдзецца шмат размаўляць і тлумачыць сваю пазіцыю. У пятніцу ўдасца атрымаць карысць ад зносін з калегамі. Выхадныя пагражаюць быць даволі напружанымі, бо назапасілася вельмі шмат хатняй працы.

## Чацвер, 10 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.20** «Зона Х» (16+).
**8.50** Слова мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Ушэсця Гасподняга.
**9.10 Драма «А досвіткі тут ціхія...» (12+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Балада пра бомбера» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.40** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.40, 15.30 Серыял «Клан ювеліраў. Адплата» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**22.00** Міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне-2018». Другі паўфінал.
**0.00** «Сфера інтарэсаў».
**0.45** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 21.05** «Тэлебарометр».
**9.05, 19.30** «Сляпая» (16+).
**10.05, 23.30 Серыял «Акадэмія» (16+).**
**12.05** «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).
**13.05** «Паненка-сялянка» (16+).
**14.10** «Бітва салонаў» (16+).
**15.15, 20.30** «Сям'я 3D». Скетчкам (12+).
**16.15** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Францыя.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Нарвегія — Канада. У перапынках: «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40, 12.20** «Беларуская кухня». Бабенікі.
**8.05, 12.00, 20.00** Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 20.15** Гэты дзень.
**8.25 «Чорная бяроза». Драма. 1-я серыя (12+).**
**9.40, 18.50** «Франтавыя гісторыі любімых артыстаў». Аляксей Смірноў, Уладзімір Басаў (12+).
**10.20** «Яны спявалі за Радзіму». Песня «Кацюша».
**10.50** «Музыка роднай краіны». Канцэрт.
**11.45** «Размовы пра духоўнае».
**12.45** «Я хачу гэта ўбачыць!» Мінск. Частка 1-я (6+).
**13.10** «Гуляй, душа!» Канцэрт Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята».
**14.20, 22.40** «Сталінград. Перамога, якая змяніла свет». «Гарачае лета 1942-га» (12+).
**14.55, 21.05 «Ляцяць жураўлі». Драма (12+).**
**16.35 «Дняпроўскі рубеж». Маст. фільм (16+).**
**19.30** «Партызанская вайна». Канстанцін Заслонаў (12+).
**20.10** «Беларуская кухня». Ходчанская паліўка.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.15** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Галіна Крываблоцкая.
**23.40** «Святло далёкай зоркі». Памяці спевака, заслужанага артыста БССР Эдуарда Міцуля.

### Беларусь 5

**6.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Ньюкасл».
**8.25** Гульні «навырост».
**8.55** Слэм-данк.
**9.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Беларусь.
**11.25, 23.35** Хакей. Чэмпіянат свету. Дзённік.
**11.50** Легенды сусветнага спорту.
**12.20** На шляху да ЧС—2018. Відэачасопіс.
**13.00, 19.25** Тэніс. WTA. Мадрыд.
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. ЗША — Латвія. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Чэхія — Расія. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**0.05** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Самы народны артыст Мікалай Кручкоў» (12+).
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.25, 13.10** Канцэрт, прысвечаны 45-годдзю фільма «Афіцэры».
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Легенды цырка» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Камедыя «Пяць нявест» (16+).**
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**9.00 Драма «Балада пра салдата». (12+).**
**10.40, 23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30** «Следакі» (16+).
**11.55 Маст. фільм «Тры дні лейтэнанта Краўцова». (16+).**
**13.50, 20.15** «Знішчальнікі». Серыял (12+).
**16.05** «Далёкія сваякі» (16+).
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**17.50 «Навошта табе алібі?» Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
**20.35** «Як устроены Сусвет» (16+).
**22.05** «Глядзець усім!» (16+).
**23.50** «Аўтапанарама» (12+).
**0.10** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.55 «Каманда Чэ». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00 Серыял «Аса» (16+).**
**7.20, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «Сямнаццаць імгненняў вясны» (12+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.15** Навіны (бягучы радок).
**14.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 23.20** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.10, 19.20 Серыял «Сляды апосталаў» (16+).**
**21.10 Маст. фільм «Псіхапатка» (16+).**
**0.25 Маст. фільм «Рам і Шыям» (12+).**
**3.50** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**4.20 Маст. фільм «Светлы шлях» (12+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35 Маст. фільм «Быў месяц май». (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Маст. фільм «Права апошняй ночы». (12+).**
**22.15, 23.10 Маст. фільм «Праз беды і смуткі». (12+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Мухтар. Новы след «. (16+).**
**8.50 Серыял «Сужэнцы». (16+).**
**9.45** «За гранню».
**10.25 Серыял «Лютасць». (16+).**
**12.05** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05, 16.35 Серыял «Брацянікі». (16+).**
**17.25** «ДНК». (16+).
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы». (16+).**
**21.25 Серыял «Собр». (16+).**
**23.05** «НЗ.by».
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55** «Сімвал Перамогі. Саласпілс». (16+).
**0.25 Серыял «Падазраюцца ўсе». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 16.00, 19.35, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.15, 23.00 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.10 Серыял «Макс» (16+).**
**9.00, 19.40 Серыял «Імператрыца Кі» (16+).**
**10.05** «Майстар-клас».
**10.15** «Здароўе».
**11.15 Драма «Удовы» (12+).**
**12.45 Серыял «Каханне цудоўнае» (16+).**
**14.25 Драма «Тарпеданосцы» (16+).**
**16.05** «Мультпарад» (0+).
**16.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**17.00 Серыял «Анёлы» (16+).**
**18.30 Серыял «Справядлівая справа» (16+).**
**19.25** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.15 Драма «Палёт даўжынёю ў жыццё» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 16.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20. 4.20** М/ф «Чычы Лэнд». (0+)
**7.40, 4.35** М/ф «Скубі Ду». (6+)
**8.10, 5.00** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**8.30, 19.00** Серыял «Кухня-6» (16+).
**10.40** Фантастыка «Макс Сціл». (12+).
**12.35** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00, 2.40** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**14.00, 1.50** Серыял «Маладзёжка» (12+).
**15.10, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 23.00** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.10** Камедыя «Таксі». (12+).
**0.00, 3.30** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства». (16+).
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.10** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Марына Уладзі.
**7.05** «Пешшу...» Масква яўзская.
**7.35, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.10** «Сэрцы чатырох». Маст. фільм.
**9.40, 19.45** Галоўная роля.
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10, 0.10** ХХ стагоддзе. «Узлёт. Андрэй Тупалеў». Дак. фільм. «Дрэсіроўшчык. Вальтэр Запашны» Дак. фільм.
**12.00** «Абсалютны слых».
**12.45, 1.55** «Самуіл Маршак. Звычайны геній». Дак. фільм.
**13.35, 20.45** «Летні палац і тайныя сады апошніх імператараў Кітая». Дак. фільм.
**14.30** «Сігналы дакладнага часу». Дак. серыял.
**15.10** Андрэй Пісараў. Творы Ф. Ліста.
**16.05** Пернікавы домік. «Сахалар — нашчадкі кавалёў».
**16.35** «Ісаак Шварц — зорка чароўнага шчасця».
**17.30, 2.40** Сусветныя скарбы.
**18.45** «Больш, чым каханне». Лідзія Русланава.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Энігма. Аіда Гарыфуліна».
**22.20** Да 85-годдзя з дня нараджэння Андрэя Вазнясенскага. «Андрэй і Зоя». Дак. фільм. 1-я серыя.
**23.30** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.

### Настальгія

**6.00** «Тэатральныя сустрэчы». 1984 год. (12+).
**7.10** Маст. фільм «Быў месяц май». (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час». (12+).
**9.40, 14.15, 15.40, 17.00, 18.55, 21.40, 1.00, 3.40** Музычная настальгія. (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 0.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР». (12+).
**11.00, 5.00** «Песня-83». (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год. (12+).
**13.00** Маст. фільм «Жыла-была дзяўчынка». (16+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Мае 6 сотак». 2007 год. (12+).
**20.00** Тэлеспектакль «Дэфіцыт на Мазаева». 1979 год. (12+).
**23.00** «Песня-85». 1-е аддзяленне. (12+).
**1.10** Фільм-спектакль «У горадзе добрае надвор'е». 1983 год. (12+).

### EuroSport 1

**4.00** Аўтагонкі. WTCR.
**4.30, 11.00, 2.00** Ралі. ERC. «All Access».
**5.00, 7.15, 9.30, 13.00, 14.15, 21.00, 0.15, 2.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія».
**6.00, 23.00** Футбол. «ФІФА».
**6.30** Watts.
**8.15, 11.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**14.00, 18.15** Веласпорт. «Джыра»-экстра.
**18.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
**23.45** «Звышчэмпіёны».
**1.30** Аўтагонкі. World Endurance.

### Кінакамедыя

**0.35** Навагодні пярэпалах. (12+).
**2.15** Утаймаванне свавольнага. (16+).
**4.15** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**4.35** Ас. (16+).
**6.25** Сёе-тое яшчэ. (16+).
**8.30** Вяселле па абмене. (16+).
**10.15** Дзень радыё. (16+).
**12.15** Шчаслівы выпадак. (16+).
**14.05** Крутая Джорджыя. (16+).
**16.10** Эйс Вентура: вышук хатніх жывёл. (12+).
**17.50** Эйс Вентура-2: калі кліча прырода. (12+).
**19.30** Украдзі маю жонку. (16+).
**21.15** Развод па-французску. (12+).
**22.50** Я ніколі не буду тваёй. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.05** «Доктар І...» (16+).
**8.35, 19.00, 2.30** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.10, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.50, 17.15** «Варажбітка» (12+).
**13.20, 16.15** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**14.15** «Простыя складанасці» (12+).
**15.20** «Натуральны адбор» (12+).
**20.50** «Мы з будучыні». Драма (16+).
**21.50** «Савецкія мафіі» (16+).
**22.40** «Вяселле і развод» (16+).
**23.30** «Грань». Серыял (16+).
**0.20** «Вінаватыя зоркі». Меладрама (12+).
**5.30** «Гісторыі выратавання» (16+).

### TV1000

**6.10, 17.40** Лізавета. (16+).
**8.35** Дарагі Джон. (16+).
**10.50** Планета 51. (12+).
**12.45** Першы рыцар. (16+).
**15.25** Не жартуйце з Зоханам! (16+).
**20.10** Філасофы: урок выжывання. (12+).
**22.15** Мачаха. (12+).
**0.35** Найлепшае ўва мне. (12+).
**2.50** Захавальнік Месяца. (0+).
**4.20** Сур'ёзны чалавек. (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Сталінград (12+).
**8.45** 28 панфілаўцаў (12+).
**11.00** А зоры тут ціхія... (12+).
**13.15** На залатым ганку сядзелі... (12+).
**14.40** Той яшчэ..! (12+).
**16.20, 4.35** Чужая мілая. 1—2-я серыі (12+).
**18.20** Пятніца (16+).
**20.20** Слухач (12+).
**22.15** Клушы (16+).
**0.20** Усё і адразу (16+).
**2.10** Калектар (16+).
**3.25** Перакладчык (16+).

### National Geographic

**6.00, 15.15, 5.15** Найцяжэйшы ў свеце рамонт-2. (6+).
**6.50** Зона будаўніцтва. (12+).
**7.45** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.10** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.55, 12.05, 16.50, 20.40** Аўта-SOS. (12+).
**9.45** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна. (16+).
**10.30** Цуды інжынерыі. (12+).
**11.20** Дзікі тунец. (16+).
**13.35, 23.45** Геній: Пікаса. (16+).
**14.30** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**16.05, 19.55, 0.35, 2.55** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**18.25, 22.15** Сапраўдны суперкар. (12+).
**19.10** Уварванне на Зямлю. (16+).
**23.00, 1.25, 4.25** Служба бяспекі аэрапорта-3. (18+).
**2.10** Кім Чэн Ын: неафіцыйная біяграфія. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары.
**9.00, 11.00, 15.00** Як гэта ўстроена?
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**14.00** Выжыванне без купюр.
**18.00** Як устроена Зямля.
**19.00, 6.20** Хуткія і гучныя.
**20.00, 0.00** Залатая ліхаманка.
**1.00, 5.30** Самагоншчыкі.
**2.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**2.55** Залаты шлях.
**7.10** Выжыванне без купюр.

## Субота, 12 мая

### Беларусь 1

**6.25** «Існасць».
**6.50 Меладрама «Саша + Даша + Глаша» (16+).**
**8.25** «Кулінарная дыпламатыя» (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Зона Х». (16+).
**9.45** «Здароўе» (12+).
**10.40** «Трансфармацыя» (12+).
**11.20** «Дача» (12+).
**12.10** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**12.45 Серыял «Байкі Міцяя» (12+).**
**13.20** «Я ведаю».
**15.15** «Краіна».
**15.45, 19.50 Серыял «Таткі» (16+).**
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Аўстрыя — Беларусь.
**19.30** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**21.00** «Панарама».
**22.00** Міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне-2018». Фінал.
**1.05** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00 Фільм для дзяцей «Альпійская казка» (0+).**
**8.40, 21.05** «Тэлебарометр».
**8.45** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**9.20, 23.30** «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).
**10.15** «Бітва салонаў» (16+).
**11.15** Анімацыйны фільм «Суперсямейка» (12+).
**13.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Латвія — Германія.
**15.30** «Капейка ў капейку» (12+).
**16.25** «Паненка-сялянка» (16+).
**17.25** «Абмен жонкамі» (16+).
**18.35 Меладрама «Крок наперад: усё ці нічога» (12+).**
**20.25** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Канада — Фінляндыя. У перапынку: «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».

### Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.00, 13.45, 20.15** Навіны культуры.
**8.15, 14.00, 20.30** Гэты дзень.
**8.20** М/ф (0+).
**8.55 «Строгавы». Маст. фільм. (12+).**
**10.00** «Беларуская кухня». Запечаны гарбуз.
**10.30** «Беларусь як песня». Арнольд Ранцанц.
**10.55** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.20 «Зялёны фургон». Прыгоды (12+).**
**14.05** «Навукаманія» (6+).
**14.35** «Веліч рамангса». Канцэрт Уладзіміра Александровіча.
**15.35** «Легенды кіно». Валянцін Гафт (12+).
**16.15 «Валерый Чкалаў». Маст. фільм (12+).**
**17.55 «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм «За парогам Перамогі» (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Гаспадар тайгі». Маст. фільм (12+).**
**22.25** Б.Фрыл. «Translations». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

### Беларусь 5

**6.25** Тэніс. WTA. Мадрыд.
**8.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**8.55** Хакей. Чэмпіянат свету. Беларусь — Чэхія.
**10.50, 23.35** Хакей. Чэмпіянат свету. Дзённік.
**11.15** Вялікі спорт.
**11.55** Пляжны футбол. Суперкубак Беларусі.
**13.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Швецыя.
**15.25** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. СКА-Мінск — БГК імя Мяшкова.
**17.05** Спорт-цэнтр.
**17.20** Трэніровачны дзень.
**17.50** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург) — «Цмокі-Мінск». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**19.30** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Брэст) — «Віцебск». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Расія — Швейцарыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**0.05** Кіснадзэ. Меркаванне.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**7.10 Маст. фільм «Апякун» (12+).**
**9.10** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды» (0+).
**9.30** «Здароўе» (16+).
**10.40** «Мая мама гатуе лепш!» (12+).
**11.45** «Аляксандр Беляўскі. «Для ўсіх я стаў Фоксам» (12+).
**12.40** «Разумніцы і разумнікі» (12+).
**13.30 Да 100-годдзя памежнай службы РБ. Маст. фільм «Дзяржаўная граніца». «Год сорак першы» (12+).**
**16.20** «Георгій Жжонаў. «Усё маё жыццё — суцэльная памылка» (12+).
**17.20 Драма «Экіпаж» (12+).**
**20.00** «Нашы навіны». Суботні выпуск.
**20.45** «Метэагід».
**21.00** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**21.05** «Сёння ўвечары» (16+).
**23.40 Трылер «Адзінокія сэрцы» (16+).**

### СТБ

**6.15 «Студэнты-2» Серыял (16+).**
**7.50** «Анфас».
**8.05** «Ежа багоў» (16+).
**9.00** «Як устроены Сусвет» (16+).
**10.30** «Самая карысная праграма» (16+).
**11.20** «Мінск і мінчане».
**11.55 Камедыя «Як украсці брыльянт». (12+).**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.45, 1.25 Камедыя «Блізняты». (12+).**
**15.40** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**16.45** «Вялікі горад».

**17.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**17.45 «Дэпартамент». Серыял (16+).**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Камедыя «Чаго хочуць жанчыны». (12+).**
**22.15** Дакументальны спецпраект (16+).
**23.50** Гурт «Muse»: канцэрт на Алімпійскім стадыёне ў Рыме (16+).

### МІР

**6.00** «Як у рэстаране» (12+).
**6.30, 9.20** М/ф (6+).
**7.50** «Саюзнікі» (12+).
**8.20** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**8.50** «Вой, мамачкі!» (12+).
**9.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Здабытак рэспублік. Васьмідзясятыя» (12+).
**10.45 Маст. фільм «Дамы запрашаюць кавалераў» (6+).**
**12.10 Маст. фільм «Беражыце жанчын» (12+).**
**14.40 Маст. фільм «Беражыце мужчын» (6+).**
**16.15, 19.15 Серыял «Жанчыны ў гульні без правіл» (12+).**
**21.05 Серыял «Я дачакаюся» (16+).**
**0.30 Серыял «Сляды апосталаў» (16+).**
**4.10 Маст. фільм «Таямнічы востраў» (12+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху». (16+).
**7.40 Маст. фільм «Праз беды і смуткі». (12+).**
**11.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі». (12+).
**12.10** «Пяцёра на аднаго». (12+).
**13.00** «Наша справа». (16+).
**13.15** «Пакой смеху». (16+).
**14.15** «Гумар! Гумар! Гумар!» (16+).
**16.25 Маст. фільм «Ненавіджу і кахаю». (12+).**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Прывітанне, Андрэй!» (12+).

**22.40 Маст. фільм «Калі сонца ўзыдзе». (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.25** «Астрапрагноз».
**6.30 Драма «Чаклун і Румба». (12+).**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «НЗ.by».
**8.55** «Урачэбныя тайны плюс». (12+).
**9.25** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).
**10.25** Галоўная дарога. (16+).
**11.10** «Ежа жывая і мёртвая». (12+).
**12.10** Кватэрнае пытанне. (0+).
**13.15** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**13.45 Камедыя «Пяць нявест». (12+).**
**16.25** «Следства вялі...» (16+).
**17.10** «Сакрэт на мільён». Таццяна Буланава. (16+).
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Ты супер!» Міжнародны вакальны конкурс. (6+).
**22.15 Баявік «22 хвіліны». (16+).**
**23.45** «Сімвал Перамогі. Люцежскі плацдарм». (16+).
**0.15 Серыял «Падазраюца ўсе». (16+).**

### 8 канал

**9.00, 18.30, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**9.15** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**9.20** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**9.30 Серыял «Англійскае забойства» (12+).**
**11.05 Драма «Першы пасля Бога» (16+).**
**12.50 Драма «Дадому» (12+).**
**14.20** «Суперкніга».
**14.50** М/ф «Праўдзівая гісторыя ката ў ботах» (0+).
**16.10** «Здароўе».
**17.00 Драма «Урокі французскай» (12+).**
**18.35 Баявік «Залатое вока» (12+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**21.15 Драма «Гібель багоў» (16+).**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер» (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**7.30** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**8.00** «Дзіцячы КВЗ» (6+).
**9.00, 3.00** М/ф «Чычы Лэнд». (0+)
**9.20, 3.15** М/ф «Скубі Ду». (6+)
**9.50, 3.40** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**10.15** Анімацыйны фільм «Махні крылом». (0+).
**12.00** Анімацыйны фільм «Граза мураўёў». (6+).
**13.40** Серыял «Мамачкі-2» (16+).
**15.40** «Узважаныя і шчаслівыя людзі» (16+).
**17.30, 19.10, 22.55** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.10** Камедыя «Таксі-3». (12+).
**0.00** Жахі «Збаў нас ад злога». (18+).
**2.00** «Хачу верыць!» (16+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

### Культура

**6.30** Біблейскі сюжэт.
**7.05** «Гэта было мінулым летам». Маст. фільм.
**9.45** «Малы і Карлсан». «Карлсан вярнуўся». М/ф.
**10.30** «Звычайны канцэрт».
**11.00** «Сябар мой, Колька!» Маст. фільм.
**12.25** «Мыс Добрай Надзеі Валянціна Сідарава». Дак. фільм.
**13.10, 0.45** «Канарскія астравы». Дак. фільм.
**14.00** «Міфы Старажытнай Грэцыі». Дак. серыял.
**14.25** «Пятае вымярэнне».
**14.55, 22.45** Кіно на ўсе часы. «Ліхаманка суботнім вечарам». Маст. фільм. (16+).

**16.55** «Тайны высокіх шырот». Дак. фільм.
**17.40** «Гульня ў бісер». «Міхаіл Лермантаў. «Барадзіно».
**18.20, 1.35** «Шукальнікі». «У пошуках скарбу Бобрынскіх».
**19.10** «Аляксандр Збруеў. Мае бацькі». Дак. фільм.
**19.35** «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца». Маст. фільм.
**21.00** «Агора». Ток-шоу.
**22.00** «Андрэй і Зоя». Дак. фільм.
**2.25** «Пер Гюнт». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Мае 6 сотак». 2007 год. (12+).
**6.55, 9.40, 12.40, 15.40, 18.40, 20.15, 2.15, 3.40, 5.00** Музычная настальгія. (12+).
**8.00** Тэлеспектакль «Дэфіцыт на Мазаева». 1979 год. (12+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час». (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаны ў СССР». (12+).
**11.00, 17.00, 23.10** «Песня-85». (12+).
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1977. 2009 год. (12+).
**12.55** Маст. фільм «Два галасы». (12+).
**14.00** «Канцэрт Тота Кутуньё». 1985 год. (12+).
**14.50, 20.45** «Прэс-экспрэс». 1993 год. (16+).
**16.00** «Колба часу». (16+).
**18.55** Маст. фільм «Клопатная гаспадарка». (12+).
**21.00** «Быў час». 2009 год. (16+).
**22.00** Маст. фільм «Будзь здароў, дарагі!» (16+).
**0.05** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год. (12+).
**1.00** Маст. фільм «Жыла-была дзяўчынка». (16+).

### EuroSport 1

**4.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
**5.00, 7.15, 9.30, 13.00, 14.15, 21.00, 0.15, 2.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія».
**6.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
**8.15** Футбол. «ФІФА».
**8.45** Watts.
**11.00, 13.00, 20.15, 1.30** Аўтагонкі. WTCR.
**14.00, 18.15** Веласпорт. «Джыра»-экстра.
**18.30** Веласпорт. «Тур Арагона».
**19.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**23.00** Конны спорт. Global Champions Tour.

### Кінакамедыя

**0.55** Вяселле па абмене. (16+).
**2.40** Я ніколі не буду тваёй. (16+).
**4.35** Каханне без правілаў. (16+).
**6.20** Шлюб па-італьянску. (0+).
**8.20** Развод па-італьянску. (12+).
**10.25** Шчаслівы выпадак. (16+).
**12.10** Гараскоп на ўдачу. (12+).
**14.05** Крутая Джорджыя. (16+).
**16.10** Эйс Вентура: вышук хатніх жывёл. (12+).
**17.50** Эйс Вентура-2: калі кліча прырода. (12+).
**19.30** Сцерва. (16+).
**21.20** Мідлтан. (16+).
**23.10** Вялікае вяселле. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.10** «Школа доктара Камароўскага» (6+).

**10.45** «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**11.35, 0.25** «Каінава пячатка». Серыял (12+).
**15.00** «Тайны нашага кіно «Тэгеран-43» (12+).
**15.35** «Тэгеран-43». Драма (12+).
**18.20** «Сезон палявання». Анімацыйны фільм (12+).
**19.50** «10 самых» (16+).
**20.25** «Чацвер, 12-га». Меладрама (16+).
**22.05** «Зладзейка кніг». Драма (12+).
**3.40** «Грань». Серыял (16+).
**5.10** «Нераскрытыя тайны» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 18.25** Асцярожна, дзверы зачыняюцца! (16+).
**8.05** Чытальнік. (16+).
**10.25** Маёр Пэйн. (12+).
**12.20** Баец. (16+).
**14.35** Малавіта. (16+).
**16.45** Усё магу! (16+).
**20.20** Адчайны. (16+).
**22.20** Тутсі. (16+).
**0.35** Шаша ў нікуды. (18+).
**3.00** Сезон палявання-2. (12+).
**4.15** Дарагі Джон. (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Урфін Джус і яго драўляныя салдаты (0+).
**8.15** Змешаныя пачуцці (16+).
**10.05** Злодзей (16+).
**12.00** Міа, мой Міа (12+).
**14.00** Канікулы строгага рэжыму (12+).
**16.15** Чэмпіёны (12+).
**18.10** Чорная вада (16+).
**20.20** Дзень выбараў (16+).
**22.45** Сёстры (16+).
**0.25** Бяжы!.. (16+).
**2.10** Сталінград (12+).
**4.20** А досвіткі тут ціхія... (12+).

### National Geographic

**6.00, 13.10, 14.50** Невядомая планета Зямля. (12+).
**6.50** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.40, 12.25** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.25** Антарктыка. (12+).
**9.15, 16.20** Аўта-SOS. (12+).
**10.05** Цуды інжынерыі. (12+).
**10.50** Інжынерныя ідэі. (12+).
**11.40** Неверагодныя машыны. (12+).
**14.00** Асушэнне Алькатраса. (12+).
**15.35** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**17.55, 22.00, 1.10** Гісторыя СС: узыходжанне да ўлады. (16+).
**19.30** Дагістарычныя монстры Гітлера. (16+).
**20.15** Генрый: Пікаса. (16+).
**23.30** Апошнія тайны Трэцяга рэйха. (16+).
**0.20** Ліхтугі за мяжой. (18+).
**2.45** Інстынкт выжывання. (16+).
**3.30** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**5.10** Вядомы Сусвет. (12+).

### Discovery

**8.00** Бушкрафт: лясная ліга.
**9.00** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**10.00** Майстэрня Goblin Works.
**11.00** Чарнобыль: жыццё пасля.
**12.00** Як працуюць машыны.
**13.00** Выжыванне без купюр.
**14.00, 7.10** Адам псуе ўсё.
**15.00** Майстры пагандлявацца.
**16.00, 19.30** Бітва за нерухомасць.
**20.00, 0.00** Разбуральнікі легенд.
**1.00** Залатая ліхаманка.
**2.00** Голыя і напалоханыя.
**4.40** Свяшчэнная сталь.

## Замор'е

# Паспяховыя брытанцы выпіваюць больш

**NHS Digital і Нацыянальная статыстычная служба Вялікабрытаніі прывялі цікавыя даныя аб ужыванні алкаголю ў каралеўстве, паведамляе The Guardian.**



Як высветлілася, колькасць брытанцаў, якія ўжываюць спіртное, няўхільна расце з павышэннем сацыяльна-эканамічнага статусу. Менш за ўсё грамадзян, якія выпівалі на тыдні перад апытаннем, — 51 % — аказалася сярод тых, хто займаецца фізічнай або простай работай. Сярод кіраўнікоў і высокакваліфікаваных работнікаў гэтая лічба дасягае 70 %, адзначае Daily Mail. Сувязь ёсць і з гадавым заробкам. Так, ва ўжыванні спіртнога прызналіся 46,5 % брытанцаў, якія атрымліваюць менш за 11 тысяч еўра штогод. Сярод тых, хто зарабляе 22—34 тысячы такіх аказалася ўжо 60 %, а сярод уладальнікаў даходу звыш 45 тысяч еўра, «ужываюць» больш за 80%.

У справаздачах адзначаецца, што тое, як часта людзі п'юць, таксама залежыць ад узросту. Пятая частка аказалася наогул непітушчай: у асноўным ва ўзросце ад 25 да 64 гадоў. Тыя, хто часцей за ўсё ўжываў алкаголь, былі старэйшыя за 65 гадоў, моладзь жа часцяком п'е толькі па выхадных, аднак больш, чым усе астатнія. Найбольш небяспечным лічыцца ўжыванне спіртнога людзьмі сярэдняга ўзросту. Як адзначыў менеджар па тэрапіі алкагольнай залежнасці Стыў Кларк, людзі, старэйшыя за 45 гадоў, п'юць значна часцей, але не лічаць, што знаходзяцца ў зоне рызыкі. Часта яны такім чынам «здымаюць стрэс» і ў выніку ўжываюць алкаголь па чатыры-шэсць дзён на тыдзень. За дзесяць гадоў колькасць шпіталізацый, звязаных з выпіўкай, падскочыла на 17 %. Нацыянальная статыстычная служба таксама паказала, што кошт з'яўляецца важным фактарам пры ўжыванні алкаголю.

Між тым Шатландыя ўжо ўстанавіла мінімальныя цэны на алкаголь, перадае Sky News. Згодна з новымі правіламі віно 13 градусаў аб'ёмам 0,75 літра не можа прадавацца танней за 4,88 фунта, бутэлька віскі 0,7 літра павінна каштаваць не менш за 14 фунтаў. У Шатландыі на кожныя 100 тысяч мужчын у 2016 годзе прыпадала 30 выпадкаў смерці ад злоўжывання алкаголем. Для параўнання: у Ірландыі гэты паказчык склаў 22 выпадкі, у Англіі і Уэльсе — па 14. Штотыдзень у Шатландыі ад звязаных са спіртным хвароб паміраюць 22 чалавекі, гэтая праблема каштуе шатландскай медыцыне тры мільярды фунтаў стэрлінгаў штогод.

# Дозу памяншаюць паступова

Deutsche Welle паведамляе, што пастаяльцы аддзялення для пажылых алкаголікаў у доме састарэлых Святога Ёзэфа нямецкага Дзюсельдорфа рэгулярна прымаюць лёгкія спіртныя напоі, колькасць якіх вызначаюць урачы і сацработнікі. «У дадзеным выпадку гаворка ідзе не пра тое, каб адвучыць старых ад злоўжывання алкаголем, што практычна немагчыма, але пра тое, каб дапамагчы ім стрымліваць, кантраляваць сваю залежнасць», — растлумачыў дырэктар Ціна Габерле. Акрамя Дзюсельдорфа, такія аддзяленні ёсць яшчэ ў двух дамах састарэлых.

# АСАБІСТЫ ПРЫКЛАД ПЛЮС АРГУМЕНТЫ

**ПРЫ падвядзенні вынікаў работы выязнога пасяджэння старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што знаёмства з патэнцыялам Слаўгарадскага раёна не расчаравала. Відаць, што тут шмат чаго робіцца і прыносіць станоўчыя вынікі. Але трэба працаваць з яшчэ большай стараннасцю, каб краіна змагла выйсці на новы ўзровень эканомікі.**

— Будзем разбірацца з праблемнымі сельскімі гаспадаркамі, дадзім ацэнку кадрам і адпаведным Саветам дэпутатаў. І аргументаў накшталт «я ўсё зрабіў, што мог, гэта там, наверсе, не вырашаецца» быць не павінна. На тое ты і кіраўнік, каб патрабаваць, каб ісці да вышэйстаячых структур, да міністраў. Павінна быць актыўнасць, пераканаўчыя аргументы, асабісты прыклад.

Падчас пленарнага пасяджэння былі заслуханы выступленні прадстаўнікоў міністэрстваў і рэспубліканскіх органаў. **Першы намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі Ірына КАНГРО** расказала пра асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў Магілёўскай і Гомельскай абласцей па выніках 2017-га і першага квартала 2018 года. І гэтыя лічбы паказалі, што органам мясцовага самакіравання трэба будзе добра папрацаваць для паляпшэння становішча і павышэння якасці жыцця насельніцтва.

— З канца 2016 года адзначаецца пагаршэнне дэмаграфічнай сітуацыі. Насельніцтва Гомельскай вобласці паменшылася амаль на пяць тысяч чалавек, Магілёўскай — на 5,7 тысячы, — адзначыла Ірына Кангро. — Колькасць людзей працаздольнага ўзросту зменшылася на пачатку года ў краіне больш чым на 1000 чалавек. Доля насельніцтва з узроўнем даходаў ніжэй за бюджэт пражытачнага мінімуму ў краіне павялічылася да 5,9 %, у Гомельскай вобласці — да 8,1 %, Магілёўскай — 7,6 %. Гомельская вобласць па ўзроўні сярэдняй заработнай платы стабільна займае трэцяе месца, а Магілёўская з перадапошняга месца па выніках 2017 года апусцілася на апошняе ў пачатку гэтага года. Колькасць людзей, занятых на рынку працы, працягвае скарачацца. Самае заўважнае зніжэнне занятых у эканоміцы адбылося ў Магілёўскай вобласці — звольненых тут па-ранейшаму больш, чым прынятых на работу. Летась у краіне планавалася працаўладкаваць 70 тысяч грамадзян на зноў створаныя працоўныя месцы, але Магілёўская вобласць не забяспечыла прагнозны паказчык. Узровень фактычнага беспрацоўя пагоршыўся. Мае месца такая негатыўная з'ява, як адток насельніцтва на работу за мяжу. Колькасць дасягнула самага высокага ўзроўню за апошнія шэсць гадоў і ў параўнанні з 2016 годам вырасла ў Гомельскай вобласці на 66 %, у Магілёўскай — на 29 %.

Па выніках 2017 года на Магілёўшчыне адзначаны самы нізкі тэмп унутранага рэгіянальнага прадукту, з тэмпам росту 104 % у першым квартале гэтага года яна па-ранейшаму апошняя.

**Намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО** расказаў пра ролю мясцовых дэпутатаў у фарміраванні мясцовых бюджэтаў і за кошт чаго гэтыя бюджэты будуць папаўняцца. Слаўгарадскі раён, напрыклад, датуецца на 60 %. Фінансава падмацаваць раён дапаможа прадпрымальніцкая дзейнасць, бо падаткі ад яе застаюцца ў мясцовых бюджэтах.

**Аляксандр КАЛІНОЎСКІ, намеснік дырэктара дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі,** звярнуў увагу на тое, што трэба ствараць як мага больш цэнтраў эканамічнага росту з высокімі характарыстыкамі інвестыцыйнай прывабнасці, дзе можна атрымаць значныя эканамічныя эфекты. Зараз іх па краіне 62, у Магілёўскай вобласці — восем, у Гомельскай — дзесяць. «Без праектаў, без новай эканомікі дасягнуць ВУП у 100 мільярдаў долараў будзе нерэальна. Стаўка робіцца на бізнес. І Дэкрэт № 7 даў новы імпульс для развіцця прадпрымальніцтва», — падкрэсліў ён.

На жаль, не атрымалі жаданага эканамічнага эфекту ад рэалізацыі на тэрыторыі Магілёўшчыны Указа № 235 «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна». Сваімі заўвагамі падзяліўся **старшыня Магілёўскага абласнога Савета Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК.**

— Праграма пакуль так і не стала дзяржаўнай, — канстатаваў ён падчас пленарнага пасяджэння. — Тыя льготы і прэферэнцыі, якія агаворваліся, не працуюць. Па сутнасці сёння, на паўднёвым усходзе дзейнічаюць тыя ж умовы, што і на ўсіх сельскіх тэрыторыях, якія трапляюць пад дзеянне Дэкрэта № 6 «Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх пасяленняў, сельскай мясцовасці».

> Старшыня аблсавета адзначыў, што развіццё адстаючых рэгіёнаў — задача не толькі адной вобласці, бо зрабіць гэта не дазваляюць аб'ёмы фінансавання. Але ёсць унікальная магчымасць на прыкладзе Магілёўшчыны адпрацаваць механізм, які будзе карысны ў цэлым для краіны.

— Інвестара перш за ўсё цікавіць інфраструктура, гэта дае яму магчымасць знізіць капітальныя ўкладанні да 30 і больш працэнтаў, — паведаміў ён. — Наша мэта — у кожным райцэнтры стварыць па адным індустрыяльным парку. Гэта павінны быць цалкам падрыхтаваныя земельныя ўчасткі з выразна прапісанымі юрыдычнымі правамі і камунікацыямі, каб на іх можна было размясціць любыя вытворчасці. Правільным будзе падключыць да рашэння гэтага пытання навукова-даследчыя інстытуты, каб больш глыбока вывучыць яго і ўнесці прапановы па комплексным і прававым рэгуляванні.

Дзмітрый Харытончык звярнуў увагу яшчэ на тое, што механізм выдачы крэдытаў Банкам развіцця вельмі складаны. «За два гады з яго дапамогай мы змаглі прафінансаваць у вобласці толькі адзін праект», — падкрэсліў ён.

Вопытам работы Нараўлянскага сельскага Савета дэпутатаў падзялілася яго старшыня Ала Навуменка. Гэта адзін з найбольш пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС раён, з карты якога зніклі 40 населеных пунктаў. Але раён адраджаецца і паказвае вельмі добрыя вынікі па занятасці насельніцтва. За 2016—2017 гады тут створана 113 рабочых месцаў на працуючых прадпрыемствах. На прадпрыемстве «Чырвоны мазыранін», прадукцыя якога карыстаецца попытам нават у далёкім замежжы, рэалізаваны інвестыцыйны праект комплекснага тэхнічнага пераасначэння з укараненнем прагрэсіўных тэхналогій. Шмат увагі ўдзяляецца прыватнаму бізнесу. За мінулы-пазамінулы гады адкрылася дзевяць прадпрыемстваў, восем з якіх — у вытворчай сферы. На 1 красавіка ў раёне зарэгістравана 130 аб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Па выніках гэтага года чакаецца стварэнне 56 працоўных месцаў.

Пры падвядзенні вынікаў пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання былі сфармуляваны рэкамендацыі, якія дапамогуць скаардынаваць работу Саветаў дэпутатаў і павысіць эфектыўнасць іх дзейнасці.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ** прапанаваў пры ўзгадненні законапраектаў накіроўваць іх не толькі ў абласныя Саветы, але і ў раённыя. «Галоўнае, каб вы рэагавалі, уносілі свае прапановы, раіліся з насельніцтвам», — падкрэсліў ён. У парламенце таксама збіраюцца прааналізаваць, як у раёнах рэалізуюць канкрэтныя задачы, якія ставіць перад імі Савет па ўзаемадзеянні. «Паспрабуем абагульніць найлепшы вопыт раённых Саветаў і давесці яго праз газету «Мясцовае самакіраванне», — удакладніў Аляксандр Папкоў. — Вельмі шмат чаго станоўчага ёсць у нас».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**



Падчас выязнога пасяджэння.



Удзельнікі пленарнага пасяджэння (злева направа) старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ.

**Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:**

— На прыкладзе Слаўгарадскага раёна мы разгледзелі праблемы, характэрныя для пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС Магілёўскай і Гомельскай абласцей, і паспрабавалі знайсці шляхі іх рашэння. Мы ўбачылі, што ў раёне ёсць дасягненні ў галіне сацыяльнага і эканамічнага развіцця, праглядаюцца вельмі сур'ёзныя перспектывы. Райсаветы, мясцовая ўлада адказваюць за ўсе пытанні, звязаныя з жыццезабеспячэннем чалавека. І мы пастараліся выпрацаваць нейкую пэўную сістэму, каб не было разрыву паміж «нізамі» і «вярхамі». Мы пашукалі новыя формы работы, якія будзем рэалізоўваць. На наступным пасяджэнні, якое адбудзецца на базе Барысаўскага райвыканкама, разгледзім пытанні, звязаныя з гарадской гаспадаркай — развіццём прамысловасці, стварэннем новых працоўных месцаў, рашэннем сацыяльных пытанняў. Нас хвалюе, што трэба рабіць сёння, каб даходная частка бюджэту папаўнялася. Пры гэтым павінна быць сацыяльная абароненасць кожнага чалавека. Кіраўніком дзяржавы пастаўлены задачы па павелічэнні зарплаты, пенсій, стыпендый, і формы работы тут могуць быць самыя розныя.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

# НАВЕСЦІ ПАРАДАК З ІЛЬГОТАМІ

На ліквідацыю наступстваў Чарнобыльскай катастрофы за 32 гады дзяржава накіравала 18,4 мільярда долараў. З іх палова непасрэдна на сацыяльную абарону насельніцтва, у тым ліку на льготы канкрэтным катэгорыям насельніцтва. У Слаўгарадзе, напрыклад, жанчыны, якія знаходзяцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці да трох гадоў, маюць права на 150-працэнтную дапамогу. А маладыя спецыялісты, якія прыязджаюць працаваць у раён, пры заключэнні кантракта на пяць гадоў могуць разлічваць на дапамогу ў памеры 200 базавых велічынь, пры наступным кантракце яшчэ на пяць гадоў — на 300.

**Старшыня Слаўгарадскага раённага Савета дэпутатаў Святлана ЯЗЕРСКАЯ** звярнула ўвагу на тое, што пры рэалізацыі гэтых ільгот узнікаюць праблемныя моманты.

— У пастанове Саўміна ад 30 лістапада 1998 года № 1842, дзе размова ідзе пра фінансавую дапамогу спецыялістам пры заключэнні кантрактаў у раёнах, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай АЭС, улічаны не ўсе катэгорыі, — паведаміла яна. — Імі не могуць скарыстацца дарожнікі, будаўнікі, спецыялісты па спорце, сацыяльнай сферы, некаторыя работнікі сельскай гаспадаркі. Напрыклад, аграном можа атрымаць гэтыя выплаты, а галоўны аграном, калі адносіцца да катэгорыі кіраўніка, не. Пры гэтым усе работнікі спажыўкааперацыі — ад грузчыка да кіраўніка — трапілі ў гэты спіс. У выніку дэфіцытныя кадры не вельмі ахвотна замацоўваюцца ў раёне. Няма льгот.

Што датычыцца падтрымкі жанчын, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, тут таксама ёсць праблемы. Гэта льгота дае права на працягу трох гадоў атрымліваць дапамогу ў памеры 150 % на падставе толькі рэгістрацыі. У выніку да нас прыязджаюць маладыя маці, каб зарэгістравацца. Самі жывуць у Мінску, Магілёве і атрымліваюць ільготу.

САМАЗАНЯТАСЦЬ

# СЛАЎГАРАДСКІ ФЕНОМЕН



**СЁННЯ вопыт арганізацыі самазанятасці і занятасці насельніцтва ў Слаўгарадскім раёне разглядаецца ў межах краіны як наватарскі. Яшчэ падчас выязнога пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі ў Магілёве старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў Святлана ЯЗЕРСКАЯ падрабязна расказала, на чым будуецца ў раёне работа па дэкрэтах Прэзідэнта № 1 «Аб садзейнічанні занятасці» і № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва».**

Заахвочваюць грамадзян рознымі спосабамі — гэта кірмашы вакансій, індывідуальная работа, сходы, адзіныя дні інфармавання і гэтак далей. Адзін з эфектыўных метадаў — садзейнічанне жыхарам раёна ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці. Яны праходзяць перанавучанне, забяспечваюцца фінансавай падтрымкай і адкрываюць сваю справу. З пачатку года ў раёне ўжо зарэгістравана сем індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца гандлем, аказваюць паслугі насельніцтву. Ёсць добры вопыт па садзейнічанні самазанятасці насельніцтва пры падтрымцы міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Брэндам раёна стала хатняе сыраварэнне. Створаны спажывецкі сельскагаспадарчы каапературы «Гіжэнскі аграрый» (у яго сёння ўваходзіць 15 сыravараў), якія пры падтрымцы праграмы малых грантаў ПРААН/ГЭФ рэалізуе праект «Падтрымка хатняга сыраварэння як альтэрнатыўнай формы занятасці на і паблізу ад асабліва ахоўных тэрыторый Слаўгарадскага раёна». Сёлета ў Лясной у будынку, які не выкарыстоўваўся, адкрываецца сырная лаўка, дзе з'явіцца міні-музей сыру. Тут жа будзе адбывацца рэалізацыя сырнай і тварожнай прадукцыі з каровінага і казінага малака, правядуць і майстар-класы. Слаўгарадскія сыравары — галоўныя героі створанага ў раёне гастранамічнага фестывалю «Гаспадарчы сыр», які пройдзе сёлета 26 мая ў Слаўгарадзе ўжо сёмы раз. Сёння ў раёне налічваецца каля 40 хатніх гаспадарак, якія ствараюць сыр для сябе і на рэалізацыю.



> Толькі на тэрыторыі Лапаціцкага сельсавета было падтрымана восем ініцыятыў. Пры гэтым сельсавет з'яўляецца гарантам рэалізацыі гэтых праектаў.

Працягваецца ажыццяўленне трохгадовага праекта «Ад вытокаў да развіцця», які фінансуецца Еўрапейскай камісіяй ЕС на суму больш за 400 тысяч еўра. У яго рамках падтрымана 47 ініцыятыў мясцовых жыхароў, накіраваных на аказанне турыстычных паслуг, стварэнне аграсядзіб. Пры фінансавай падтрымцы Праграмы развіцця ААН у вёсцы Пацяраеўка на тэрыторыі былой гідрастанцыі прадпрымальнік Фёдар Бондараў адкрыў турыстычны комплекс «Маленькія дзівы» для адпачынку дзяцей і дарослых. На базе яго функцыянуе ўнікальны «Дзіцячы цэнтр лагічнага мыслення», які таксама быў рэалізаваны ў рамках праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь».

Рэалізацыя ўсіх гэтых праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі была б немагчымая без непасрэднага ўдзелу ў працэсе дэпутатаў. Толькі на тэрыторыі Лапаціцкага сельсавета было падтрымана восем ініцыятыў. «Пры гэтым сельсавет з'яўляецца гарантам рэалізацыі гэтых праектаў, — кажа **старшыня сельскага Савета дэпутатаў Сцяпан БАЙЦОЎ.** — Праз нас праходзяць усе пытанні, якія датычацца іх фінансавання і ўстойлівага развіцця». Дэпутат падкрэслівае карысць такіх праектаў, бо яны дапамагаюць развівацца малым населеным пунктам і, галоўнае, прывучаюць моладзь да сельскай працы.

— Пры фінансавай падтрымцы праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» ПР ААН створаны клуб майстроў-рамеснікаў «Майстры Слаўгарадчыны», — удакладняе **старшыня Слаўгарадскага райсавета Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — Сёння на тэрыторыі раёна працуе 31 рамеснік. Для далейшага развіцця прадпрымальніцтва мы плануем рэалізаваць праект «МОСТ як пілотная экабізнес-мадэль для мясцовага і рэгіянальнага эканамічнага росту» пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскай камісіі на суму 600 тысяч еўра. Ён прадугледжвае мерапрыемствы па развіцці тэрыторыі левабярэжжа ракі Сож і стварэнне сёлета Цэнтра сельскага прадпрымальніцтва ў вёсцы Старая Каменка. Прадаўжэннем гэтага праекта стане яшчэ адзін — «Сеткавае ўзаемадзеянне для паляпшэння магчымасцяў працаўладкавання ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці», у якім будуць задзейнічаны яшчэ чатыры раёны паўднёвага ўсходу Магілёўшчыны. Гэта дасць магчымасць толькі ў Слаўгарадскім раёне падтрымаць 10 прадпрымальніцкіх ініцыятыў.

**Нэллі ЗІГУЛЯ.**


## ИНФОРМАЦИОННОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА 22 МАЯ 2018 ГОДА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ПЛОЩАДЕЙ, НАХОДЯЩИХСЯ В СОБСТВЕННОСТИ ОАО «КРИСТАЛЛ-МАГ», г. БАРАНОВИЧИ

| | | |
|---|---|---|
| 1. Наименование объекта, его местонахождение | Часть многофункционального изолированного помещения с инвентарным номером 110/D-2774659, г. Барановичи, ул. Красноармейская, 18-1 | |
| 2. Арендуемая площадь, кв. м | 7,2 | 9,1 |
| 3. Характеристика объекта | Изолированное служебное помещение на 1-м этаже одноэтажного многофункционального изолированного помещения. Имеется: центральное отопление, водоснабжение, электроосвещение, телефонизировано | Изолированное служебное помещение на 1-м этаже одноэтажного многофункционального изолированного помещения. Имеется: центральное отопление, водоснабжение, электроосвещение, телефонизировано |
| 4. Начальная цена продажи права заключения договора аренды, базовых арендных величин | 1,8 | 2,275 |
| 5. Сумма задатка, базовых арендных величин | 0,18 | 0,2275 |
| 6. Условия аукциона | 1. Организация деятельности в соответствии с санитарными нормами и противопожарными требованиями.<br>2. Выполнение арендатором за счет собственных средств текущего ремонта арендуемых площадей | |
| 7. Срок аренды помещения | 3 года | |
| 8. Коэффициент к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду и (или) от использования арендуемого имущества | 1,5 | |
| 9. Размер уплачиваемого штрафа, базовых величин | 100 | |
| 10. Арендодатель объекта, его местонахождение | ОАО «Кристалл-маг», г. Барановичи, ул. Красноармейская,18-1, тел. 41-00-85 | |
| 11. Организатор аукциона | ОАО «Кристалл-маг» | |

1. Аукцион состоится 22 мая 2018 года в 14 00 по адресу: г. Барановичи, ул. Красноармейская, 18-1.

2. Для участия в аукционе необходимо:

а) представить организатору аукциона заверенную банком копию платежного поручения либо иного документа о перечислении суммы задатка на расчетный счет: ОАО «Кристалл-маг», BY77BPSB30121226130149330000 БИК BPSBBY2X в ЦБУ № 101 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 200168503. Срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе; задаток перечисляется в белорусских рублях в зависимости от размера базовой арендной величины, установленной на день оплаты;

б) подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе установленной формы с приложением следующих документов:

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя и документ, удостоверяющий личность;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов на участие в аукционе представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность;

в) заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

После регистрации организатором аукциона заявления со всеми необходимыми документами лицо, желающее принять участие в аукционе, считается допущенным к участию и получает билет участника аукциона.

3. Лицо, допущенное к участию в аукционе, до начала аукциона имеет право отказаться от участия в нем. Отказом признается как письменное заявление, так и неявка на аукцион.

4. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Шаг аукциона устанавливается комиссией по проведению аукционов от 5 % до 15 %. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене.

Лицом, приравненным к победителю аукциона, считается единственный участник аукциона, давший согласие на покупку предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 15 %.

5. Спорные вопросы, возникающие в ходе проведения аукциона решаются комиссией.

6. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю) обязан:

– в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на расчетный счет ОАО «Кристалл-маг» (арендодателя) сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной суммы задатка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона;

– оплата предмета аукциона осуществляется в белорусских рублях в зависимости от размера базовой арендной величины, установленной на день оплаты;

– в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола заключить договор аренды с арендодателем.

В случае невыполнения одного из условий результаты аукциона аннулируются, внесенный задаток победителю аукциона (лицу, приравненному к победителю) не возвращается.

7. Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

8. Организатор аукциона вправе в любое время отказаться от проведения аукциона, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения, уведомив об этом лиц, подавших заявление на участие в нем.

9. Задаток возвращается участникам аукциона, не выигравшим торги, лицам, отказавшимся от участия в аукционе, в течение 5 рабочих дней со дня подачи письменного заявления.

10. Штраф уплачивается участниками аукциона и (или) его победителями (приравненными к нему лицами) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением.

11. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 225409, г. Барановичи, ул. Красноармейская, д. 18-1, с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 в рабочие дни по 22 мая 2018 г. включительно. Контактный телефон в г. Барановичи (0163) 41-00-85



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**Открытое акционерное общество «Могилевхимволокно» 5 июня 2018 г. в 14.00 проводит открытый аукцион по продаже неиспользуемого имущества**

Собственник, продавец и организатор аукциона – ОАО «Могилевхимволокно», г. Могилев, 35.

**Предмет аукциона**:

**лот № 1:** гараж метало-деревянный (инв. № 1000089200), начальная цена продажи – 1 958,47 руб. с учетом НДС 326,41 руб., задаток – 97,92 руб. Гараж, общей площадью 40 кв. м, расположен в Могилеве по ул. Симонова.

**лот № 2:** плоскопечатная машина ПС-М (инв. № 4480003200, 1984 г. в.) начальная цена продажи – 946,92 руб. с учетом НДС 157,82 руб., задаток – 47,35 руб. Плоскопечатная машина 1984 г. в. расположена по адресу: г. Могилев, 35.

Имущество продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 10 процентов от предыдущей названной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесли в установленном порядке задаток, который перечисляется не позднее 4 июня 2018 года на расчетный счет ОАО «Могилевхимволокно» № BY61AKBB30120237579167000000 в филиале № 700 МОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21700, УНП 700117487, ОКЮЛП 700117487, ОКПО 002040797000, заключили соглашение о правах и обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

К заявлению, подаваемому для участия в аукционе, прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию, без нотариального засвидетельствования, заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка;

физическим лицом – копия документа, удостоверяющего личность, копия платежного поручения или приходный кассовый ордер о внесении задатка в кассу банков;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть получена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык, копия платежного поручения о перечислении задатка.

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, 35, ОАО «Могилевхимволокно», каб. 1001. Последний день подачи заявления – 4 июня 2018 года до 17.00.

Победитель торгов возмещает продавцу стоимость затрат на проведение аукциона.

Заключительная регистрация участников торгов состоится 4 июня 2018 года, с 13.30 до 14.00 на 1-м этаже здания заводоуправления ОАО «Могилевхимволокно».

Срок заключения договора – не позднее 15 рабочих дней с момента подписания сторонами протокола о результатах проведения торгов.

Условия регистрации, порядок участия в торгах размещены на интернет-сайте ОАО «Могилевхимволокно» по адресу: www.khimvolokno.by.

Контактные телефоны: (8 0222) 49-90-47, (8 0222) 49-91-80

# ДЗЮРОК ДЛЯ АМАТАРАЎ СКВАРКІ

## У Гродзенскім раёне фермер вырошчвае «чырвоных» свінак і эканоміць валюту племянных прадпрыемстваў

**Малады фермер Аляксей ТОДРЫК працягвае сямейную справу, якую яшчэ ў 90-я гады пачаў яго бацька Бернард Станіслававіч. У той час фермерскі рух толькі пачаў развівацца і гэты кірунак здаваўся адным з перспектыўных. Бо калі гэта беларус адмаўляўся ад скваркі? Таму і сын Аляксей пасля аграрнага ўніверсітэта бацькаву справу не толькі падтрымаў, але вывеў на новы ўзровень, стаў займацца племянной свінагадоўляй. Зараз у фермерскай гаспадарцы Аляксея Тодрыка 100 свінаматак самай папулярнай у свеце мяснай пароды Дзюрок.**

### «Правільная» сяўба і кармы «па навуцы»

Аляксей у гэтыя дні ўвесь час у полі. Як вядома, веснавы дзень год корміць, але і тут важна не вытрымаць тэрмін. На былых тарфяніках глеба лёгкая, зерне можа загінуць ад мароза, таму сеюць пшаніцу пасля таго, як сады адцвітуць. Неяк народную прыкмету праігнаравалі — і пасевы прапалі, прыйшлося ўсё поле перасейваць. Пасля гэтага тэрміны сяўбы не апярэджваюць.

За пшаніцай настане чарга кукурузы, потым пачнецца сяўба соі. Гэтую культуру ў гаспадарцы пачалі вырошчваць нядаўна. Раней завозілі з Бразіліі, Украіны, Расіі. А некалькі гадоў таму ўпершыню пасеялі на ўласным полі — атрымалі 12 ц/га. Гэта дазволіла забяспечыць амаль трэцюю частку патрэбы ў каштоўным бялковым корме. Пасля таго як купілі экструдар для апрацоўкі зерня, з'явілася магчымасць атрымаць тлушчавую сою, а кармавая база стала значна таннейшай.

Дарэчы, кармы тут фарміруюцца «па навуцы». Уся рэцэптура, да апошняй амінакіслаты, распрацоўваецца пад канкрэтную пароду сумесна з вучонымі Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта — па мінералах, вітамінах і ферментах. Правільны разлік садзейнічае добраму прыросту, а гэта і ёсць эфектыўнасць работы, бо доля кармоў складае 70 % сабекошту прадукцыі.

### Тварам да сваіх

У гаспадарцы зрабілі стаўку на Дзюрок. Гэта парода чырвоных свіней выведзена ў ЗША шляхам селекцыі ў XIX стагоддзі. Зараз экзатычны від распаўсюджваецца і ў нашай краіне. Фермер Аляксей Тодрык — адзін з нямногіх, хто заняўся развядзеннем чырвоных свінак. Пад свой праект атрымаў 160 га зямлі ды старыя будынкі былой птушкафермы. Іх знеслі, а на гэтым месцы пабудавалі новы рэпрадуктар на 100 свінаматак. Ад кожнай можна атрымаць да 20 парасят у год. Каб забяспечыць шырокі попыт з боку племянных гаспадарак, фермера ўключылі ў дзяржаўную праграму «Аграбізнес-2020».

— У краіне ўводзяцца новыя свінакомплексы, ім патрэбны пародзістыя свінаматкі, — тлумачыць Аляксей. — За мяжой кошт адной дасягае 700—1000 еўра, для таварнай фермы гэта немэтазгодна. Мы прадаём у некалькі разоў танней. Нядаўна ўкамплектавалі два свінакомплексы ў Карэліцкім і Берастовіцкім раёнах. Ёсць заяўкі з іншых рэгіёнаў краіны.

З Тодрыкам актыўна супрацоўнічаюць беларускія племпрадпрыемствы. Яшчэ нядаўна яны былі нацэлены на закупку жывёл з-за мяжы. Але зараз, дзякуючы дзяржаўнай палітыцы, гэтыя закупкі вельмі абмежаваны, бо валюта на іх не выдзяляецца. Затое ёсць магчымасць развіваць племянную справу на месцах.

— Калі дзяржаўным племпрадпрыемствам перасталі выдзяляць валюту, яны пачалі лічыць грошы і павярнуліся тварам да сваіх вытворцаў, — заўважае Аляксей. — Гэта добры стымул для фермераў.

Зараз пародзістых дзюркоў пачынаюць купляць у Тодрыка ўсе пяць племпрадпрыемстваў рэспублікі. Адтуль яны паступаюць на свінакомплексы. Сам фермер стабільна працуе з еўрапейскімі партнёрамі. За некалькі гадоў набылі 60 кабаноў у Даніі. Дарэчы, Аляксей імкнецца ўкараняць замежны вопыт, пераймае прыёмы работы, рацыён кармлення.


Аляксей ТОДРЫК.

Важны фактар — новыя тэхналогіі. У Даніі, напрыклад, амаль адсутнічае ручная праца. Там на 700 свінаматак прыходзіцца адзін работнік. У Аляксея на ферме працуюць толькі заатэхнік і ветэрынарны ўрач. Дарэчы, ветурач тры гады праходзіла стажыроўку ў той жа Даніі і зараз карыстаецца гэтым вопытам на гродзенскай зямлі.

— Я бачыў, як працуюць дацкія фермеры, — кажа Тодрык, — яны эканомяць кожную капейку. І нават ва ўмовах дарагой працоўнай сілы і кошту на паліва атрымліваюць добры прыбытак.

> Неяк народную прыкмету праігнаравалі — і пасевы прапалі, прыйшлося ўсё поле перасейваць. Пасля гэтага тэрміны сяўбы не апярэджваюць.

З выгляду і беларускі, і еўрапейскі рэпрадуктары не адрозніваюцца адзін ад аднаго. Вось толькі трапіць туды чалавеку «з вуліцы» немагчыма — фермер непакоіцца, каб не занеслі небяспечны вірус АЧС.

### Зона пад наглядам

У мэтах бяспекі забараняецца ўтрыманне свіней на ўласных падворках у межах пяцікіламетровай зоны ад рэпрадуктара.

— Так, людзі не могуць трымаць свіней паблізу нашага комплексу, — сцвярджае Аляксей Тодрык, — але прэтэнзій ніхто не выказвае. У навакольных вёсках жывуць у асноўным састарэлыя, ім свіней трымаць не пад сілу.

Дарэчы, непадалёку знаходзіцца буйны свінакомплекс мясцовай сельскай гаспадаркі. Таму за выкананнем каранцінных мер строга сочаць як ветэрынарныя службы, так і мясцовыя ўлады.

— Меры перасярогі па АЧС у нас нават больш строгія, чым у Еўропе, — адзначае фермер. — Там няма двайной агароджы, як у нас, санітарных прапускнікоў для аўтамабіляў. Што датычыцца інфекцый, то разам з АЧС у Еўропе і Амерыцы заклапочаны эпідэмічнай дыярэяй парасят, ад якой таксама няма вакцыны. Страты ад гэтага захворвання маладняку ў свеце каласальныя. Так што меры перасцярогі ў нас поўнасцю апраўданыя.

### Заўважылі, падтрымалі

Міністэрства сельскай гаспадаркі ўключыла свінакомплекс фермера ў спіс племянных. Згодна з праграмай, часткова дацыравауся кошт жывёл, каб гаспадаркі змаглі купіць пародзістых свінак па значна ніжэйшай цане. Выдаткавалі сродкі і на ўтрыманне свінаматак, і на іх закупку.

— Паколькі крэдытныя рэсурсы дарагія, без падтрымкі не абысціся, — кажа фермер, — зараз мы вельмі спадзяёмся на адну з апошніх праграм па развіцці аграбізнесу. У ёй прапісаны больш справядлівыя ўмовы для сельгасвытворцаў. Напрыклад, падтрымка не стратных гаспадарак, а тых, што прыносяць прыбытак.

У Аляксея ёсць бізнес-план па ўзбуйненні гаспадаркі. Гаворка ідзе аб будаўніцтве яшчэ аднаго рэпрадуктара на 250 галоў. Фермер пралічвае рызыкі і спадзяецца на спрыяльную эпідэміялагічную абстаноўку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Віталь ДАБРУК, намеснік генеральнага дырэктара па племяннай рабоце Гродзенскага племпрадпрыемства:**

— Прадукцыя фермера запатрабавана і з'яўляецца імпартазамяшчальнай. Тым больш што закупкі за мяжой забаронены па ветэрынарных прычынах.

Два гады таму разам з фермерам пачалі сумесную работу ў галіне геномікі — па ўзорах адшчыпаў з вуха расшыфроўваем ДНК для вызначэння найлепшых свінаматак і найлепшага семені. Фермеру пастаўляем семя ад найлепшых кабаноў, з «патрэбнымі» генамі. У выніку можна спрагназаваць патомства з высокай прадукцыйнасцю.

Зараз ідзе аднаўленне свінаводчых комплексаў. Тыя, што маральна і фізічна састарэлі, ідуць пад знос. Ім на змену прыходзяць комплексы з новымі тэхналогіямі, у асноўным па галандскім тыпе. Тут будзе і якаснае пагалоўе.

# МАЛАДАЯ, ДЫ РАННЯЯ

## У фермерскай гаспадарцы «Алімп-Агра» першымі ў краіне закончылі ручную пасадку бульбы


Кіраўнік сялянска-фермерскай гаспадаркі Юрый ЛОЙКА.

**У сялянска-фермерскай гаспадарцы «Алімп-Агра» Уздзенскага раёна, якую ўзначальвае Юрый Лойка, займаюцца вырошчваннем бульбы. Пад «другі хлеб» адведзена 110 гектараў. Штогод з гэтых плошчаў збіраюць каля трох тысяч тон клубняў. Прадукцыю змяшчаюць у спецыяльна абсталяваныя склады, дзе яна добра захоўваецца да новага ўраджаю. Рэалізуюць бульбу на ўнутраным і знешнім рынках, восеньскіх кірмашах. Частка ідзе ў стабілізацыйныя фонды сталіцы. Астатняе закладваецца на захоўванне і прадаецца на працягу года. Фермерская гаспадарка даўно займела рэпутацыю надзейнага пастаўшчыка.**

А сёлета ў «Алімп-Агра» пачалі займацца яшчэ і ранняй бульбай. Для гэтага падабралі ўчастак у дзесяць гектараў на ўзвышэнні, дзе глеба паспявае раней. Надзел для пасадкі падрыхтавалі яшчэ восенню. Заставалася толькі закультываваць і зрабіць барозны. Скрыні са склада дастаўлялі на поле вельмі акуратна, каб не пашкодзіць пяшчотны пасадачны матэрыял, паколькі клубні былі ўжо з набухлымі парасткамі.

— Мы выкарыстоўваем ранні сорт Рыўера. Тры тыдні да пасадкі бульба знаходзілася ў цёплым памяшканні пры натуральным асвятленні, — кажа **кіраўнік сялянска-фермерскай гаспадаркі Юрый ЛОЙКА.** — У выніку нават пупышкі, якія ў халоднай або пераўвільготненай глебе гінуць, пайшлі ў рост. А гэта гарантыя таго, што ўсходы будуць дружнымі і хуткімі. Тэхналогія папярэдняга прарошчвання дазваляе значна паскорыць атрыманне ўраджаю. Бульбу можна будзе ўбіраць літаральна праз два месяцы.



**Вядома, ранняя бульба патрабуе шмат клопату, карпатлівага дogляду, але яны апраўдваюць сябе. 3 дзесяці гектараў плануецца атрымаць 200 тон ранняй бульбы, якая будзе рэалізоўвацца ў гандлёвай сетцы Мінска.**

Дададзім, што гэтая фермерская гаспадарка — адна з лепшых не толькі на Міншчыне, але і ў краіне. Яе кіраўнік Юрый Лойка — прафесійны бульбавод, не навічок у сельскай гаспадарцы. Яму было ў каго вучыцца: бацька Вадзім Лойка 30 гадоў быў дырэктарам эксперыментальнай базы імя Суворава Уздзенскага раёна, затым адкрыў сваю справу. І цяпер ён працуе побач з сынам.

**Анатоль БАСАЎ, фота аўтара.**

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## БЯСПЕКА І БЕСТУРБОТНАСЦЬ

**На Століншчыне з пачатку года восем дзяцей атрымалі траўмы з-за недагляду сваіх бацькоў, паведамляе газета «Навіны Палесся». Малы, напрыклад, улез у таз з гарачай вадой. У выніку яго прывезлі ў бальніцу з апёкамі першай і другой ступені. Высновы агарод таксама ператвараецца ў «міннае поле»: адно дзіця з'ела пратраўленае насенне капусты, другое выпіла ўгнаенне. Абое трапілі ў рэанімацыю.**

Дарэчы, па статыстыцы, штогод некалькі хлопчыкаў і дзяўчатак трапляюць у бальніцу з-за пакінутых на падлозе каструль і тазоў з гарачай вадой ці супам. Сярод простых, але важных правілаў бяспекі — не пакідаць кубкі, талеркі і чайнікі на краі стала, не захоўваць хімічныя рэчывы ў пластмасавых бутэльках з-пад газіроўкі і ўвогуле ставіць іх у недаступныя для дзяцей месцы.

## ДАХОДЫ І ЦЭНЫ

**Падчас Першамая мы віншуем людзей працы, а ёсць тыя, хто імкнецца штодзень абараняць іх інтарэсы. Старшыня Кармянскага раённага аб'яднання прафсаюзаў Любоў ЛАРЧАНКА расказала карэспандэнту газеты «Зара над Сожам», як сёння паляпшаюцца ўмовы працы.**

Адзін з напрамкаў — маніторынг кошту прадуктаў. «Мы аналізуем рэальныя цэны ў крамах і супастаўляем іх з тымі даходамі, якія атрымліваюць людзі, — тлумачыць Любоў Ларчанка. — Маніторынг цэн на харчаванне на дадзены момант праводзіцца ва ўсіх раёнах і 10 гарадах абласнога падпарадкавання, або ў 274 крамах па 98 таварных пазіцыях. Мы звярнулі ўвагу на тое, што сярэдні заробак па краіне за жнівень 2017-га — люты 2018-га вырас нязначна — на 0,7 %, а кошт набору неабходных прадуктаў спажыўкошыка — на 7,7 %. Акрамя таго, падаражэлі і паслугі. Прафсаюзы праінфармавалі пра гэта ўрад, а таксама дэталёва абмеркавалі гэтую тэму падчас пасяджэння Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльна-эканамічных пытаннях. Таксама мы заўважылі, што ёсць дастаткова вялікі разрыў ва ўзроўні даходаў паміж рэгіёнамі краіны. У мінулым годзе найбольш праблемнымі з-за нізкіх заробкаў і сярэдніх цэн былі некаторыя раёны Брэсцкай і Віцебскай абласцей. У лютым 2018 года мы ўбачылі, што пералік такіх раёнаў, на жаль, павялічыўся».

## ШАНЦ НА ЗВЫЧАЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

**Сям'я Ірыны і Мікалая МАКАЎЧЫКАЎ узяла на патранатнае выхаванне Антона і Яраслава са спецшколы-інтэрната. Пра тое, як змянілася іх жыццё, яны расказалі Ваўкавыскай раённай газеце «Наш час».**




Антона і Яраслава бралі разам, каб хлопцы маглі падтрымліваць адзін аднаго.

Штогод 500—600 сірот у Беларусі знаходзяць сваю новую сям'ю, але дзецям-інвалідам шчасціць значна радзей. Ірына — мама трох дачок і бабуля чатырох унукаў — працуе поварам у спецшколе, адкуль і забрала хлопчыкаў. Яна жыве з Мікалаем 16 гадоў, але пара не думала афіцыйна афармляць свае адносіны, пакуль ім не запалі ў сэрцы спачатку Антон, а потым і Яраслаў.

Амаль адразу Мікалай пачаў вазіць іх у аквапарк. Першы раз хлопчыкі так баяліся, што Антон увесь адведзены час прасядзеў у джакузі, так і не паддаўшыся на ўгаворы акунуцца ў басейне. Зараз разам з Яраславам яны ныраюць і плаваюць, катаюцца з горкі, гуляюць з мячом, нічога не баючыся. Мікалай усё больш пераконваецца, што такіх дзяцей трэба выводзіць «з падполля» і паказваць людзям, што яны «такія ж класныя і вясёлыя».

Назіраючы за імі дома, Макаўчыкі адзначаюць, што, калі б дзеці жылі ў сям'і з нараджэння, усё было б па-іншаму. Проста з-за «платоў» сірочых устаноў, сваёй вымушанай ізаляцыі яны ўспрымаюць свет крыху інакш. Мікалаю і Ірыне не так важна, што іх дзеці ніколі не паступяць у ВНУ: яны атрымалі шанц на простае шчаслівае жыццё.

## ПА ДАРОЗЕ З ПЕСНЯЙ

**Раённы агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці стартаваў у Мёрскім раёне. Яго дэвіз — «Жыццё мае песняй спавіта». Карэспандэнты газеты «Міёрскія навіны» завіталі туды і падзівіліся на народныя таленты.**

Напрыклад, клуб «Надзея», які кіруе Аліна Капуста, на конкурс падрыхтаваў абрад «Багач». У тэатралізаванае дзеянне ўпляталі танцы і песні. «Нам падабаюцца праграмы, дзе нумары знітоўваюцца ў адно цэлае. Калі ўсё зразумела без вядучых, — гаворыць **актывістка самадзейнасці Лідзія БАБАРНЁВА.** — Пастаянна ўдзельнічаю ў аглядах-конкурсах і заўсёды хвалююся. Вось перажываю, каб словы не забыць». Танец з ручнікамі, абрад з караваем-багачом і жытнёвым вянком, песні жаночай вакальнай групы і салісткі Анастасіі Няміры, музычнае папуры ад ансамбля «Павятчанка» — усё склалася ў гарманічную па гуках і фарбах карціну.

Іншыя таксама спявалі, паказвалі сцэнкі. А калектыў Паташнянскага СК прысвяціў сваё выступленне памяці актыўнага ўдзельніка мастацкай самадзейнасці Аляксандра Гайдзеля. Іх каманда дружная і збольшага сямейная. Асноўная частка калектыву — бацькі Сяргей і Вольга Шукі, якія былі вядучымі, і дочкі Дар'я, Яўгенія і Сафія, якія спявалі.

## БУДЗЕ НОВАЯ КРАМА?

**У Аршанскім раёне рэалізуюць эксперыментальны праект па паляпшэнні гандлёвага абслугоўвання сельскіх жыхароў. Праект прадугледжвае замену асноўнага гандлёвага аператара — Аршанскага райпо, расказвае «Аршанская газета».**

На дадзены момант крамы ў аграгарадках Барздоўка, Крапіўна, Межава і ў вёсцы Савішчына перададзены ў арэнду гандлёваму дому «Орыс». Усе астатнія — «Еўрагандлю». Усяго ў сельскай мясцовасці па планах павінны працаваць 39 крамаў «Еўрагандлю», а таксама шэсць аўталавак гэтага гандлёвага аператара будуць абслугоўваць жыхароў па чатырнаццаці маршрутах тры разы на тыдзень.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

ПЫТАЛЬНІК

## Нюансы паляўнічай дрэсіроўкі

***З'яўляюся паляўнічым, хоць папраўдзе ва ўгоддзі да нядаўняга часу выбіраўся не так часта, як хацелася б. Але з выхадам на пенсію вольнага часу стала больш. Спадзяюся, на любімы з маладосці занятак ён таксама знойдзецца. Нават пачаў задумвацца: а ці не завесці мне нарэшце сабаку? Праўда, знаёмыя паляўнічыя пужаюць, што з яго дрэсіроўкай будзе шмат марокі...***

**Іосіф ГРЫНКЕВІЧ**, *г. Мінск*

Як расказалі нам спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяльную дрэсіроўку паляўнічых сабак дазволена праводзіць толькі ў адведзеных для гэтага месцах. Іх нагонка, муштроўка, прывучванне немагчымыя па-за ўгоддзямі, паколькі толькі знаходжанне ва ўмовах дзікай прыроды дазваляе сабаку ў поўнай меры праявіць яго прыроджаны і замацаваны векавым адборам паляўнічы інстынкт.

Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, для трэніроўкі і палявання дазваляецца выкарыстоўваць толькі паляўнічых сабак, зарэгістраваных Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў.

У зонах трэніроўкі, выдзеленых у паляўнічых гаспадарках, паляўнічым дазваляецца трэніраваць сваіх сабак у светлы час сутак без зброі, пры гэтым не абавязкова валодаць правам на здабычу паляўнічых жывёл.

Трэніраваць паляўнічых сабак можна і ў іншых спецыяльна адведзеных для гэтага месцах: аблвыканкамы маюць права прымаць рашэнні аб выдзяленні такіх участкаў у межах забароненых для палявання зон, за выключэннем зон масавага адпачынку.

Паляўнічы павінен ведаць, што, калі ў працэсе трэніроўкі яго сабака здабыў (умярцвіў альбо нанёс траўмы, не сумяшчальныя з жыццём) паляўнічую жывёлу нармаваных відаў або чырванакніжную жывёлу, неабходна паведаміць пра інцыдэнт службовай асобе карыстальніка паляўнічых угоддзяў, не перамяшчаючы і не разбіраючы здабытую жывёлу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЗРУЧНА

## Аплаціць «камуналку» па дарозе ў краму

### Пошта працуе ў новым фармаце

**У гарадскім пасёлку Падсвілле Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці стартаваў сумесны пілотны праект Белпошты і гандлёвай сеткі «Дабраном». Новы фармат аддзялення сувязі дазволіць павысіць якасць абслугоўвання сельскіх жыхароў, атрымаць поўны спектр паштовых паслуг і набыць розныя тавары паўсядзённага попыту.**

Аддзяленне сувязі Падсвілле размяшчана на 12 населеных пунктаў з колькасцю жыхароў 2,8 тысячы чалавек. Каб сэканоміць час наведвальнікаў, у кліенцкай зале арганізавана зона самаабслугоўвання — устаноўлены плацежна-даведачны тэрмінал, з дапамогай якога можна самастойна аформіць падпіску на друкаваныя СМІ, аплаціць «камуналку», паслугі мабільных аператараў.

Паштовае аддзяленне Падсвілле знаходзіцца ў гарадскім пасёлку на вуліцы Кастрычніцкай, 59а. Працуе з аўторка да суботы з 8.00 да 17.00.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

БУДЗЬ У КУРСЕ!

## ПАЖАРАНЕБЯСПЕЧНЫ СЕЗОН

**Дзяржаўная лясная ахова перайшла на ўзмоцнены рэжым работы, паведамілі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі. Яно заклікае грамадзян пры знаходжанні ў лясным фондзе захоўваць правілы бяспекі.**

Толькі з пачатку пажаранебяспечнага сезона ў ім зафіксавана дзесяць выпадкаў узгаранняў. Агульная плошча пажараў склала 12,64 гектара.

Самыя буйныя лясныя пажары традыцыйна назіраюцца ў паўднёвых раёнах краіны. З дзесяці названых выпадкаў чатыры адбыліся ў Гомельскай вобласці. Агульная плошча ўзгаранняў склала 9,5 гектара. Таксама чатыры пажары з пачатку сезона адбыліся ў лясах Мінскай вобласці, яшчэ па аднаму выпадку было зафіксавана ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях.

Як паказвае статыстыка, 98 працэнтаў пажараў у прыродных экасістэмах узнікаюць па віне чалавека. Адна з асноўных прычын узгаранняў — масавае выпальванне сухой расліннасці. Вядуць да іх і незатушаныя вогнішчы ці недакуркі ў месцах адпачынку, гульня дзяцей з агнём. І толькі ў рэдкіх выпадках лясныя пажары ўзнікаюць з натуральных прычын (удар маланкі, самаўзгаранне тарфяніку).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 3 мая 2018 года.**